ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ



Таццяна Кухаронак

# РАДЗІНЫ І МАЛЕНСТВА
## ў традыцыйнай культуры беларусаў





ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ



ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ

Таццяна Кухаронак

# РАДЗІНЫ І МАЛЕНСТВА

## ў традыцыйнай культуры беларусаў



УДК [392.1+398](=161.3)
ББК 63.5(4Беи)
К95

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Рэцэнзенты

доктар філалагічных навук Т. В. Валодзіна,
доктар гістарычных навук Т. А. Навагродскі

**Кухаронак, Т. І.**
К95 Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 140 с. : іл. – (Традыцыйны лад жыцця).
ISBN 978-985-08-2185-0.

У кнізе аўтар папулярна распавядае пра радзінныя звычаі і абрады беларускага народа як цэласную сістэму, якая ўзнікла ў глыбокай старажытнасці і ў традыцыйным грамадстве функцыянавала ў межах: сям'я – род – лакальная вясковая супольнасць. Падрабязна ахарактарызаваны народныя веды, рэгламентацыі адносна паводзін жанчын у перыяд цяжарнасці, родаў, дзейнасць бабы-павітухі, звычаі і абрады святкавання хрэсьбін і гадавання немаўляці. Кніга напісана на аснове дарэвалюцыйных даследаванняў і новых фальклорна-этнаграфічных экспедыцыйных матэрыялаў.

Кніга цікавая не толькі для спецыялістаў-гуманітарыяў, але і для ўсіх, хто захоча даведацца, як нашы продкі імкнуліся нарадзіць і выгадаваць здаровых нашчадкаў.

**УДК [392.1+398](=161.3)**
**ББК 63.5(4Беи)**

**ISBN 978-985-08-2185-0**

© Кухаронак Т. І., 2017
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2017

# УВОДЗІНЫ

Нараджэнне і выхаванне дзяцей былі ў беларускага народа натуральным і галоўным прызначэннем сям'і. У народнай культуры дзеці спрадвечна лічыліся Божым дарам, дабраславеннем сям'і, былі ўвасабленнем шчасця, з імі звязваліся надзеі на бессмяротнасць – прадаўжэнне роду. Дзеці – гэта дагледжаная старасць, апрацаваная зямля, вясёлы смех унукаў у дзедаўскай хаце. Нездарма ж беларускі народ прыдумаў і захаваў у сваёй калектыўнай памяці столькі прыказак і прымавак пра дзяцей: «Многа дзяцей – многа клопату, але і радасці шмат», «Багат Аляксей – поўна хата дзяцей», «Адзін сын – не сын, два – паўсына, а тры – цэлая гаспадарка» і іншыя. І, наадварот, бяздзетнасць разглядалася як вялікае гора.

Нашы продкі, у якіх не было магчымасці вучыцца ні ў педагагічных, ні ў медыцынскіх, ні ў якіх-небудзь іншых навучальных установах, тым не меней добра разумелі працэсы фізічнага, псіхалагічнага,

эмацыянальнага, разумовага развіцця дзіцяці, асаблівасці кожнага з этапаў яго сталення. Пазней эмпірычныя народныя веды беларусаў былі пацверджаны афіцыйнай педагагічнай навукай. Так, ва ўяўленнях нашых продкаў найбольш адказным перыядам у развіцці дзіцяці лічылася ранняе маленства – час ад нараджэння да 2–3 гадоў, які пазней у афіцыйнай педагогіцы атрымаў назву «школа пеставання», або «мацярынская школа». Таксама ў традыцыйнай культуры захавалася шмат прыкладаў усведамлення нашымі продкамі ўзаемасувязі паміж усім жывым на зямлі, у адпаведнасці з чым дзіця разглядалася як неад'емная частка прыроды і Сусвету. Традыцыя прадпісвала будучым бацькам ужо на этапе зачацця і цяжарнасці клапаціцца не толькі аб фізічным здароўі дзіцяці, але і аб забяспячэнні шчаслівага лёсу для яго, аб развіцці духоўна-маральных пачаткаў. Згодна з народнымі ведамі і вераваннямі, лёс, характар, знешнасць чалавека былі абумоўлены абставінамі, якія папярэднічалі зачаццю, і паводзінамі маці ў час цяжарнасці. Час, калі дзіця знаходзілася ва ўлонні маці, справядліва лічыўся базай фарміравання будучай асобы, якая адпавядала б ідэалу чалавека ў дадзеным грамадстве. У сувязі з гэтым існаваў цэлы звод прадпісанняў і забаронаў, накіраваных на ахову плода ва ўлонні маці. Нашы продкі былі перакананы, што ўсе ўражанні і перажыванні будучай маці прама або ўскосна адаб'юцца на дзіцяці. Таму для цяжарнай жанчыны лічылася надзвычай карысным захоўваць добры настрой, часцей глядзець на што-небудзь прыгожае, слухаць меладычныя спевы. Сёння шматлікімі навуковымі даследаваннямі пацверджана, што гэты перыяд надзвычай важны для далейшага жыцця чалавека: менавіта ў гэты час закладваюцца асноўныя структуры арганізма, і любое негатыўнае ўздзеянне можа нанесці вялікую шкоду фізічнаму і псіхічнаму здароўю дзіцяці.

Вельмі важным быў сам момант нараджэння дзіцяці, з'яўлення на свет, калі, паводле традыцыйных вераванняў, вызначаўся ўвесь далейшы лёс чалавека, на які, акрамя звышнатуральных сіл, маглі паўплываць разнастайныя абрадава-магічныя дзеянні, слоўныя формулы, прадметы-сімвалы, якія выкарыстоўвалі павітуха, бацькі, родныя. Праграмаванне ўсяго далейшага жыццёвага шчаслівага лёсу дзіцяці з усімі яго складнікамі: моцнае здароўе, дабрабыт, удалы шлюб, станоўчыя маральныя якасці характару, прыгожая знешнасць – у беларусаў у мінулым пачыналася задоўга да нараджэння і вельмі актыўна ажыццяўлялася ў першыя хвіліны, дні і месяцы жыцця. Акрамя таго з самага пачатку ўжо фарміравалася палавая ідэнтычнасць індывіда: мужчы-

на – «работнік», «гаспадар», «абаронца», «муж», «бацька» і жанчына – «работніца», «гаспадыня», «жонка», «маці», што было важнейшай умовай паспяховага засваення і далейшага выканання імі адэкватнай гендэрнай ролі, усведамлення свайго месца ва ўстойлівай сістэме грамадскіх і сакральных сувязей.

Традыцыйная сям'я была першай школай, дзе дзеці спасцігалі ўрокі роднай мовы і мыслення, духоўна-маральных нормаў чалавечых узаемаадносін, засвойвалі навыкі самаабслугоўвання і працы, арыентацыі ў навакольным асяроддзі. У перыяд ранняга маленства дзіця знаходзілася пад апекай маці, якая яго карміла, даглядала, песціла. Цесныя кантакты маці з дзецьмі з самага нараджэння стымулявалі і эмацыянальна цёплы клімат зносін паміж імі ў многіх пакаленнях беларусаў. Большасць дзяцей, якіх маці называла ласкавымі словамі: «сыночак міленькі», «сыночак-галубочак», «сынок-сакалок», «дачушка-сакатушка», «ягадка мая», «дзіцятушка», помняць бязмежную мацярынскую любоў, якая ўгадвала думкі дзіцяці, старалася дагаджаць яго хаценням, сачыла за кожным крокам. Адносіны паміж маці і дзіцем – гэта цэлы комплекс розных па сваёй прыродзе кампанентаў, абумоўленых як біялагічнымі, фізіялагічнымі, псіхалагічнымі, так і сацыякультурнымі фактарамі. На працягу стагоддзяў у беларускага народа фарміраваліся ўяўленні пра мацярынства як жаночую сацыяльную ролю, што прадугледжвала канкрэтныя правілы, нормы, формы зносін маці і дзіцяці, метады і сродкі сацыялізацыі дзіцяці, правы і абавязкі жанчыны-маці ў межах традыцыйнай культуры.

З'яўленне на свет кожнага канкрэтнага дзіцяці было ўбудавана ў рытм жыцця яго бацькоў, вялікай сям'і і супольнасці трыма рознымі па працягласці перыядамі: дародавым, уласна нараджэннем і пасляродавым. У адпаведнасці з гэтым падзелам і выкладаецца матэрыял у кнізе. Тут прааналізаваны і сістэматызаваны адпаведныя працы дарэвалюцыйных даследчыкаў і палявыя запісы апошніх 10–20 гадоў – уласныя і калег: А. М. Боганевай, Т. В. Валодзінай, У. А. Ганчара, У. А. Лобача. Для выкладання матэрыялу выкарыстоўваюцца назвы гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, якія прыняты і распрацаваны даследчыкамі матэрыяльнай культуры: Заходняе і Усходняе Палессе, Усходні (Падняпроўе), Цэнтральны, Паўночны (Паазер'е), Паўночна-Заходні (Панямонне) рэгіёны ці сучасныя адміністрацыйныя назвы абласцей і раёнаў Рэспублікі Беларусь. У аўтарскі тэкст арганічна ўплятаюцца аповеды вясковых жыхароў, іх успаміны, што дае магчымасць убачыць і адчуць найвялікшую таямніцу з'яўлення на свет новага чалавека скрозь

прызму пачуццяў і хваляванняў людзей, іх паўсядзённых побытавых клопатаў. Шчырая падзяка і нізкі паклон усім нашым суразмоўцам, якія не толькі захоўваюць звычаі і абрады, але і шчодра дзеляцца сваімі ведамі. Па магчымасці ў выказваннях інфармантаў захоўваюцца дыялектныя асаблівасці.

Кніга аздоблена фотаздымкамі А. Боганевай, Т. Валодзінай, Ю. Внуковіча, Л. Загорскага, Т. Кухаронак, В. Лабачэўскай, Ю. Пракоф'евай, Я. Пясецкага, І. Смірновай, А. Шрубок, фотаздымкамі і малюнкамі з архіва ІМЭФ НАН Беларусі, а таксама здымкамі з Інтэрнэту.

# ЦЯЖАРНАСЦЬ

## Каб вяліся дзеткі

У народнай культуры дзеці спрадвечна лічыліся Божым дарам, блаславеннем сям'і, бяздзетнасць жа разглядалася як няшчасце, як пакаранне за грахі ці наступства пракляццяў і порчы. Яна была пастаяннай крыніцай канфліктаў паміж мужам і жонкай. Бяздзетная, бясплодная жанчына падвяргалася некаторым абмежаванням, перш за ўсё непажаданым лічыўся яе ўдзел у сямейных і каляндарных святах і абрадах, звязаных з ідэяй плоднасці. Часта да бяздзетнай жанчыны адносіліся зняважліва, папракаючы ў тым, што яна не здольна выканаць абавязак, ускладзены на яе прыродай і грамадствам.

Ужо ў час вяселля старэйшыя вопытныя сваячкі рабілі пэўныя захады, выконвалі абрадава-магічныя дзеянні і прыёмы, каб у маладых мужа і жонкі нарадзіліся дзеткі. Паводле сведчання А. Сержпутоўскага, для прыгатавання каравая блізкая таварышка маладой прыносіла

ваду тры разы, тройчы сыпалі муку на рошчыну, цеста мясілі тры баяркі па чарзе, дзяжу накрывалі трыма кажухамі, пры пасадцы каравая ў печ тройчы клікалі, ці няма ў хаце каго чужога, калі хтосьці застанецца хаце, яго тройчы білі радлёўкай па галаве. *«Усё гэто робляць па трэйко дзеля таго, каб тут была тройца: мужык, жонка й дзеці»*. Дровы для распальвання печы, каб выпякаць каравай, маглі браць з трох двароў і ад трох «шчаслівых» парод дрэва (прыкладам, альхі, бярозы, дуба ці сасны), але не з яліны, асіны.

Калі воз нявесты пераязджаў мост, яна павінна была ўстаць, «каб роды былі лёгкімі». У Віцебскай губерні лічылі, што, сядаючы на воз, нявеста не павінна станавіцца на кола – інакш, паводле народнага меркавання, у яе столькі гадоў не будзе дзяцей, колькі спіц у коле. На Брэстчыне, каб нараджаліся дзеці, нявеста, калі садзілася на воз, выпраўляючыся да вянца, не станавілася на кола, ці, наадварот, станавілася і загадвала: колькі спіц у коле, столькі будзе і дзяцей. Каб нявеста магла забрацца на воз, не наступаючы на кола, бацька падстаўляў ёй нагу, тым самым дадаткова забяспечваючы дачцэ ў будучым лёгкія роды. З гэтай жа мэтай – каб палегчыць першыя роды – у той час, як маладая выязджала да жаніха, на хвіліну развязвалі хамут на кані. Наогул, яшчэ да вяселля дзяўчыне існуючымі нарматывамі забаранялася сядзець на стале (ці на яго куце), бо ў такім разе яе чакалі цяжкія роды. На Брэстчыне, каб у маладых былі дзеці абодвух палоў, у павозкі, якія везлі жаніха і нявесту ў царкву, запрагалі каня і кабылу, а, *«каб дзеці не былі саплівыя, кабылу выціралі ручніком»* (Г. Кабакова). У час провадаў маладых да вянца мужчыны кідалі шапку, каб у гэтай пары першым нарадзіўся сын. Паводле традыцыйных вераванняў, колькі разоў вясельнаму поезду маладых перагародзяць дарогу – столькі ў іх будзе дзяцей.

Нявеста развязвала на сабе ўсе вузлы, каб лёгка нарадзіць і каб любіў муж, ды расшпільвала сабе каўнер, каб не быць абмежаванай у жыцці (А. Сержпутоўскі). Хаця ў час вянчання забаранялася мець на сабе металічныя ўпрыгожанні, звычай патрабаваў, каб нявеста трымала пад левымі грудзьмі сярэбраную манету альбо іншую сярэбраную рэч: тады ў яе дзяцей будуць чыстыя галовы (не будзе хвароб скуры) (Т. Валодзіна).

Паўсюль у нашым краі нявесту і жаніха за вясельным сталом садзілі на разасланы воўнай наверх кажух: *«Эта як свацьба, абізацельна на кажух садзілі маладых, каб дзеці былі кучаравыя»* (в. Трасцянка Талачынскага р-на). Настойліва прапаноўвалі маладзёнам з'есці яечню ці яблык. Асаблівую цікавасць выклікае ўжыванне яйка / яечні, што

сімвалізуе сабой наогул універсальную патэнцыю быцця, яго пастаянную гатоўнасць да ўзнікнення і развіцця. На карысць гэтай высновы можна прывесці сюжэты шматлікіх беларускіх чарадзейных казак, дзе нараджэнне героя, а часта і яго багатырскага каня звязваецца з незвычайнай жыццядайнай сілай яйка.

А ў першую шлюбную ноч хросная маці падкладвала пад пасцель маладых нож або сякеру, мужчынскія нагавіцы і інш. І самае галоўнае: на традыцыйным вяселлі жаніх і нявеста ніколі не пілі гарэлкі, каб пазбегнуць зачацця непаўнавартаснага хворага дзіцяці ў стане алкагольнага ап'янення. Затое іх частавалі мёдам і не толькі на вяселлі, але і пасля яго на працягу месяца – вось адкуль і пайшоў выраз «мядовы месяц».

Вельмі асцерагаліся шкоднага ўздзеяння злых сіл і чараўнікоў, якія маглі наслаць на маладых бясплоднасць, і імкнуліся, як умелі і ведалі, засцерагчы ад гэтага маладзёнаў. Да найболей вядомых сродкаў абароны адносяцца наступныя: праезд вясельнай працэсіі праз агонь, пырсканне на яе «святой» вадой, нашэнне маладым зімовай шапкі на працягу ўсяго вяселля, прымацоўванне да адзення маладой разнастайных металічных вырабаў, прадметаў чырвонага колеру, часнаку і г. д.

Але ж бясподнасць у жанчын сустракалася, і самай распаўсюджанай прычынай яе лічыўся няўдалы час нараджэння: ноччу ў канцы адной квадры месяца і на пачатку новай. Бясплоднасць імкнуліся вылечыць разнастайнымі сродкамі народнай медыцыны, магічнымі прыёмамі. Найбольш дзейснымі і эфектыўнымі лічыліся з'яданне зародка курыных яек, піццё настойкі дзіцячай плацэнты ці плацэнты кошкі, крыві з пупавіны нованароджанага і г. д. Шматлікія з зафіксаваных прыёмаў і спосабаў, накіраваных на лячэнне бясплоднасці ў жанчын, відавочна, звязваліся ў далёкім мінулым з культам урадлівасці. Сюды адносяцца піццё адвару разнастайнай расады, кары дрэў, абліванне бясплоднага дрэва вадой, у якой знаходзілася жаночая сарочка, памытая пасля менструацыі. Магла дапамагчы бяздзетнай пазбавіцца сваёй немачы іншая жанчына, якая знаходзілася ў стане цяжарнасці: *«Я сама была бярэменная, прíхадзіла ка мне саседка, дзяцей у яе не было. Яна бярэменела, но не вынашувала. Так яна прíхадзіла ка мне, у мяне быў фартук, гаворя: "Ты бярэменная, у фартук хлеба накладзі і дай мне". Ёй нада даць, штоб яна забеременела. Можна хлеб, можна якое яблыка, любое»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на).

Культ продкаў, шырока распаўсюджаны ў мінулым сярод беларусаў, знайшоў адлюстраванне ў тым, што да іх звярталіся за дапамогай,



Сяляне ў ваколіцах Гродна. Літаграфія Я. Лявіцкага. 1841 г.



Нявесцін камень, ля якога бяздзетныя жанчыны прасілі дзяцей. Ашмянскі р-н



Аброкі каля Нявесціна камня. Ашмянскі р-н

калі ў сям'і не нараджаліся або паміралі дзеці. Бясплодныя жанчыны ішлі прасіць пра дзетак і да святых крыніц, і да святых камянёў, пілі там вадзічку, пакідалі аброкі: *«Перш чым прасіць у камня, трэба згаварыць малітву, вот згаворыш малітву, а тады просіш у камня. Пра сябе гаворыш. Камень прасілі, камень абнімалі, лажылісь на камень, некаторыя залазілі наверх і садзілісь. Як чысцілі мы тады камень, дак жанчына адна расказвала, што ў Ашмянах адна жанчына не магла мець дзяцей. І яны кажды вечар прыязджалі да гэтага камня, дзве нядзелі. Но, каб іх ніхто ня відзеў, каб ні с кім яны не спаткаліся. З мужам удваіх ездзілі да гэтага камня. Гаварылі, што яна нарадзіла дзіця. Мая пляменніца прыязджала, дзесяць лет замужам – і нет дзяцей. Пробавалі і ЭКО, не палучаецца. Да, маладыя едуць туда, усе свадзьбы едуць туда. Лентачкі эта цяпер сталі навязваць на дрэўца, раньша грошы лажылі пад камень, прасілі, хто чаго хацеў. Гаварылі, што была там такая выемачка»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на).

## Зачатак жыцця

Хто з нас у дзяцінстве хаця б адзін раз не звяртаўся да дарослых з пытаннем: «Адкуль або дзе вы мяне ўзялі?» або «Адкуль з'явіліся мой брацік ці мая сястрычка?» І часцей за ўсё чулі ў адказ: «Бусел прынёс» ці «У капусце знайшлі»: *«У капусце нашлі, а то кажуць, бусел прынёс»* (в. Паршына Горацкага р-на); *«Бусел дзяцей нося, у капусце знайшлі, бо яна лапушыстая. Я ўжо вялікая была, крычала: "Бацян, бацян, дзіця прынясі" – відзіш ляціць, так і гаворыш»* (в. Паляны Ашмянскага р-на); *«Дзед мне гаварыў: "Цябе ў капусце найшлі, дак ты такая кіслая, нягодная"»* (в. Церабаў Петрыкаўскага р-на); *"Матка гаварыла, што ў капусце нашла. А ў нас агарод возле речкі быў. Я думаю: "У капусце нашла" –*

*як-та пажмеш плячамі. І тады прідзеш паглядзіш на тую капусту – нігдзе не відна таго дзіцяці»* (в. Сідараўка Краснапольскага р-на).

Дык адкуль жа браліся дзеці? Безумоўна, у беларусаў існавалі рацыянальныя ўяўленні аб фізіялагічных працэсах, што працякалі ў чалавечым арганізме, паводле якіх плод унутры цела маці фарміруецца з мужчынскай субстанцыі, якая перадаецца семем. Гэтае ўяўленне знайшло адлюстраванне ў аповедах інфармантаў, калі яны падкрэсліваюць, што «дзіця нарадзілася з цела маці», «маці нарадзіла». Але побач з такім фізіялагічным комплексам у традыцыйнай культуры існавалі і міфалагічныя ўяўленні аб нараджэнні дзяцей, паводле якіх зародкі жыцця здольныя былі патрапіць у цела жанчыны звонку. Узгадаем хаця б сюжэты беларускіх чарадзейных казак, дзе галоўны герой, які ў далейшым становіцца асілкам, з'яўляецца на свет у выніку незвычайнага зачацця: жанчына з'ела гарошыну і зацяжарыла («Пакаці гарошак»), у цела жанчыны трапляе рыба – нараджаецца хлопчык («Іван – царскі сын»), яна зацяжарыла ад мядзведзя («Івашка – мядзведжае вушка») і г. д.

Часцей за ўсё, паводле ўяўленняў нашых продкаў, іх прыносіў бусел або іншыя птушкі ці жывёлы – як дзікія, так і хатнія: варона, сарока, куры; заяц, вавёрка, ліса, воўк, мядзведзь; сабака, карова: *«Мне было год 5 ці 6, а наша суседка, бабка, была павітухай. То мы да яе ўсе прыставалі: "Бабочка, мілая, дзе Вы дзіця бярэце?" Бабка паказала на куст парэчак і кажа: "Ось там, мне іх туды бусел прыносіць". Так мы пасля палкай паролі туды, усё дзіця шукалі, думалі знойдзем самі»* (в. Саволеўка Гродзенскага р-на). Часта тлумачылі з'яўленне дзіцяці дарам з нябёсаў («Бог даў дзіця», «дзіця ўпала з неба», «упала з коміна», пазней – «самалёт ляцеў і скінуў»): *«Нада было мне раджаць, нада ў бальніцу ехаць, скорая не прыехала, прышлося ў дварэ раджаць. Галя ў школу хадзіла, прышла са школы, а мы ляжым: "Мама, дзе ты дзіця ўзяла? – У лесе. Ляцеў самалёт і скінуў: дзевачку мы забралі, а мальчыка воўк схваціў»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на). Птушкі – варона, сарока, куры, – паводле выказванняў, маглі знайсці, выкапаць / выграбсці дзіця на сметніку ці «з ляпёшкі каня». Адзначаны матыў, у адрозненне ад іншых, лакалізуецца пераважна на тэрыторыі ўсходняй часткі Віцебскай вобласці. Акрамя агульнавядомай капусты, знайсці дзіця можна было і ў бульбе, бураках, гарбузах, бабах, моркве, гароху, агурках, якія раслі на ўласным агародзе або недалёка ад сядзібы, дзе вырошчвалі жыта, лён, грэчку, авёс, каноплі. Бацькі хадзілі шукаць дзяцей у лузе, полі, стозе сена, да рэчкі, возера, балота, дзе іх вылаўлівалі. Даволі часта сустракаюцца запісы, якія сведчаць, што дзіця знайшлі ў рэчцы / за рэчкай / у вадзе / у яме / у калодзежы. Магла прынесці



*Буслы ў в. Добрае. Маларыцкі р-н. 1953 г. Фотаздымак М. Грынблата. Архіў ІМЭФ НАН Беларусі*



*Буслы ў в. Любішчыцы. Івацэвіцкі р-н. 1970 г. Фотаздымак М. Лобача. Архіў ІМЭФ НАН Беларусі*



*Буслы. Фотаздымак Т. Валодзінай*

дзіця і рыба. Маці ж часцей за ўсё знаходзіла дзіця ў жыце, як жала, а бацька ў час севу ў баразне ці на раллі. На пладовых дрэвах, што раслі каля хаты, таксама вельмі часта знаходзілі дзяцей: *«на грушы знайшлі, туды бусел прынёс»*, *«з грушы стрэслі»*. Адным з распаўсюджаных локусаў, дзе знаходзілі дзіця, з'яўлялася хата, а ў хаце менавіта печ і надворныя пабудовы: баня, хлеў, ток. Пастаянна ў аповедах інфармантаў фігуруе такі локус, як лес, а ў ім дзеці знаходзіліся на елцы або ў ягадах. Прасцей і хутчэй, паводле выказванняў інфармантаў, магчыма было знайсці дзіця на дарозе, вуліцы, мосце / пад мастом, якія ў фальклоры выступаюць як мяжа паміж «гэтым» і «іншым» светам.

Стараліся дапамагчы бацькам займець дзіця і міфалагічныя істоты (дамавы, Дзед Мароз), выпадковыя людзі – баба / старуха / дзед, дзядзька, або хтосьці з радні: *«Старшым дзецям гаварылі, што дзіця ў хвартусе прынесла бабка. Або бывала скажуць: "Картошку капалі і ў картошцы нашла", то "бусел прынёс", то "ў капусце нашлі". А цяперака ўсе дзеці знаюць, дзе яны купляюцца»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на). Тыя, хто прыносіў дзіця, маглі валодаць пэўнымі «магічнымі» якасцямі (ведзьма, чараўнік, што збліжае іх з міфічнымі істотамі), а таксама не адносіцца да бліжэйшага сацыяльнага асяроддзя дзіцяці – цыган, анучнік.

У пазнейшыя часы паўсюль тлумачылі дзецям, што іх купілі на кірмашы, у краме, наогул у горадзе, ці проста ўзялі ў бальніцы, што звязана з сучасным развіццём медыцыны: *«У бальніцы, у ванночке нашлі. У меня Галя ешчо спрашывала, когда Валя радзілась, у меня дзеці Галя, Валя, Толік і Валерык, дак Галя спрашывала: "Мама, где ты*

*взяла яе, прывязла откуда?". Ужэ ей быў пяты годзік. Я гавару: "Там у бальніцы басейн такі, ванна такая бальшая і там плавают маленькія дзеці". Она мне гаварыт: "А пачэму ты, мама, мальчыка не прывязла?" Я гавару: "Сказалі, што крайняе пападзецца ў ванне, то тваё. Крайняя была дзевачка"»* (в. Хаціслаў Маларыцкага р-на).

## Правілы для цяжарнай жанчыны і тых, хто побач

Ад абставін, якія папярэднічалі зачаццю, і паводзін цяжарнай жанчыны, паводле народных уяўленняў, залежалі знешнасць, здароўе, характар і нават само жыццё будучага дзіцяці. У традыцыйным беларускім грамадстве ведалі, што нельга зачынаць дзіця ў вялікія каляндарныя і рэлігійныя святы, у перыяды пастоў, каб яно не нарадзілася непаўнавартасным. Забароны адносна зачацця выцякалі з уяўленняў нашых продкаў аб існаванні «гэтага свету», дзе жыў сам чалавек і дзейнічала пэўная сістэма сацыяльных адносін і маральных каштоўнасцей, жыццё працякала пры будзённым «жывым» часе, і «таго свету», дзе знаходзіліся загадкавыя звышнатуральныя сілы, якія ўрываліся ў гэты свет на святы, калі панаваў святочны «мёртвы» час: *«После Духа крывая нядзеля, яна апасная, нельзя нічога дзелаць. Гаварылі дажа, штоб нікакога зачація ў эта время не было»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на). Правільнае зачацце павінна было забяспечыць нармальнае працяканне цяжарнасці, роды без вялікіх складанасцей, прадвызначыць станоўчыя якасці дзіцяці, яго добры лёс і шчаслівае жыццё.

Ва ўсе часы бацька хацеў мець сына, пераемніка, таму імкнуліся спрагназаваць пол будучага дзіцяці. Лічылася, што хлопчыка можна было зачаць у ноч з панядзелка на аўторак, а дзяўчынку – з пятніцы на суботу. Значнай аказвалася апазіцыя правае / левае. Каб зачаць хлопчыка, патрэбна было пачынаць інтымныя адносіны з правага боку, ці муж павінен быў некаторы час пасля гэтага паляжаць на правай руцэ жонкі, або яна сама – паляжаць на правым баку і г. д.: *«Калі хочаш хлопчыка, мужык як злезіць з цябе, а ты раз – і на правы бок павярніся»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на). Адпаведна, каб зачаць дзяўчынку, усе вышэйпералічаныя дзеянні патрэбна было выконваць з левага боку. Выкарыстанне некаторых прадметаў таксама дапамагала паўплываць на пол будучага дзіцяці. Так, каб зачаць хлопчыка, патрэбна было пад ложак пакласці мужчынскую шапку, сякеру, нож, каменьчык, а каб дзяўчынку – адпаведна хустку, верацяно, кудзелю.

Пра тое, што жанчына цяжарная, яна магла спачатку здагадацца сама, убачыўшы ў сне голенькіх дзяцей, жывую рыбу. Калі ж да таго, яна бачыла ў сне, што ловіць пеўня ці ката, лічылася, што ў яе народзіцца хлопчык, калі курыцу або кошку – дзяўчынка. Пасля здагадваліся самыя блізкія сваякі, назіраючы за тым, як кабету нудзіць, ці як у яе раптам узнікае моцнае жаданне што-небудзь з'есці, ці прыкмячалі іншыя ледзьве заўважныя змены ў яе вобліку: *«Ну, гэта ж старыя людзі зналі. Я сама хадзіла бярэменная, а нічога ня чуствавала. А свякроўка кажыць: "Ты ж ужо, дзетка, едзеш другой, нізінкай ужо едзеш". Па вачах пазнала»* (в. Хвасты Браслаўскага р-на). Але ж, як кажуць, шыла ў мяшку не схаваеш, і аднавяскоўцы, асабліва старэйшыя жанчыны, пачыналі прыкмячаць «знакі», якія сведчылі пра цяжарнасць: да такой-та пачыналі лашчыцца каты і сабакі, да яе адзення чапляліся ніткі з завязанымі вузламі. На Палессі лічылі: калі над чыёй-небудзь хатай лятае і крычыць сава – там зацяжарыла маладая жанчына ці дзяўчына. Калі ў каго-небудзь нарываў палец, то гэта азначала, што зацяжарыла незамужняя дзяўчына і ўтойвае гэта. Вельмі цікава інфарманты распавядаюць пра прыкметы цяжарнасці: *«Наверна я ўжэ панісла. Я ні магу без яго быць. Я настолька скучаю (без мужыка, значыць), ён мне настолька дараг, што я, наверна, бярэменна»* (в. Радзюкі Шаркаўшчынскага р-на). Лічылася, што пра цяжарнасць трэба паведаміць як хутчэй, каб дзіця хутчэй пачало гаварыць: *«Если женщина забеременела, надо было чем быстрее это объявить, чтобы все узнали, чтобы ребенок потом быстрее заговорил»* (в. Гошава Драгічынскага р-на).

Беларускія народныя тэрміны, якімі абазначалі стан цяжарнасці, падкрэслівалі галоўным чынам знешнія цялесныя перамены жанчыны: «тоўстая», «пузатая», «чараватая», «грубая», «цяжолая», «у цяжку», «у палажэнні»: *«Тоўстая казалі. Мама кажэць: "Соня ўжо затаўсцела, гуляла с Арцёмам"»* (в. Сава Горацкага р-на). Пра цяжарную яшчэ казалі, што яна «зайшла / занялася на дзіця», «хадзіла дзецьмі» або «панесла»: *«Хадзіла дзецьмі – так казалі на цяжарную. Мы ў мамусі былі частыя дзеткі: я першая і сястрычка яшчэ, былі блізнючкі. Тады за год – Франя. А после другога года шчэ і Ірка, дзевачка»* (в. Новыя Рубяжэвічы Стаўбцоўскага р-на). У сучасных пераказах інфарманты цяжарную часцей за ўсё называюць «бярэ(е)менная».

У традыцыйным грамадстве, каб забяспечыць будучаму дзіцяці добрае здароўе, характар, прывабную знешнасць, шчаслівы лёс, цяжарная жанчына павінна была прытрымлівацца пэўных нормаў паводзін, ведаць цэлы звод прыкмет, прадпісанняў і забаронаў. Асабліва гэта тычылася першай паловы цяжарнасці. Цяжарная жанчына асце-



*Лялька-цяжарная.
Зрабіла В. А. Марчанка,
жыхарка Краснапольскага р-на.
Фота Т. Кухаронак*

рагалася ўдараў у жывот, у час цяжкіх палявых работ падвязвала яго ручніком або хусткай, не сцягвала моцна спадніцу, імкнулася не падымаць і не насіць вялікіх грузаў: «*Бярэменная цяжка не падымала, канешне, ужэ беражэшся. Ужэ все роўна трэба берагчыся, бывае, хто крапчэйшы, а хто такі слабейшы – і скінуць можа. У маёй мамы было дзев'яцеро дзяцей і толька чэцвера жывых*» (в. Паварчыцы Салігорскага р-на). Паводле народнага меркавання, яна павінна была больш рухацца і бываць на свежым паветры, каб лягчэй прайшлі будучыя роды, меней спаць, «*каб дзіця не было гультаяватае*». Лічылася, што жанчына павінна есці ўсё, што жадае («чаго душа просіць»), але ў меру, каб плод не вырас вельмі вялікім, і каб дзіця ў будучым не было ненасытным. Але разам з тым імкнуліся задаволіць разнастайныя прыхамаці цяжарнай у ежы, думаючы, што гэта прыхамаці дзіцяці.

Асабліва засцерагалі цяжарную ад сполаху: як спалохаецца будучая маці агню, асабліва падчас пажару, то ў дзіцяці ў тым самым месцы застанецца адпаведны па колеры і форме знак. Пра гэтую актуальную забарону і выпадкі яе парушэння і негатыўных наступстваў і сёння распавядаюць у кожнай беларускай вёсцы: «*Бярэменнай нельга на пажар глядзець, хапацца, бо як ухопіцца – будзя пляма страшная. Адна ў нас хадзіла, да пажар быў, і ўхапілася, як вам сказаць, за попу, і было пятно красная. А еслі за твар катора ўхопіцца – на твары будзя, было такое, было*» (в. Паварчыцы Салігорскага р-на); «*Тоўстай ваабшчэ нельзя на пажар глядзець і січас нельзя. Бывала мая мама казала: "Дзетачка, як замуж выйдзеш, на пажар не глядзі, бо як рукою мазанешся – там шрам будзець красны ў дзіцяці". Адна ў нас схапілася – дак і быў шрам красны-красны на ліцы ў дзіцяці, аж да барады*» (в. Сава Горацкага р-на); «*Када пажар, нельзя бяременнай выбегаць, а то еслі ашыбнешся, возьмешся за ліцо – то астанецца краснае пятно ў рябенка. У Казеллі*

*жэншчына схвацілася – у дзевачкі асталося пятно такое краснае на ўсю шчаку, полліца. Ва ўремя пажара мама схвацілася за ліцо. Лучча ня бечь на пажар бяременнай»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на). Небяспечным лічыўся таксама перапуд ад ваўка ці сабакі, бо, паводле народнага меркавання, на целе дзіцяці вырасце плямамі поўсць: *«Мая дочка радзіла дзевачку с пятном на ліцэ, унучка мая. І сразу не было відаць, а недзе ў годзік праявілася. Што мы не ездзілі, што не шукалі. І яна патом гаварыла, што ішла да старшай сястры, і выскачыла бальшушчая сабака. І эта сабака яе паваліла, яна спужалася надта. А сабака рвала ў яе сумачку і яна этай сумачкай закрывалася, каб ліцо хаця не парвала. Яна гаварыла, што не магла падняцца і не знаю, штоб было, еслі б сын іх не выскачыў. Можа яна яе і парвала б гэта сабака. І ўсё раўно дзе-та сабака датронулася ёй да ліца. І ўнучцы мы і каталі хлебам, і вазілі к бабкам, і лазерам убіралі – і ўсё раўно, валосікі этыя сабачыя відаць. І нічога тут не зробіш»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на).

Вельмі асцярожна, па настойлівых парадах старэйшых жанчын, цяжарная паводзіла сябе з хатнімі жывёламі, бо нейкае няправільнае дзеянне магло прывесці да непрыемнасцяў і хвароб у яе будучага дзіцяці. Перш за ўсё, яна не павінна была біць і штурхаць нагамі катоў, сабак, свіней – лічылася, што на свет з'явіцца вырадак. Паводле традыцыйных уяўленняў, цяжарнай забаранялася штурхаць нагой («варсаць») ката, свінню, сабаку ці пераступаць праз іх, каб дзіця ўвесь час не чухалася: *«Як біла нагой ката матка,* <дзіця> *родзіцца – тады ў яго валосьсіка на спіне, не даюць яму спаць. Баба атрежаць хлеба, дзелаець такія галушкі і шэпчаць, па спіне водзіць і выкачаваець валасінкі. Нельзя, як беременная, штоб кот между ног прахадзіў: паложаш рябёначка – яны колюць і не даюць спаць»* (в. Печары Касцюковіцкага р-на); *«Нельзя, допусцім, кошку іллі сабаку браць на рукі, гладзіць, бо будзет эта шэрсць кошкі іллі сабакі ў ребёнка на спіне. Он не будзет спаць, будзет круціцца, у него, вродзе, шэрцінка паяўляецца какая-та на спіне, чэшацца. І вот былі такія бабкі, носілі этых дзіцей лечыць. Бабкі спекуць хлеб, раньшэ хлеб пеклі, в жорнах мололі, пеклі, в печках, самі. І этат горячый хлеб вымают і катают по спіне ребёнку – і вродзе там эта шэрсць этым хлебом выкатываецца. І, вродзе, после этого ребёнок успакаіваецца, вродзі, спіт»* (в. Хацiслаў Маларыцкага р-на): *«Када ў палажэнні, ім ката няльзя штурхаць нагой – у рябенка валосікі вырастуць на спінке»* (в. Заходы Шклоўскага р-на); *«Кажуць, як бярэманная ката кідаець – рабёнак абрасцець мохам. Нельзя біць сабаку, ката – рабёнак можаць радзіцца касматы» (в. Азяркі*

*Верхнядзвінскага* р-на). Каб нованароджанае дзіця не было плаксівае (*«не енчылася»*), цяжарным забаранялася біць свіней нагамі ў час іх кармлення. Даволі часта ў аповедах інфармантаў згадваецца мыш як крыніца небяспекі: *«Дажа мышка прабяжыць і то нельзя баяцца і за сябе хватацца – будзе пятнышка і шэрсць, як у мышкі»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на).

Небяспечным было калечыць і жабу ці пераступаць праз яе, інакш, лічылася, дзіця будзе гарбатае і доўга не навучыцца хадзіць. Перапуд, чым бы ён не быў выкліканы, мог прывесці да заўчасных родаў, выкідыша – *«спарона»*. Каб пазбегнуць гэтага, цяжарная жанчына павінна была заткнуць за пояс вялікі палец левай рукі (Палессе) або з'есці жменю жытняй мукі, перамешанай з вадою. Калі побач былі старэйшыя сямейнікі, яны пераварочвалі вядро дагары, налівалі на дно вады, затым ваду злівалі ў стакан і давалі піць цяжарнай (Рэчыцкі павет).

Старэйшыя сваячкі перасцерагалі жанчыну прысутнічаць на пахаваннях, глядзець на нябожчыка, бо ў дзіцяці магла быць цяжкая хвароба ці жоўты хваравіты колер твару: *«Я была бярэменная і пашла на пахараны і стала глядзець. А там была старая Рыміхіна бабка – Варка, яна мяне сразу выгнала с хаты: "Выхадзі вон, ідзі на вуліцу"»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на). Калі цяжарная ўсё ж вымушана была ісці на пахаванне, яна, каб пазбегнуць непрыемнасцей, прывязвала да пояса чырвоную нітку ці завязвала на галаву чырвоную хустку.

Каб дзіця не нарадзілася калекам, паўсюль на Беларусі цяжарным забаранялася працаваць у святы, пэўныя перыяды каляндарнага года (калядныя вечары, велікодны, траецкі / духаўскі тыдзень), у нядзелю: *«Прывязлі маладзіцу ражаць. Яна радзіла хлопчыка, но нікому не паказалі, кажуць, рассечана і губа, і дзясны – урода было. Дак яна гаворыць, што на траецкай ці велікоднай нядзелі, мужык п'яніца быў, да палена расколваў, і эта случылася дзіцяці яго. Яно й памерла. Дзейсцівецельна, ета праўда: велікодная, траецкая нядзеля – ета апасная для дзяцей і жэншчын»* (в. Слабодка Акцябрскага р-на); *«Гаварат, кагда ты бярэменная, нельзя ў празьнікі бяллё сціраць і вот во яго круціць – а то пупавіна закруцічца ў малога на шыі»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на); *«Вот святая нядзеля есь после Пасхі, после Духа тая нядзеля, Усегда гаварілі бярэменным: "Дзеткі, беряжыцеся". Можэць калечка радзіцца, што ты здзелаў ці зашыеш што, ці залапіш, ці ўваб'еш што – усё на дзіцёнка атражаецца»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на); *«Бяременнай Бог так сказаў: "Шесць дней тваіх рабочых, а сядзьмой аддай Богу". Нічога ня дзелай у васкрасенне, еслі ты бяременная, хватая такіх дней для работы. Абезацельна нада празьнік саблюдаць бяременнай»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на).

Цяжарная жанчына ведала няпісаны звод прыкмет, абмежаванняў, забаронаў і прытрымлівалася яго, каб не зашкодзіць будучаму немаўляці. Так, «тоўстай» нельга было тушыць нагамі галавешку, што выпадзе з печы, бо ў дзіцяці будзе балець жыватох; грызці пазногці – у дзіцяці будзе грыжа; пляваццa ў прыбіральнік ці, пачуўшы дрэнны пах, зацiскаць нос, каб у дзіцяці з рота не смуродзіла: *«Бярэменнай ні на кога казаць нельзя, хоць і чуеш, што ваняе, маўчы – бо будзе з роціку ў дзіцяці ваняць»* (в. Дудзічы Калінкавіцкага р-на). Цяжарнай забаранялася стукаць чапялой аб падлогу – дзіця будзе губатае (*«грыбатае»*). Як раілі ёй, цяжарная жанчына імкнулася не насіць за пазухай птушанят, кацянят, арэхі, гарбузікі, яйкі – у немаўляці будуць скулы на целе; не насіць у хвартуху крупы – у дзіцяці з'явяцца болькі на целе; не хадзіць басанож па апілках (*«пілавінні»*) – у дзіцяці будзе балець страўнік (*«рэзі»*). Паўсюль на Беларусі бытавала наступнае павер'е: цяжарным нельга нічога браць голымі рукамі з агню і перадаваць другому чалавеку што-небудзь праз агонь, бо ў народзе лічылі, што ў гэтым выпадку дзіця вырасце злодзеем (*«будзе ўсё красці, бы з агню хапаць»*). У прысутнасці цяжарнай асцерагаліся на ганку калоць дровы, а яе саму папярэджвалі, каб не пераступала праз сякеру, моцна не стукала нажом па стале, што магло прывесці да нараджэння дзіцяці з рассечанай («заячай») губой: *«Пераступаць праз тапор бярэменнай няльзя, дзе сякуць дровы няльзя хадзіць, а то будзя заячча губа ў дзіцяці»* (в. Клінок Чэрвеньскага р-на); *«Нельзя, когда готовишь, ножом стучать по столу – у ребенка может быть заячья губа»* (в. Гошава Драгічынскага р-на). У сям'і раілі маладой цяжарнай жанчыне, каб яна, выграбаючы попел з печы, прыгатаванай для выпечкі хлеба, не тушыла галавешку нагамі, што магло прывесці да працяглай хваробы страўніка ў дзіцяці.

Старэйшыя ёй пастаянна нагадвалі, што нельга зашываць адзенне на сабе – будуць цяжкія роды, спяшацца пры размове – дзіця будзе заікацца, падстрыгаць валасы, каб «не ўкараціць дзіцяці розум». Таксама цяжарнай жанчыне забаранялася зашпільваць шпільку на грудзях – у дзіцяці, лічылася, будзе крывы нос; вітаць іншых людзей з ежай у роце – у гэтым выпадку дзіця будзе шапялявіць. Цяжарныя жанчыны стараліся не пакідаць смецця на прыпечку, калі палілі ў печы, не каштаваць у час прыгатавання кісялю на Каляды, не ўмывацца дажджавой вадой, якая сцякала са страхі, не хавацца ад дажджу пад паветкаю, бо верылі, што ў такім разе іх дзіця ўсё жыццё не пазбавіцца насмарку. Лічылася таксама, што калі цяжарная вылье рэшткі вады з посуду, то дзіця будзе ўвесь час ванітаваць ці адліваць назад ежу: *«Казалі* <цяжарнай>*, як цягае воду з калодзежа, з вядра ліць назад нельзя, піць нельзя, бо будзе*

*дзіця атліваць»* (в. Дудзічы Калінкавіцкага р-на). Забаранялася цяжарнай штосьці піць ці есці, седзячы на ложку, бо, лічылася, што дзіця будзе мачыцца ў ложак, нават стаўшы дарослым. У час цяжарнасці жанчына засцерагалася глядзецца ў люстэрка, каб дзіця не нарадзілася касавокае; глядзець у лужыну ці калодзеж: калі ўбачыш там свой адбітак – дзіця будзе сляпое. Народная традыцыя не раіла цяжарнай станавіцца на той круг на падлозе, які заставаўся ад мокрага вядра, інакш, прадказвалі, што ў дзіцяці ўсё цела будзе пакрыта лішаём.

Цяжарныя жанчыны таксама асцерагаліся, каб не апрануць адзенне навыварат ці мужчынскага адзення – дзіця магло нарадзіцца двухполым ці ў далейшым змяніць пол, што, паводле народных уяўленняў, складала найвялікшую кару для ўсёй сям'і і роду (Віцебская губерня).

Другая група павер'яў павінна была забяспечыць фарміраванне станоўчых, паводле нормаў народнай маралі, якасцей характару будучага чалавека. Напрыклад, цяжарнай жанчыне забаранялася красці, маніць, зайздросціць, лаяцца, каб не нарадзіць манюку, злодзея, зайздросніка, грубіяна: *«Бярэменнай нада сябе глядзець, нада асцярагацца, каб не ўкрала яна нічога – бо і дзіця будзя красці»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Мне мая свякруха расказвала. Як яна выйшла замуж, у яе маці ўмярла маладая, яна засталася падрашчаком, бедная была. І вышла за беднага, і ў яго маці не было, адзін бацька. А знаеця, як у тое ўрэмя без маці цяжка было. А ў яе дзеці былі адзін за адным, настолька цяжка было, мусіла бярэменная і на работу хадзіць, і ўсё. І, гаворыць, пашла лён трапаць. А некалі ж самі кужэль пралі, і яна жменьку скруціць і сабе за пазуху і за пояс – украдзе. І ўсё прыносіла сабе, бо нада ж было прасьці, ткаць. І Валодзю этага радзіла, но эта ўжо точна. Яна мне гаварыла: "Толькі глядзі нідзе нічога не бяры". Гаворыць, маленькі, годзікі чатыры, возле хаты бегае, гуляе і ўсе камушкі пасабірая. Прыходзіць во такі во – тоўсты. І прасіла, і плакала, і сама сабе думая: "Эта ж я сваё дзіця скалечыла, сама скалечыла". Надта ж баяліся, што будзе красьці. Усё неяк яму гаварылі, прасілі. Праўда, вырас, не стаў красьці»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Гаварілі, што як мама* <дрэнна сябе паводзіць>*, так і дзіцёнак будзець непутный, будзець красці, біцца і с людзьмі, і ў сям'е. Нехарошый будзець дзіцёнак»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на).

Непажаданым лічылася саступаць каму б ні было дарогу пры сустрэчы на сцежцы ці ў дзвярах, каб дзіця ў жыцці мела поспех і ўдачу. На Віцебшчыне лічылі, што цяжарная жанчына павінна часцей хадзіць у царкву і станавіцца там наперадзе, каб не маліцца ў патыліцы і спіны астатніх, бо гэта магло прывесці да адставання дзіцяці ва ўсіх жыццёвых справах ад іншых людзей («будзе ў паследышах»).

Цяжарную жанчыну засцерагалі ад усяго, што магло выклікаць у яе адмоўныя эмоцыі, такія, як жах, гнеў, крыўда, прыкрасць, злосць. Справядліва лічылася, што ўсе ўражанні і перажыванні прама або ўскосна адаб'юцца на дзіцяці. Цяжарным нельга было глядзець на пачварных людзей, смяяцца з іх фізічных ці псіхічных недахопаў, бо будучае дзіця магло пераняць тыя ж недахопы. Нездарма ж у беларусаў кажуць: «Хто з каго смяецца – тое яму імецца»: *«Як убачыш калеку, нельзя смяяцца над ім, старыя бабы гаварылі так»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на); *«У палажэнні нельзя на плахое глядзець. Вот чалавек які плахі, калека, ці скаціна якая нехарошая, нельзя глядзець, бо ўсё атражаецца на рябёнка»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на).

Іншыя забароны таксама адлюстроўвалі агульнапрынятыя нормы паводзін: цяжарныя не павінны нявечыць жаб, разбураць гнёзды ластавак, падглядваць, рабіць што-небудзь употай ад мужа ці іншых членаў сям'і, выкідваць хлеб, есці з гаршка і г. д.

Вельмі клапаціліся пра забяспячэнне паспяховых родаў і вучылі маладых жанчын, як для гэтага сябе паводзіць. Так, цяжарнай жанчыне забаранялася сядзець на камні, сядзець або стаяць на ганку, парозе, у варотах – роды будуць цяжкія: *«На парозе нялъзя стаяць, бо роды доўга будуць, пака дзіця асвабодзіцца»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Жанчынам* <цяжарным> *многа гаварылася: неможна пад вяроўкі пралазіць, праз пералаз, забор, на парозе нельга сядаць – цяжка будзе ражаць»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на).

Шырокавядомай па ўсёй Беларусі была забарона для цяжарных пераступаць праз вяроўку, пралазіць пад жэрдкамі, вязаць, плесці, выкручваць бялізну, бо дзіця можа заблытацца ў пупавіне і памерці ў час родаў: *«Як бярэменная ходзіш, нельзя бяллё круціць, як палошчаш»* (в. Лаўрэнаўка Талачынскага р-на); *«Патом вяроўкі былі, штоб не пераступала вяроўку, аглоблі – а то будзе пупавіна за шыю заматана»* (в. Баркалабава Быхаўскага р-на); *«От свекрови я переняла много ценной информации, когда я была беременная. Вот она мне все говорила, что можно делать, что нельзя. Вот там много еще загорожено жердями, нельзя под этими жердями проходить, нельзя через веревку переступать, а то пупавина закрутится»* (в. Гошава Драгічынскага р-на); *«Чараз вяроўку нялъзя пераступаць бярэменнай, каня прывяжаш і лейцы – атайдзі, не пераступай, а то пупавіна заматаецца»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на); *«Хадзілі раньша на рэчку бяллё мыць і круцілі, а бярэменным нялъзя круціць – пупавіна ў дзяцёнка закруціцца за шыю»* (в. Заходы Шклоўскага р-на). На Віцебшчыне цяжарным не раілі трымаць або цягнуць за рогі цельную карову – інакш у час родаў будуць слабыя патугі і роды будуць доўга цягнуцца.

На працягу стагоддзяў у сям'і ад старэйшых жанчын да маладзейшых перадаваліся веды, што цяжарнай нельга хадзіць да каго-небудзь пазычаць разнастайныя прадметы і рэчы, бо маглі не даць таго, што яна прасіла, а кінуць услед пясок або гліну – тады дзіця ўсё жыццё будзе жыць у вялікай беднасці: *«Бярэмяннай не трэба хадзіць пазычаць, а то хто кіня ўслед пясок ці гліну -- дзіця будзя жыць у беднасці»* (в. Клінок Чэрвеньскага р-на); *«Ей <цяжарнай> нічога не нада прасіць, а то возьмець хто гліны кініць ззаду, вугля. Тады рабёнак будзець есці вуглі ці гліну. А калі нічога ня кініш – тваё мышы з'ядуць»* (в. Бялькоўшчына Верхнядзвінскага р-на); *«Пазычаць нельга, таму што адзін можа пазычыць, а другі – кіне што-нібудзь і пажадае плахое. І дзіцятку будзе дрэнна. Напрымер, сыпане пясок – будзе дзіцятка пясок есці»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на). У некаторых жа раёнах Палесся, наадварот, цяжарнай раілі часцей хадзіць пазычаць што-небудзь у суседзяў і знаёмых, таму што яна магла натрапіць на чалавека з «лёгкай рукой» – і роды ў яе пройдуць хутка і паспяхова. Паводле народнага меркавання, калі цяжарная прыйшла пазычыць ці купіць якую-небудзь рэч, трэба ёй даць тое, што яна просіць, бо ўсё роўна гэта рэч прападзе (*«яе з'ядуць мышы»*): *«Еслі тоўста прыдзет позычаць, попросіць, надо не отказываць, надо даваць, потому што мышы будуць все в хаце есць»* (в. Хацслаў Маларыцкага р-на); *«Я была Мішам бярэменная і пашла к Сіняковым купіць цыбулі, а яны ўжо прадалі. А баба іх кажа, нада хоць сколькі ёй прадаць, няльзя яе пусціць с хаты, бо яна бярэменная. Яны мне тры кілаграмы прадалі»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на).

Але ж існавалі не толькі забароны, штосьці і раілі цяжарным зрабіць, каб паспрыяць дабру для свайго будучага дзіцяткі: *«Я слышала, кагда бярэменная, нада ат булкі хлеба аткусваць – ребенак будзе такі кругленькі, пышненькі, здаровенькі. Раньшэ ж хлеб свой пяклі»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на). На Віцебшчыне, напрыклад, цяжарным раілі красці гарох у суседзяў, каб у дзіцяці былі курчавыя валасы (в. Верхняе Глыбоцкага р-на). Каб дзіця не баялася сурокаў, паўсюль на Беларусі цяжарная ўвесь час павінна была насіць фартух.

Нашым продкам, як і нам зараз, хацелася загадзя ведаць, хто ж народзіцца: хлопчык ці дзяўчынка? Ультрагукавой дыягностыкі тады не існавала, таму ўважліва назіралі за цяжарнай, яе знешнасцю, паводзінамі і паступова назапасіліся разнастайныя прыкметы для вызначэння полу будучага дзіцяці. Варажылі пра пол будучага дзіцяці і сама цяжарная, свякруха, маці, іншыя сваячкі. Так, лічылі, калі ў цяжарнай твар чысты, ярка-чырвоныя шчокі, выпуклы жывот – народзіцца хлопчык, калі ж твар у плямах, бледны, жывот пляскаты – дзяўчынка. Больш

вопытныя старэйшыя сваячкі адзначалі: калі цяжарная часцей просіць салёнай ці кіслай ежы – у яе народзіцца хлопчык, а калі малака, мучных страў, салодкага – народзіцца дзяўчынка. Назіралі за формай валасоў на палыліцы ў жанчыны: калі валасы звіваліся ў касу – чакалі дзяўчынку, калі ж ляжалі роўна – хлопчыка. Меркавалі: калі, седзячы, цяжарная выцягвала правую нагу – народзіцца хлопчык, калі левую – дзяўчынка. Сустракалася і такая прыкмета: калі цяжарная ў адказ на пытанне: «Каго народзіш?» – саромелася, чырванела, лічылі, што ў яе будзе дзяўчынка, калі ж адказвала смела – чакаўся сын. Вопытная павітуха магла вызначыць, хто народзіцца па месцазнаходжанні плода ці першым яго варушэнні: калі плод быў у правым баку – прадказвалася нараджэнне хлопчыка, калі ў левым – дзяўчынкі.

Існавалі і іншыя больш складаныя і апасродкаваныя прыкметы: калі ў хату, у якой знаходзілася цяжарная, на вялікае свята зойдзе першым мужчына, то ў яе народзіцца сын, калі жанчына – дачка: *«У нас, як бяременная жанчына, тады гаворя(-ю)ць так: еслі ў Каляды прыдзе первая жанчына – то тады будзе дзевачка, а еслі мужык -- то будзе мальчык. І яшчэ, вот жанчыны ткалі кросны і тады Паска приходзя. Мама дае мне такую палачку, што затыкалі кросна, і гаворя: “Бяжы на вуліцу, хто там табе ўстрецiцца – мужык ці баба”. Я збегаю, устрецiла таго й таго, значыць, тая родзіць мальчыка ці дзевачку, ну, хто на падходзе ражаць»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на).

Імкнуліся вызначыць пол наступнага дзіцяці, аглядаючы немаўля, што толькі нарадзілася. Так, калі ў нованароджанай дзяўчынкі на цемечку было болей валасоў, чым ззаду на патыліцы, меркавалі, што другое дзіця ў гэтай сям'і будзе хлопчык. Прыслухоўваліся да першага слова малога, бо, паводле народнага меркавання, «тата» азначала нараджэнне наступнага хлопчыка, «мама» – дзяўчынкі. Імкнуліся вызначыць пол наступнага дзіцяці на хрэсьбінах папярэдняга. Напрыклад, пасля таго як павітуха ставіла на стол міску з кашай, што была завязана ў абрус, усе прысутныя назіралі, у які бок нахіліцца вузел ад абруса: калі ў бок ложка – народзіцца дзяўчынка, калі ў бок «кута» – хлопчык.

Усе гэтыя прыкметы, павер'і, абмежаванні былі шырокавядомы ў кожнай беларускай вёсцы, у кожнай сям'і, іх строга выконвалі, бо кожная жанчына хацела нарадзіць здаровае, прыгожае дзіця. Гэты звод правілаў з'яўляўся складовай часткай сацыяльна-псіхалагічнага механізма, які непасрэдна ўздзейнічаў на цяжарную жанчыну. У час калектыўных работ, у паўсядзённых зносінах адбывалася назіранне за яе паводзінамі, асуджэнне адхіленняў ад агульнапрынятых у дадзенай мясцовасці нормаў і ўяўленняў. Старанна прытрымліваючыся ўсіх мяс-

цовых звычаяў, жанчына набывала ўпэўненасць у паспяховым зыходзе родаў, псіхалагічна была да іх падрыхтавана. Падабенства ўмоў вясковага ладу жыцця, агульнасць сацыяльна-эканамічных працэсаў садзейнічалі захаванню ў дародавым цыкле адзінай асновы на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Адрозненні выяўляліся не столькі па этнаграфічных рэгіёнах, колькі ўнутры раёнаў – у выглядзе некалькіх варыянтаў таго ці іншага звычаю, веравання, той ці іншай забароны.

Будучы бацька, муж цяжарнай, таксама павінен быў сачыць за сваімі паводзінамі, прытрымлівацца пэўных традыцыйных абмежаванняў і забаронаў: *«Крівая нядзеля после Тройцы – ні рубіць, ні резаць, ні шыць нельзя целую нядзелю. Казалі грех бальшэй дужа, калі зацясывалі згароду, зацясывалі колікі якія. У нас быў случай такей. Яна мне сама расказывала. Яна гаворіць: “Фёдар, ні цяшы ты колікі”, крівая нядзеля была тады. А ён уся раўно, пашоў і зацясаў – і радзілась дзевачка з адной ножкай, і зацесана, точна колічак. Людзі, каторыя панімаюць, саблюдаюць еты закон»* (в. Засценкі Дубровенскага р-на); *«Праводная нядзеля пасля Вялікання, такі дзень, як і Вяліканне, ніхто нічога ня дзелаў, празнавалі. Баяцца Бога, што накажэць, нельзя дзелаць нічога. Усе празьнікі бальшыя няльзя нічога дзелаць. Бальшыя – эта Вяліканне, Мікола, Міхайла есць, многа празьнікаў, у каторыя нічога ня дзелаюць. Яны ж есць такія празьнікі, сдзелаеш. <...> Асобенна ў Каляды! Я як замуж вышла, у нас тама рядам жыла саседка. Дак тожа мужык быў, раньша ж дзелалі бораны дзеревянные, што скародзіць. Ну, і ён узяў у празьнік кляцы етыя надзелаў і пазабіваў. І жонка радзіла, і на нагах, на руках у дзевачкі пальцы былі, як кляцы»* (в. Вудага Чэрыкаўскага р-на); *«Градавая серада после Паскі, няльзя нічога дзелаць у эты дзень, можа случыцца плахое ў доме, асцярагаліся. Вот этых празнічкаў баялісь сільна. Вот раскажу вам. У маёй падругі, яна ў Трасне жыве, яна бярэменная была і мужык плёў карзіны. І после Паскі эта нядзеля няльзя нічога дзелаць абсалютна, а ён карзіны плёў на этай нядзелі – і радзілася ў яго дзеўка: і ногі, і рукі ўсё пазакручана, як карзіна. Праляжала сямнаццаць гадоў, толькі маначку кармілі, малаком кармілі, гадоў мо пятнаццаць, як яна памёрла, тая дзяўчонка. Такое гора. Бывала прыду, дак ён плача, плача, во, гавора, якое гора я сабе сдзелаў, карзіны, гавора, плёў. – “Чаго ж ты не асцярагаўся?” Няльзя, як жэншчына бярэменная і карова цельная, нічога дзелаць, дажа цыплята могуць павывесціць і пазакручаныя ногі. Такая страшная эта нядзеля была. Старыя людзі сільна ўсё глядзелі, асцерагаліся, а цяпер жа ніхто нічога не глядзіць»* (в. Хутар Быхаўскага р-на). У Віцебскай губерні муж павінен быў асцерагацца, каб не паламаць граблі ў руках цяжарнай

жонкі, не сказаць дрэннае слова ў «дрэнную» хвіліну – інакш яе чакаюць цяжкія роды. На Палессі муж цяжарнай імкнуўся не гаварыць нецэнзурных слоў і не разбураць гнёздаў ластавак, каб іх дзіця не нарадзілася мёртвым.

Сваякі, суседзі, аднавяскоўцы таксама прытрымліваліся ў адносінах да цяжарнай пэўных звычаёвых нормаў, каб не нанесці ёй шкоды: *«Адна была бярэменная, а ён узяў і кінуў мыш ей на плечы ззаду. Яна іспугалася -- і ў дзіцяці была пляма, як мыш на спіне»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на). На Палессі забаранялася кідаць у цяжарную вуглём, гарачым жалезам, лучынаю – дзіця магло нарадзіцца з «вогнікам», сыпаць на яе попел – у дзіцяці будуць вугры. У Паазер'і стараліся не патрапіць у цяжарную запалкаю, што гарэла, каб да немаўляці не прыкінуўся вогнік. Яе нельга было пужаць – маглі пачацца заўчасныя роды ці, як лічылася, дзіця народзіцца балбатуном. Здаралася, цяжарныя лезлі ў спрэчку, нават бойку, ведаючы, што іх ніхто не зачэпіць. Сялянская грамада часта выкарыстоўвала гэта ў сваіх інтарэсах: цяжарных жанчын пасылалі туды, дзе вырашалася якая-небудзь спрэчная справа, і яны звычайна выходзілі пераможцамі.

Адносіны да цяжарнай у асяроддзі беларускіх сялян былі дваістымі: з аднаго боку, яна карысталася вялікай павагай, з другога – перад ёй зведвалі некаторы страх, які вынікаў з пераканання, што цяжарная – істота загадкавая, носіць у сабе другую душу. У сувязі з гэтым яна перад самымі родамі падвяргалася некаторай ізаляцыі. Так, непажаданай з'яўлялася сустрэча з цяжарнай для чалавека, які ехаў сеяць хлеб ці вёз хлеб з поля, таму што ў гэтым выпадку, лічылася, што ўвесь хлеб з'ядуць мышы. Разам з тым цяжарныя жанчыны, у якіх падвойваліся іх магічныя прадукавальныя, жыватворныя здольнасці, маглі дабратворна ўплываць на паспяховасць любога новага пачынання, урадліваць зямлі і раслін. Так, цяжарную жанчыну прасілі першай увайсці ў новую хату, каб там былі дабрабыт і багацце; вясной пасадзіць першыя бульбіны ў зямлю, каб ураджай бульбы быў вельмі багаты; даць праз вароты хлеб карове, пабіць тую сваім фартухом дзеля паспяховай злучкі і г. д. У Заходнім Палессі для прыгатавання каравая на вяселле, калі ў родзе была на той час цяжарная жанчына – яе прызначалі першай каравайніцай, што, лічылася, будзе спрыяць прыбытку ў маладой сям'і.

Сем'і, у якіх меліся цяжарныя жанчыны, ушаноўваліся вясковай супольнасцю падчас пэўных каляндарных святаў. Так, на Гродзеншчыне, на свята Юр'я гурт жанчын абавязкова заходзіў да цяжарнай, каб павіншаваць і пажадаць нараджэння дзяцей. Наўзамен цяжарная іх

адорвала прадуктамі харчавання і ручніком ці поясам. На Міншчыне падчас зажынак да цяжарнай заносілі першы сноп, сімвал дабрабыту і шчаслівага жыцця сялянскай сям'і і ўсёй грамады: *"Сноп на покуць ставілі. Падарак нявестка клала на еты сноп для свякрові, а свякруха для нявесткі. Жней пачастуюць, яны папяюць там, патанцуюць" (в. Семежава Капыльскага р-на).*

Штучнае перарыванне цяжарнасці асуджалася, замужнія жанчыны ражалі «колькі Бог пашле». Свядомае папярэджанне цяжарнасці і аборты лічыліся адным з найвялікшых грахоў, за які жанчыну пасля смерці чакае жудаснае пакаранне: *«Сколькі яна абортоў зробіць, столькі ў яе пасьля сьмерці вужоў у грудзі ўпіўшыся. <...> Гэта праўда. Страшны грэх, страшны грэх. Гэта тое, што ўб'еш чалавека. Раней сколькі было, столькі і радзілі» (в. Сарокі Шчучынскага р-на); «Аборт – гріх, сама страшній. Кажуць так: "Думала, матка, што нас нэ будэ, а мы стоімо пэрэд Богом, бы добры люды". Это надо 70 раз каяцца, да Бога просыць, шоб простылы. Раней аборты нэ робылы»* (в. Карсынь Іванаўскага р-на).

Шмат чаго змянілася ў нашым сённяшнім жыцці, але нязменным застаецца імкненне нарадзіць здаровае, разумнае, прыгожае дзіця.



*Віншуюць цяжарную на Юр'е ў в. Ахонава. Дзятлаўскі р-н. Фотаздымак А. Боганевай*



*Зажынкавы сноп для цяжарнай. Старадарожскі р-н.*
*Фотаздымак Я. Пясецкага*

Дзякуючы распаўсюджанню навуковых ведаў, нашы сучасніцы добра ўсведамляюць, што перыяд цяжарнасці надзвычай важны для далейшага жыцця чалавека: менавіта ў гэты час закладваюцца асноўныя структуры арганізма і любое негатыўнае ўздзеянне можа нанесці вялікую шкоду фізічнаму і псіхічнаму здароўю дзіцяці. Але і традыцыйныя павер'і і ўяўленні, звязаныя з цяжарнасцю, могуць быць карыснымі, таму сучасныя маладыя жанчыны засвойваюць іх ад сваіх маці і бабуль, старэйшых сучасніц. Сёння пераважна ў вясковым соцыуме найбольш актуалізаваны наступныя павер'і: не глядзець на пачварных людзей, "страшныя фільмы" па тэлебачанні, не працаваць у рэлігійныя святы, не глядзець на пажар, не прысутнічаць на пахаванні, не падстрыгаць валасы, не зашпіляць шпільку.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# РАДЗІНЫ

## Роды

У традыцыйнай сям'і беларусаў роды хоць і былі частай падзеяй, аднак уяўлялі сабой адзін з самых напружаных момантаў у яе жыццядзейнасці. Роды, асабліва першыя, успрымаліся як адзін з самых важных псіхафізічных момантаў, звязаных з якаснай зменай стану і статусу не толькі самой жанчыны, але і яе сям'і: жанчына станавілася маці, яе муж – бацькам, яе і мужа бацькі – бабулямі і дзядулямі і да т. п. Пол дзіцяці ўплываў на адносіны блізкіх і супольнасці да маці. Так, вялікай павагай карысталася жанчына, у якой першым нараджаўся хлопчык: *«Счыталася маладзіца, пакуль не народзіць дачку, а як народзіць сына – то яшчэ маладзіца»* (в. Ляды Дубровенскага р-на). У вачах мужа гэта служыла яшчэ адным доказам захавання яго жонкай дашлюбнай цнатлівасці.

У вялікай заможнай сям'і, дзе былі яшчэ працаздольныя жанчыны, цяжарную маглі тыдні за два да родаў вызваліць ад цяжкай фізічнай

працы. Але ў бедных сем'ях, дзе рабочых рук не хапала, яна працавала да самых родаў. Паводле сведчання А. Кіркора, «цяжарная жанчына амаль да апошняй хвіліны родаў выконвала ўсе знясільваючыя абавязкі гаспадыні хаты. Яна вымала цяжкія гаршкі з печы, мясіла хлеб, знаходзілася ў полі пад спякотным небам, укладвала сена і снапы на вазы». Шматлікія экспедыцыйныя матэрыялы, атрыманыя ад інфармантаў у розных куточках Беларусі, сведчаць, што, даволі часта жанчына раджала сама, без чыёй-небудзь дапамогі, на агародзе, на сенакосе, на дварэ, у полі падчас жніва: *«Мая мама радзіла ў полі. У полі жала і жала, не пайшла дамой дажа»* (в. Вялікае Жэжліна Лепельскага р-на); *«Мяне мая мама радзіла, калі жалі ячмень. Быстра радзіла, казала. Бабулька жала, яна ёй памагла. Тады прыехаў дзедушка на кані і забраў маму і мяне малую»* (в. Паршына Горацкага р-на); *«Мама ж расказвала, шчо жалі ўсе, дажа тыя, шчо былі ў палажэньні. Ражалі прама на полі, там пупавіну перавяжуць, і, шчытай, прыцеглі дадому на кані. Вот яна дома пабудзе тры дні і пашла зноў на работу»* (в. Глыбоцкае Гомельскага р-на). У гэтым выпадку казалі: «сама сябе бабіла». Раней такіх дзяцей, якія нарадзіліся ў час жніва на жытнім полі, без дапамогі павітухі, называлі «жытнічкамі»: *«Мая бабушка жыла 103 года. Расказвала: вот жне летом жыто сярпом, жала. Жала, і болі ўзялі – радзіла. Спадніцу сподню ськінула, палатна з спадніцы разадрала, спавіла гэто дзіця, палажыла пад сноп і жаць пашла. Кончыла жаць, а тады палажыла ў прыпол і прынясла дадому жытнічка. А назаўтра зноў пайшла жаць – і здаровыя былі»* (в. Стаўпішчы Нясвіжскага р-на). У рэальным тагачасным жыцці сустракаліся і іншыя выпадкі экстрэмальных родаў: *«Маму вязлі ў бальніцу, бацька на калёсах вёз. Я па дароге радзілася і ў юбке ў подале прынясл і мяне ў бальніцу. Надзяй назвалі, бо акушэрка была Надзя Маркаўна. А яшчэ майго мужыка баба гаварыла, расказвала, каля Мхініцкага кладбішча бульбу рыла, прыпаўзла і двайнят пад пуняй радзіла. Сама, без усякіх дактароў»* (в. Буглаі Краснапольскага р-на).

Звычайна ж жанчына, адчуваючы набліжэнне родаў, імкнулася, каб пра гэта ведала як мага менш людзей, асабліва дзяўчат. Калі ж здаралася неспадзеўка і дзяўчына ўваходзіла ў хату ў час родаў, яна павінна была расплесці касу, набраць у рот вады і даць парадзісе выпіць са свайго роту – інакш роды пройдуць вельмі цяжка і ўсе абвінавацяць у гэтым дзяўчыну. Лічылася, што роды будуць доўжыцца пакутліва для парадзіхі столькі гадзін, колькі чалавек будзе ведаць пра роды. Дзе-нідзе лічылі, што і родная маці не павінна ведаць пра час родаў дачкі: *«Гаварілі толькі, штоб ніхто ня знаў, як раджаеш. Асобенна, каб*



*На жніве. Каля сяла Бычы [Бытча].*
*Фотаздымак С. М. Пракудзіна-Горскага. 1911 г.*

*маці ня знала, калі ты едзеш раджаць, бо будзе цяжола. Яна будзець перяжываць і цяжолыя роды будуць»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на). Калі ў двары мелася іншая будыніна: лазня, варыўня, гумно – парадзіха ішла туды: *«Мая мама ражала ў сарае, дзе авечкі, штоб дзеці ня відзелі, у хлеве»* (в. Хвасты Браслаўскага р-на). Найчасцей даводзілася раджаць у хаце, адкуль выправоджвалі лішніх людзей: *«Я дома раджала: первую раджала, дак мучылася. І втарога дома тожа раджала. Жыта жала, дамоў прышла і радзіла. Пака свякроў кароў падаіла, я і сына радзіла, лёгка радзіла. Раньшэ ні дзякрэту, нічога не было»* (в. Гарадзец Шклоўскага р-на); *«Пузатая раджала дома, я тожа радзіла сваіх мальцаў у етай хаце. Первага мальчыка Мішу ў сорак дзевятам гаду* <1949 г.>. *У мяне забалеў жывот, я закрічала на яго* <мужа>: *«Андрей, ідзі скарей за мамай, у мяне дужа забалеў жывот». А мама вот жыла, черяз гарод. Ён пабег за мамай, тая прішла, мне паслала салому, тряпку нейкую тама кінула, я й дзіцёнка таго радзіла. Во яны*



*Лазні ў в. Іванічы. Чэрвеньскі р-н. Фотаздымак І. Браіма. Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. 1966 г.*

*мяне пад рукі і, палок быў кала печы, палажылі мяне на той палок і дзіцёначка таго кала мяне»* (в. Ляды Дубровенскага р-на); *«Я сама ражала дома, ніхто ка мне не прыхадзіў. Мужык паехаў у Воршу дасок купіць, пол перамасціць, у дваре не было, я была адна, но былі дзеці, мужыковы плямянніцы. Дзеці яблыкам вакно пабілі, я яшчэ дура была, первыя роды. Хаджу па хаце, сярэдзіна забаліць, жывот, хаджу, хаджу, тады лягу. А вакно як раз пабіта проці маёй койкі, прастыла я, застудзіла сваю сярэдзінку. Ну, і даждала ўжо рання. Тады на дзевачку ету, яго пляменніцу, кажу: "Ніначка, збегай к бабушке, к маме маей, няхай яна прідзець". Мама пріходзіць: "А, Божа мой, а што мне с табой дзелаць?" – "А што ты будзеш дзелаць, лезь бульбу выбірай у ямку, печ жа тапіць нада, свіней карміць нада, лезь бульбу выбірай". Пакуль яна карзіну бульбы навыбірала, я мальчыка радзіла. Быстренька і харашо, ну й слава Богу! Тады яна вылезла із ямкі: "Мама, йдзі вазьмі". Мама дзярюгу ету паднясла, саматканая дзярюга была на мне, мальчыка етага ўзяла, увярцела. Кала печы ляжаў яшчэ мех пампыты, яна яго ў еты мех ды на печ»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на).

На Беларусі былі вядомы тры асноўныя паставы пры родах: лежачы, стоячы і седзячы, часцей за ўсё на каленях у мужа. У аповедах інфармантаў дамінуюць успаміны пра роды, якія адбываліся на падлозе «на палу», «на далу», куды абавязкова слалі салому, і куды парадзіха клалася, рассоўвала ногі, сагнуўшы іх у каленях. Зімой у моцныя ма-

разы жанчына клалася на печ. Іншым жанчынам лягчэй было раджаць стоячы, калі парадзіха трымалася за ручнік ці вяроўкі, што былі замацаваны да кальца на столі, абапіралася на печ ці вілкі, паставіўшы ногі на зэдлік. Яна магла абапірацца і на мужа, які трымаў яе за плечы, стоячы ці ў яе за спіной, ці тварам да яе. Каб паскорыць схваткі, парадзіха разгойдвалася ў бакі. Зусім рэдка ў мемаратах узгадваюцца роды седзячы, калі парадзіха сядзела на каленях у мужа, павярнуўшыся да яго спіной.

Родавы перыяд быў кампактным па часе: лічылася, што лёгкія роды павінны адбыцца прыкладна за гадзіну, а цяжкія – за суткі. Калі роды доўжыліся болей за суткі, то баяліся, што маці ці дзіця, ці яны абое могуць памерці. Тады для іх выратавання заказвалі малебен ці запрашалі адпаведную асобу памаліцца за пасяховае завяршэнне родаў. З гэтай жа мэтай у час задоўгіх родаў ішлі да святара прасіць адчыніць царскія вароты («райскія дзверы») у царкве.

У некаторых раёнах Цэнтральнай Беларусі жанчына падчас родаў вярталася ў хату сваіх бацькоў і там жыла пасля родаў шэсць-восем дзён: *«Як роды прыспелі, то ражала ў хаце ў маці, а жыла ў свякрухі. У маці жыла нядзелю пасля родаў. Бабка была Ганна Раманчык, хадзіла к усім роды прымаць. Ёй давалі грошы, бабцы палівалі на рукі, хто-небудзь з жанчын, хто быў у хаце»* (в. Клінок Чэрвеньскага р-на).

## Дапамога бабы-павітухі

Перыяд уласна родаў пачынаўся з моманту першых схватак цяжарнай і прыходу ў хату павітухі. Якіх толькі найменняў для яе не прыдумалі: «баб(-к)а», «баба-пупавязніца», «баба-пупоўніца», «баба-пупарэзка / пупарэзная», «баба-прыродуха / родуха», «баба, якая / што бабіць дзеці», «баба, якая пуп завязваіць» і іншыя: *«Бабу бралі, даўней жа больніц не было, бабы роды прынімалі. Мятлікі довалі бабом, хто бабіў дзіцё, полотно, яку хусточку»* (в. Мілашэвічы Лельчыцкага р-на)*; «Раней бальніц не было, звалі бабку, бабка прыдзя, усё тое, што нада, зробіць, прымя роды. Ужо бабку ўгосцяць, бабке падарак»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на).

Як правіла, павітуха была жанчына сталага веку, часцей за ўсё ўдава, якая сама ўжо перастала раджаць і ў яе мінуў клімакс – «яна ўжо адмылася», бо ў адваротным выпадку ў нованароджанай дзяўчынкі доўга не наступіць менструацыя. Павітуха не павінна мець сексуальных стасункаў з мужам, а лепш каб была ўдава, галоўная ўмова – не належаць да ўзроставай групы жанчын, здольных да дзетанараджэння. Жанчына, яшчэ здольная да дзетанараджэння, не магла, паводле

народных вераванняў, быць павітухай, бо ўспрымалася як канкурэнтка і маці, і дзіцяці. Менавіта па гэтай прычыне жанчыны і пазбягалі звяртацца да акушэрак, якіх яшчэ на пачатку XX ст. на Беларусі было вельмі мала. Павітуха была паважанай асобай, карысталася вялікім аўтарытэтам у вясковай грамады.

У павітухі быў багаты вопыт і практычныя веды па акушэрстве. Акрамя чыста ўтылітарных акушэрскіх функцый кожная бабка-павітуха выконвала цэлы шэраг магічна-абрадавых дзеянняў, якія маглі паўплываць на будучы лёс і характар чалавека. У кожнай вёсцы была свая хоць адна павітуха, а ў вялікіх – дзве ці тры. У тагачасных умовах яна з'яўлялася не толькі акушэркай і дзіцячым лекарам, але і дарадчыцай парадзіхі, і памочніцай ёй па гаспадарцы ў першыя дні пасля родаў. Адсюль тая павага да бабкі-павітухі, асабліва калі яе майстэрства знаходзіла пастаяннае пацвярджэнне ў паспяховым зыходзе родаў.

Бабка ні пры якіх абставінах не павінна была адмовіцца ісці да парадзіхі, бо адмова ўспрымалася як цяжкі грэх, і бабка магла пазбавіцца сваёй прафесіі і павагі. Звалі да парадзіхі бабку-павітуху муж, свякруха ці іншая замужняя жанчына, але не дзяўчына. Адпраўляючыся да павітухі, адразалі акраец хлеба, пасыпалі яго соллю і бралі з сабою. Прыйшоўшы, гаварылі шэптам: *«Хадзі, бабулічка, к нам. Нешта нашай маладусі ня дужа ладна дзелаецца»* (Магілеўшчына). Звычайна бабка тут жа адгукалася на просьбу. Гэты момант шырока адлюстраваны ў беларускай радзіннай паэзіі:

То й не стук стучыць,
То й не грук грučыць
Па сенечках да па новеньkіх –
То Кірылка ідзець да бабусечкі.
А бабусечка дагадалася,
Паскарусенька ўбіралася,
У адным чобаце да й без пояса,
У руках нясець да пялёначкі.

На Палессі рытуал запрашэння прадугледжваў угаворы, бабка спачатку аднеквалася і толькі пасля запэўнівання ў яе выключнасці пагаджалася. Не рэкамендавалася запрашаць павітуху, якая нядаўна прымала роды ў іншай парадзіхі, трэба было, паводле народнага меркавання, каб з таго моманту прайшоў хоць бы адзін месяц. Таксама павітусе забаранялася абмываць нябожчыка, бо выкупанае ёю дзіця магло памерці.

Акрамя таго ў асяроддзі беларускіх сялян шырока была распаўсюджана вера ў магічную сувязь паміж павітухай і прынятымі ў час родаў

«перабабленымі» ёю дзецьмі, у тое, што характар і паводзіны бабкі могуць станоўча ці адмоўна паўплываць на характар, здароўе, лёс дзіцяці. Па гэтай прычыне вясковая грамада прад'яўляла высокія патрабаванні да павітухі: яна павінна была быць веруючай, добразычлівай, акуратнай, справядлівай, на працягу жыцця ні разу не парушыць вернасць мужу. Амаральныя паводзіны бабкі-павітухі, на думку сялян, прыводзілі да таго, што павітыя ёю дзеці хварэлі, станавіліся калекамі ці паміралі.



*Радзінны ручнік з экспазіцыі Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Фотаздымак Ю. Пракоф'евай*

Накіроўваючыся да парадзіхі, бабка брала з сабою пірог або кавалачак хлеба, часта спецыяльны «радзільны» ручнік, у арнаменце якога былі сімвалічныя выявы вобразаў Маці-Радзіцельніцы, Берагіні або парадзіхі – падсвечнік з запаленымі свечкамі – ці дзіцяці. На Палессі ў дадзеным выпадку павітуха карысталася святочным ручніком, у які яна загортвала падарункі, што насіла на Вялікдзень сваім унукам. Лічылася, што гэты ручнік вельмі дапамагае ў час родаў і аблягчае пакуты парадзіхі. Універсальнае кола традыцыйных абавязкаў павітухі было даволі шырокім. Прыйшоўшы ў хату да парадзіхі, павітуха перш за ўсё малілася, запальвала перад іконамі свечкі, карысталася пасвяцонай вадой. Бабка прамаўляла спецыяльныя малітвы-замовы:

*«Шла Прачыстая Божая Маць чэраз мора,*
*Несла ключы да ўсякай душы.*
*Адкрывала, адчыняла, атмукала*
*І младзенца на свет божы выпускала.*
*Аддала дзеткі, аддай насьледкі»*

(в. Елянец Буда-Кашалёўскага р-на).

*«Прэсьвятая Бугуродзіца пасылала сына свайго да трох сьвятых дарахоў, каторыя распаряжаюцца землянымі пладамі, марскімі вадамі і жэнскімі радамі. Прідзі на помашч к рабе Божай* <імя> *і памажыця ёй. Амінь! Трі раза»* (в. Грудзінаўка Быхаўскага р-на); *«Шоў Ісус Хрыстос у чыстым полі, нёс залатыя ключы ў прыполе, младзенцу вароты адкрываць і на рукі браць. Амінь!»* (в. Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на).

«Госпаду Богу памалюся,
Гасподняй Мацеры пакланюся.
Ішла Маць Господня ў залатом венцэ,
Пояс залатом абвіта, з залатымі ключамі.
Залатыя замкі атмыкала і роды адкрывала.

*Залатыя замкі, адмыкайцесь, а роды адкрывайцесь»* (в. Елянец Буда-Кашалёўскага р-на); *«Госпаду Богу памалюся, святой Прачыстай Божай Маці пакланюся, я – са словамі, Бог – с помаччу рабе божай* <імя> *роды аткрываці. Залатыя ключы, атамкніцеся, царскія вароты атчыніцеся, а ты, анёл, шавяліся, ножкамі ўпірайся, ручкамі памагайся, даверху дабірайся»* (Полацкі р-н); *«Сам Бог на таку ходзіць, пшаніцу сее, па пшаніцы сіні цвет, радзі, Божа, ангеліка на гэты свет»* (в. Хатынічы Ганцавіцкага р-на). Бабка давала парадзісе піць ваду са сваіх рук і казала: *«Як вада лёгка сходзіць, каб так дзіця з цябе лёгка вышла» (в. Клінок Чэрвеньскага р-на).*



*Ручнік-радзільнік
А. Ц. Канстанцінавай
з в. Горы. Краснапольскі р-н.
Фотаздымак Т. Кухаронак*

Баба выкарыстоўвала веды з народнай медыцыны, заварвала травы, якія ўмацоўвалі арганізм парадзіхі, найперш адвар кветак жыта, карэнні аеру, лісця крапівы, пырэю, давала мёд. Для стымулявання патуг павітуха прымушала парадзіху хадзіць па хаце, вакол стала ці дзяжы, пераступаць праз ганак, абавязкова тройчы: *«Я вам раскажу яшчэ, як мы малыя былі з братам і ў нас раджала там саседка адна. Мужык разышоўся з ёй, і яна пера-*

*шла к нам. І тады мама мая, шчэ там саседка адна вадзіла яе кругом стала, штоб яна быстрэй раджала»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на). Баба з чапялой у руках вадзіла парадзіху тры разы вакол стала і тры разы паўтарала: «Памагі табе Гасподзь». З гэтай жа мэтай узмацнення схватак павітуха таксама раіла парадзісе як мага гучней крычаць: *«Бабка помогала рожаць, стара Печурыха. Я родыла пэрву Ксеню, раскажу Вам. Як мэнэ схваткі возьмуць, як прыперло мне, я залезла на піч і крычу. Свэкроў побачыла, як злякалася, побегла по бабку. Тая бабка прыходзіць. А ў свекрові была дочка, сын быў, свекроў выгоняе іх с хаты. ...А я крычу, это пэрвы роды, а бабка тая: "Не слухай, унучка, не слухай, крычы, нажымайся, больш крычы". А я крычу!»* (пас. Гарадзішча Пінскага р-на).



*Радзінны ручнік. Гомельскі р-н. Фотаздымак І. Смірновай*

Павітуха імкнулася дапамагчы ўсімі даступнымі ёй сродкамі адкрыцца целу парадзіхі для хуткага выхаду адтуль плода. З самага пачатку парадзіха здымала з сябе пярсцёнкі і завушніцы, расплятала косы, расшпіляла ўсе гузікі і зашпількі. Тое ж самае павінны былі зрабіць муж і астатнія, хто быў у хаце. Акрамя таго адкрывалі ўсе замкі, куфры, дзверы і вокны ў хаце, комін, развязвалі ўсе вузлы, нават самым малым дзецям у калысцы расшпілялі каўнерыкі сарочак і развязвалі паясы. Дзейсным сродкам аблягчэння пакут парадзіхі, вызвалення цела лічыўся наступны: зняць з дзяжы абруч і надзець яго тры разы на парадзіху зверху ўніз. У Слуцкім павеце шыю парадзіхі для аблягчэння яе пакут абмотвалі старой высахшай змяінай скурай. Бабка давала ёй піць «замоўленую» ваду.

Вопыт падказваў павітусе, што праграванне парадзіхі таксама паскарала працэс родаў, для чаго яна абгортвала жывот парадзіхі цёплымі ручнікамі, на жывот ёй клала бутэльку з цёплай вадой; палівала ваду на печ, дзе ляжала парадзіха, каб распарыць яе, падкурвала асвечанымі на Івана Купалу / Дзявятнік, Тройцу зёлкамі. Лічылася, што дамавы, што жыў у хаце, можа паспрыяць парадзісе, трэба толькі звяр-

нуцца да яго за дапамогай, пастукаўшы нагамі аб падлогу або венікам у столь. Пры цяжкіх зацяжных родах бабка разрывала рукамі каўнер сарочкі парадзіхі, вяла яе ў поле на перакрыжаванне дарог – «на расходныя дарогі» – і вадзіла яе там, пакуль не родзіць.

Акрамя таго, бабка павінна была ведаць усе абрадавыя дзеянні, накіраваныя на ахову маці і дзіцяці ад варожых, злых сіл, уздзеянню якіх яны, паводле народных уяўленняў, былі надзвычай падвержаны ў гэты пераломны момант. Паўсюль на Беларусі, каб адагнаць ад парадзіхі гэтыя варожыя сілы, павітуха клала ёй у ложак металічны прадмет або апаясвала яе жывот поясам, чырвонай ніткай.

Сама парадзіха таксама, выконваючы традыцыйныя правілы, магла аблегчыць свае пакуты падчас родаў: *«Як ідзеш раджаць* <у лазню>, *выйдзі з дома і дзьвер не закрываць, а насьцеж кінуць. І вузялкі ўсе разьвязаць. Кольцы, часы пасьнімаць і палажыць на пароге. Перайці мужа штаны ці надзець іх. Гаварі: "Залатыя замкі, атамкніцеся, царскія вароты, атапріцеся, у мяне, рабы Божай* <імя> *косьці з касьцямі разайдзіцеся. Як Маць Марія Ісуса Хріста радзіла, не крічаўшы, не станаўшы і людзі не слыхаўшы, так і мне памагі, сьвятая Багародзіца, радзіць і не крічаць і не станаць. Амінь!»* (в. Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на).

У беларусаў верылі, што прысутнасць мужа ці яго пэўныя дзеянні ў час родаў паскараюць іх і аблягчаюць пакуты жонкі. Дапамога мужа была даволі разнастайнай: ён прыносіў і нagrаваў ваду, падтрымліваў жонку пры патугах, выконваў загады і просьбы павітухі: *«Тая бабка подывылася на мэнэ: "Ніц не получыцца, моя ўнучка". Зове мойго чоловіка, становіць на ўслоны, я йому на шыю і вона достае* <дзіця> *з мэнэ. Я повісла, вісну і крычу, крычу.* ⟨...⟩ *Я сухая вышла, а мой чоловік і сорочку скінуў, мокры ўвесь»* (пас. Гарадзішча Пінскага р-на). На Беларускім Палессі лічылі, што ўмелая бабка магла перанесці боль парадзіхі на яе мужа, каб аблегчыць яе пакуты. Так, калі жанчына не магла доўга радзіць, муж ляжаў на лаўцы і гучна стагнаў або клаўся каля лаўкі, а жонка скакала праз яго з лаўкі; мужа прымушалі даваць парадзісе ваду са свайго рота ў яе рот; яе самую піць ваду праз заручальны пярсцёнак. Муж пераступаў праз парадзіху, якая ляжала на падлозе, ці, наадварот, яна тройчы пераступала праз яго ногі ці яго адзенне (штаны, пояс). Яшчэ нядаўна ўспаміны пра куваду (пакуты мужа падчас родаў жонкі) захоўваліся як расказы-анекдоты.

Павітуха ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а накрывала іх якім-небудзь старым споднім адзеннем бацькоў, каб у будучым дзіця жыло ў багацці і любіла родны дом. Кашуля маці ці бацькі была першай

пялёнкай немаўляці незалежна ад яго полу: *«Як Мішу радзіла, беднасць была, якія пялёначкі. Можа, баба рубашку якую раздабыла старую, можа якую тряпінку нашла чісценькую, завярнула яго ды палажыла на печ, каб жа цёпленька было. Ён жа радзіўся ў дзекабре, самыя марозы былі»* (в. Ляды Дубровенскага р-на).

Іншыя ж павітухі ўлічвалі пол дзіцяці: хлопчыка спавівалі толькі ў бацькоўскае адзенне (кашуля, штаны), каб ён быў ва ўсім падобны на бацьку, пераймаў мужчынскія якасці характару і гендарную ролю, а дзяўчынку – ва ўсё мацярынскае, каб яна пераняла фізічныя і маральныя якасці сваёй маці. На Брэстчыне лічылася, што выкарыстанне жаночага адзення для пялёнак хлопчыка магло прывесці да яго фізічнай слабасці, няўмеласці ў працы. А. Сержпутоўскі фіксаваў гэту забарону з тлумачэннем, што чорт падменіць такіх людзей: з мужчыны зробіць жанчыну, з жанчыны – мужчыну і прымусіць іх служыць сабе. Сустракаўся яшчэ і варыянт выкарыстання адзення, якое належала процілегламу полу. На Віцебшчыне і Міншчыне, калі нараджалася дзяўчынка, павітуха загортвала яе ў мужчынскія споднія нагавіцы і абавязкова бацькоўскія, каб яе ў будучым любілі хлопцы, а хлопчыка – у сарочку маці, каб яго любілі дзяўчаты. Часта павітуха загортвала дзяўчынку ў бацькоўскую кашулю, каб бацька любіў сваю дачку. Акрамя таго, калі, напрыклад, у сям'і нараджаліся толькі хлопчыкі, ці толькі дзяўчынкі, то загортвалі немаўля ў адзенне процілеглага полу, каб наступнае дзіця было іншага полу.

## Абрадава-магічныя дзеянні з пупавінай і паследам

Перараланне і перавязванне пупавіны ў беларусаў заўсёды ўтрымлівала магічны кампанент. Пупавіну перавязвалі пасмачкай чыстага лёну ці суравой ніткай, зрэдку да лёну дабаўлялі адну чырвоную нітку. Пераразалі пупавіну нажом на адлегласці двух-трох пальцаў ад месца перавязкі «на два пальцы ад жывата», падклаўшы (калі нарадзіўся хлопчык) нож, малаток, сякеру, дубовую кару, кавалачак хлеба, кніжку: *«Бабы казалі, што нада на кніжкі пуп рэзаць. І ён* <сын> *так вучыўся харашо»* (в. Падлессе Быхаўскага р-на); *«Нада ўмеючы тожа пупавіну атрезаць: як мала аставіш – то не зажываець. Перявязвалі нітачкай такой льняной»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на). На Віцебшчыне ж катэгарычна забаранялася павітусе перарэзаць пупавіну хлопчыку на сякеры – інакш «ён стане разбойнікам». Часта ў паўночных раёнах Беларусі пупавіну хлопчыку перабівалі камянямі, «каб быў сільны». Дзяўчынцы пераразалі пупавіну на грэбні, верацяне, нітках, кручках,



*Традыцыйныя прылады для мужчынскай працы. Фотаздымак Т. Кухаронак*



*Традыцыйныя прылады для жаночай працы. Фотаздымак Т. Кухаронак*

на нажніцах – «будзе швачка». Сэнс, закладзены ў гэтых абрадах, указвае на сувязь іх з земляробчым бытам народа, з дыферэнцыяцыяй працы паводле полу: *«Я знаю, кагда пуп отрэзалі, то дзевочкі на потасі, штоб была хазяйка, а хлопца – на кніжцы, штоб учоны быў»* (в. Валішча Пінскага р-на). Маніпуляцыі з пупавінай, паводле традыцыйных уяўленняў, мелі вялікае значэнне і для палавой ідэнтыфікацыі дзіцяці: так, пупавіну хлопчыку бабка пакідала даўжэйшую, каб яго палавы орган быў даўжэйшы.

Але часцей за ўсё, варажыла над пупавінай не павітуха, а іншая, так званая прыёмная, «выбраная», «назначана(-я)» баб(-к)а, якая даводзілася блізкай сваячкай сям'і, станавілася хроснай «хрышчонай», «ксцінная» бабкай / бабушкай для дзіцяці і яго маці, прыносіла яму падарункі на розныя святы: *«Адна бабка хадзіла роды прыняць, ці дзве іх было, не кажная ж можа роды прыняць, а пупок завязаць, пакупаць – эта ўжо другая была, з радні»* (в. Смольніца Смалявіцкага р-на); *«Баба-прырода – гэта што роды прымае, а кума, куму і бабушку выбіраюць»* (в. Замошша Чашніцкага р-на); *«Патом звалі бабку, яна купала, спавівала. Гэта была хрышчоная бабка»* (в. Клінок Чэрвеньскага р-на); *«Вот, бабка я, напрымер, бяру свекрыві сваей сястру за бабку. А другія тожа бяруць сваіх родных. Мама, свякроў, тады як нарадзіла, ужо пайшлі па бабу. У бальніцы ражалі, а ўсё роўна бабу бралі»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на); *«Ды будзець казаць: “Каго вы бабулею думалі браць? Ці гаварілі вы з ім?” А я дажа стыдзілась казаць яму <мужыку> пра ета. Ну, тады кажу: “Ідзі туды й туды. – А калі ня пойдзець? – Тады ў другую хату йдзі”. Ну, праўда ета первая пашла. Сын яе кажэць: “Мама, калі табой ня гребуюць, – кажаць, – сабірайся і йдзі”. Ну, тады прішла, мальчіка етага перебабіла, пупок атрезала, перевязала. Яны ж знаюць, сколька нада там, трі ці чатыры пальца ат жывоціка, пакупала яго, тады прінясла мне пакарміць яго. Я яго пакарміла»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на). Паводле народнага меркавання, стаць хроснай бабкай – вялікі гонар для любой жанчыны сталага веку, акрамя таго, гэта магло станоўча паўплываць на яе замагільнае жыццё. Нездарма ў Магілёўскай вобласці пра жанчын, якія ні разу не выконвалі функцыі хроснай бабкі, казалі: «Ты, мусіць, не хадзіла ў бабкі і будзіш зайцоў пасвіць на тым свеце». Пупавіна звычайна адвальвалася на чацвёрты-пяты дзень. Маці хавала яе ў куфар ці запіхвала ў дзірку, якая была прасвідравана для гэтай мэты ў сцяне хаты, «каб дзіця не скідвалася з лавы»: *«А тады тую пупавінку, як атрезалі, пад столь падторкнулі»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на). Вузельчык з пупавінай захоўвалі на працягу трох-сямі гадоў. Па дасягненні трохгадовага ці сямігадовага ўзросту дзіцяці давалі гэты вузельчык з пупавінай развязаць, «каб развязаць яму розум»: *«Кажуць, ету пупавіну, яна як атваліцца, храніць нада. Яна засыхаіць, канешне, крепка. Каб ён ужо падрос, тады давалі развязаць – тады ўжо будзець дужа разумный дзяцёнак»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на); *«Бабка казала: “Схавай эты пупік, каторы адваліўся, як яно ўжо падрасце, каб яно эту нітачку само развязала – будзя граматная, будзя ўсё панімаць»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Пупок Тоні*

*мне аддалі, ён ляжаў схуваны ў шкапе. Як яна пашла ў школу, я кажу: “На, развязвай”. Развяжэць сама – будзець умненькая»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на); «*Пупавінку раньшы забіралі дамой. І я ўсех сваіх шасцёх дзяцей пупавінку эту прівязвала к жердачке. І када ісполніцца пяць гадоў, давала, штоб дзіцёнак яго расплутаў. Дак каторы расплутуваў, каторы – не расплутуваў, а каторы сядзіць доўга кавыряецца. Эта так паложана, штоб расплутуваў, можа будзе граматны, як развяжа эты вузялок*» (в. Пачапы Краснапольскага р-на). Як адзначаў П. Багатыроў, «вера ў магічную сілу абрада заснавана, у прыватнасці, на літаральным разуменні метафары – развязаць пупавіну ці мяшочак, у якім яна ляжыць, – значыць, «развязаць» работу, гэта значыць справіцца з ёй». На Віцебшчыне аж да пачатку XX ст. бытаваў звычай захоўваць пупавіну доўгі час, а калі хлопец ішоў у войска, а дзяўчына – замуж, ім аддавалі яе, «каб шчаслівыя былі».

Калі навародак не падаваў прыкмет жыцця, бабка імкнулася ажывіць яго, злёгку тармасіла, шлёпала па попцы, калі гэта была дзяўчынка – ёй у вуха гучна выкрыквалі імя маці, што, паводле народных уяўленняў, здольна было ажывіць немаўля.

Управіўшыся з дзіцём, павітуха працягвала завіхацца каля парадзіхі. Звычаі і абрадавыя дзеянні, звязаныя з паследам («дзіцячым мест(-ц)ам», «дзіцячай пасцеллю»), былі заснаваны на перакананні, што дзеянні, якія здзяйсняліся з ім, могуць аказаць станоўчы або адмоўны ўплыў на дзіця, яго лёс, здароўе, характар. У беларусаў паслед, які акраплялі святой вадой, чыталі над ім малітвы і замовы, загортвалі ў кавалак тканіны разам з хлебам і соллю, зрэдку клалі цвік, аловак (паслед хлопчыка), іголку, нітку (паслед дзяўчынкі) і пасля закопвалі пад вугал хаты, пад печчу, пад сталом («на куце»), у каморы, пад жорны, у хляве, варыўні, у садзе пад фруктовае дрэва, клалі за абразы: «*А места, бывала, закапваюць пад печ, было падпечча бальшое, тама курей дзяржалі. Так яна* <бабка> *выкапала ямачку і тама закапала*» (в. Ляды Дубровенскага р-на); «*Мама мая раджала дома ўсіх нас. Дзецкая места, падымалі пол, доску падымалі, пад палом выкапывалі ямку, бабка эта закручывала яго ў чыстую палатняну тряпачку і пад мост яго і закапае. Пад палом. І хлопчыкаў, і дзевачак* <дзецкае места> *– усіх пад пол закапвала ў зямлю. Эта я сама відзела*» (в. Пачапы Краснапольскага р-на). Галоўная ўмова – закапаць паслед там, дзе звычайна не хадзілі і не тапталіся людзі: «*Места зарывалі ў бані пад полкам, дзе людзі не ходзяць*» (г. п. Хоцімск); «*Места тама, айдзе не ходзяць, ні скот, нічога: ці пад забор куда, ці пад страенія*» (в. Канічы Касцюковіцкага р-на);

*«Места ета як выходзіць, с тымі тряпкамі яна яго ўсё скруціла ў вузялок, звізала і дзе-та закапвала, мо пад печчу»* (в. Сава Горацкага р-на). Паводле традыцыйных уяўленняў беларусаў, жыццё дзіцяці складзецца шчасліва, калі пупавіна і плацэнта знаходзяцца ў добрым стане. Калі ж ім нанеслі пашкоджанні ці згубілі іх – пакутавала і дзіця.

## Варажба пра долю

Беларусы лічылі, што ў тую хвіліну, як нараджаўся чалавек, ён атрымліваў сваю долю, а на небе з'яўлялася новая зорка: *«Дзіцёнак радзіўся і Бог яму долю ўжо вызначыў. На небе загараецца звязда і гарыць, пака чалавек жыве. Эта не маці, а мая бабуня гаварыла, яна тожа пражыла доўгі век, эта па мамінай лініі. Яна гаварыла, як родзіцца чалавек, значыцца, на небе загараецца звёздачка. І яму дадзены анёл-храніцель, каторы дзержыць кнігу, дзе напісана твая судзьба, і ты яе змяніць ніяк не можаш. Анёл стаіць за правым плячом»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Доля, канешна, есць. Каждый чалавек раждаецца, Бог стаіць пад акном і даець долю каждаму чалавеку. Да, даець: катораму – утапіцца, катораму – задавіцца, катораму – што. Што Бог даў – тое і будзе»* (в. Маскаляняты Гарадоцкага р-на); *«Яна ёсць спрадвеку вякоў – доля. Дзе ты ня будзеш – не абойдзеш сваю долю, канём не аб'едзеш"* (в. Касцюшкавічы Крычаўскага р-на).

На Беларусі існавалі разнастайныя спосабы варажбы пра долю, будучы лёс дзіцяці ў дзень яго нараджэння. Бачным знакам шчаслівага лёсу з'яўлялася так званая дзіцячая сарочка, гэта значыць перапонка на галаве, з якой нараджалася немаўля. Лічылася, што шчасце і дабрабыт не пакінуць такога чалавека ўсё яго жыццё, адсюль выраз: «нарадзіўся ў сарочцы / рубашцы»: *«Чула, што шчаслівы, што ў рубашке радзіўся, а якая яна, тая рубашка, Бог яе ведаець. А іх нешта й мала шчаслівых людзей»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-н). Гэтыя ўдача і шанцаванне распаўсюджваліся і на яго сям'ю. Такую «сарочку» пры купанні баба-павітуха здымала з дзіцяці, і яе захоўвалі ў сям'і як талісман. Шчаслівым у беларусаў лічылася дзіця, у дзень нараджэння якога ў доме з'яўляўся які-небудзь прыбытак, а таксама калі нованароджаны хлопчык быў падобны на маці, а дзяўчынка – на бацьку. Паводле народных вераванняў, нядоўга пражыве дзіця, калі ў дзень яго нараджэння ў вёсцы было пахаванне нябожчыка, ці якое з малых год расло вельмі дасціпным.

Верылі ў існаванне «шчаслівага» і «нешчаслівага» часу для нараджэння чалавека. Лічылася, калі чалавек нарадзіўся ў шчаслівую хвіліну –

то будзе яму шанцаваць, калі ў нешчаслівую – будзе нешчаслівы (*«што тут зробіш – ён на такой часіне радзіўся»*) (К. Машынскі). У панядзелак, паводле народных уяўленняў, з'яўляліся на свет няўмекі, у якіх усё з рук валілася («ім ступень па пень»): *«Ёсць шчаслівыя дні і нешчаслівыя, калі раджаецца дзіця – панядзелак нешчаслівы»* (в. Кучарына Шклоўскага р-на). Такіх людзей чакала беднае гаротнае жыццё. Беларусы былі перакананы, што чалавек, які нарадзіўся ў аўторак, пражыве доўгае і шчаслівае жыццё, будзе мець шанцаванне ў вытворчых справах. Тых, чый дзень нараджэння прыпадаў на сераду, чакаў неакрэслены лёс («ні тое, ні сёе»). Такі чалавек мог і разбагацець, але потым растраціць сваё багацце і памерці ў беднасці. Лічылася, што дзіця, якое з'явілася ў чацвер, будзе вельмі працавітым, яно рана пачынала хадзіць, гаварыць, праяўляла кемлівасць і спрыт ва ўсіх справах. У некаторых лакальных традыцыях чацвер лічыўся самым шчаслівым днем для нараджэння хлопчыка. Пятніца прыносіла бацькам лайдакоў, злодзеяў і горкіх п'яніц, і, наогул, лічылася нешчаслівым днём для нараджэння. Тыя дзеці, што нарадзіліся ў суботу, былі шчаслівымі і паспяховымі: *"Самыя шчаслівыя людзі тыя, што нарадзіліся ў суботу, так гаварылі. А ў чацвер – будзе работнік, працавіты. Няшчасны – хто ў панядзелак радзіўся. Канешне, вераць, і цяпер гавораць"* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на). У нядзелю ж з'яўляліся на свет самыя шчаслівыя людзі, якіх ва ўсіх справах чакалі шанцаванне і поспех.

Пара года таксама магла паўплываць на характар і лёс дзіцяці. Тым, хто нарадзіўся вясною і летам, прадказвалі бестурботнае жыццё, восенню – суровы, маўклівы характар, узімку – халодныя, нядобразычлівыя адносіны да людзей. Праўда, лічылася, калі дзіця народзіцца па восені, калі ўсяго многа на гумне і ў агародзе – то, як вырасце, будзе багата жыць (А. Сержпутоўскі). У сакавіку нараджаліся людзі, што пражывуць нядоўгае жыццё.

У павер'ях беларусаў вылучаецца і свята – як адзінка вымярэння часу. Так, лічылі, той, хто нарадзіўся на Каляды, Вялікдзень, Сёмуху, Багача – будзе вельмі шчаслівы. Калі дзень нараджэння дзіцяці прыпадаў на Узвіжанне, лічылі, што яму прыйдзецца ўсё жыццё пакутаваць, на Івана Галавасека – вырасце разбойнікам, на Дзяды – хутка памрэ, на Спаса – стане манахам (М. Нікіфароўскі). Час у прамежку сутак таксама, паводле ўяўленняў беларусаў, мог вызначаць лёс дзіцяці: раніца найбольш спрыяльная для нараджэння, хто народзіцца пасля поўдня – будзе нядоўга жыць. Але найбольш уплывалі на лёс дзіцяці, паводле традыцыйных уяўленняў, квадры месяца: хто нарадзіўся на маладзіку –

будзе доўгажыхар, усё жыццё захоўваць маладжавасць, рухавасць, на поўню – будзе чалавекам сталым, разумным, мець вялікую сям'ю, шмат дзяцей, у трэцюю квадру – будзе слабым, хваравітым, не будзе мець даўгі век, у апошнюю – хутка старэе, будзе хударлявы.

## Першыя для немаўляці купанне, кармленне, укладванне ў калыску, адыманне ад грудзей

Вельмі важным было першае купанне немаўляці, бо, паводле вераванняў, яно магло значна паўплываць на яго далейшы лёс. З гэтай прычыны пры падрыхтоўцы купання прытрымліваліся спрадвечных звычаяў і абрадаў. Так, ваду для купання грэлі, але ніколі не кіпяцілі, бо верылі, што дзеці ад гэтага будуць вельмі злымі, крыклівымі, няўважлівымі. Пра такіх людзей у народзе гаварылі, што «ён у гарачай вадзе купаны»: *«Завуць бабку купаць дзіця. Свянцонай вады, бывая, ульюць у начоўкі, кладзе бабка і купая. У кіпячонай вадзе не паложана купаць дзіця, проста грэюць яе, а ў ночвы парожнія леюць халоднай вады, патом ужо цёплай і разводзяць як, каб дзіцятку была да нармальнай цемпературы.* <– А чаму ў гатаванай вадзе нельга купаць?> *Ну, казалі, будзя злое такое, успыльчывая. "Што цябе ў кіпячонай вадзе купалі" – кажуць так»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на).

Першы раз дзіця купалі ў драўляных начоўках, якія тры разы перахрышчвалі, і на край сыпалі крыху попелу: *«Сыпалі попел на начоўкі на рагі, каб ён не плакаў, дзіцёнак гэты. Кучкамі так, у чатыры месты па шчопаці – начоўкі ж вялікія. Попел ляжаў і ўсё. Пакупаюць, закру-*



*Ночвы для купання дзіцяці. Фотаздымак Т. Кухаронак*


АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
КАРТАТЭКА РЫСУНКАЎ СЕКТАРА ЭТНАГРАФІІ

Інвентарны № 3489

Катэгорыя Б-IX

РЫСУНАК № 117

1. Аб'ект начоўкі драўляныя, даўжыня 112 см, шырыня 42 см,
2. Дзе зафіксіравана в. Бакшты, Бакштанскі сельскі савет, Іўеўскі раён, Гродненская вобласць.
3. Дата 1964 г. 4. Замалёўка Гунько С. Ц.
5. Экспедыцыя Этнаграфічная.

Зак. 309.

*Ночвы драўляныя. Іўеўскі р-н. Малюнак С. Гунько. 1964 г.*

цюць. *Тады гэты попел вынасілі туды, дзе ня ходзюць людзі»* (в. Ганчанскае Клічаўскага р-на); *«Былі такія начовачкі дзеревянные, спецыяльныя для дзяцей, только дзецей купаць. Выдалблівалі эці начовачкі»* (в. Хацíслаў Маларыцкага р-на).

Агульнабеларускі характар меў звычай класці ў ваду для першага купання абавязкова хлеб, зерне, манету, пярсцёнак, бурштын, ліць пасвяцоную ваду, каб забяспечыць багатае жыццё дзіцяці: *«Як первы раз купалі, улівалі пасьвяцоную ваду, капейку кідалі, каб багаты быў»* (в. Падлессе Быхаўскага р-на); *«Я яго купаю, кіну ў вадзічку ў начовачкі мелачы, грошы, каб быў шчаслівы, каб крэпенькі быў, каб грошы вяліся»* (в. Сакалішча Расонскага р-на); *«Як купалі первы раз дзяцёнка, клалі хлеб прама ў ваду. Капейкі можа хто кідаў»* (в. Заходы Шклоўскага р-на); *«Як я родыла пэрвого сына, свэкроў укінула ў ночовачкі пшана, каб быў поўны, бы пшано. Потом дубовага ліста положыла, каб быў

*дужы, бы дуб. Копейкі сыпала, каб грошовы быў. Пэрвы раз свэкроў купала, я ў больніцы рожала, мы прывэзлі його і вона купала. Это на Століншчыне мы жылі»* (в. Пінкавічы Пінскага р-на); *«Рабёначку клалі рубля зялезнага пад галоўку, пад тую пялёначку, як купаеш, каб багаты быў»* (в. Азяркі Верхнядзвінскага р-на); *«Первы раз купаюць, у начоўкі ложуць аппісаную пялёначку і пад галоўкі тожа аппісаную, каб крапчэйшы быў. Хрэсцюць яго і молюцца над ім»* (в. Бялькоўшчына Верхнядзвінскага р-на); *«Як маіх дзяцей баба купала, то хлеба абезацельна с поўнай буханкі ўгалочак хлеба атрезае і кідае ў ваду. І манеты туда кідае. Дзіця купае і хлебам галоўку мыя дзяцёнку, штоб багаты быў, хлебны, трудалюбівы. А ўжо як маіх унукаў баба купала, майго сына дзяцей, то ўжо другія абрады. Значыць, пад ванначку ложа кніжкі, штоб граматны быў і кідае капейкі ў ванначку, штоб багаты быў»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на); *«Прымерна, як купаюць первы раз, завуць куму ці бабулю, каб яна пакупала. Яна купае, ложа капейкі ў эту вадзічку, гвоздзь, каб дзіця было здаровае, як гвоздзь»* (в. Будагова Смалявіцкага р-на); *«Рабёначку клалі рубля зялезнага пад галоўку, пад тую пялёначку, як купаеш, каб багаты быў. І знову так, пакуль падрасцець»* (в. Азяркі Верхнядзвінскага р-на); *«Як первы раз купалі, у начоўкі клалі серабро, каб чысценькі быў»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на).

У ваду дабаўлялі розныя лекавыя духмяныя травы: *«Клалі ў вадзічку трава такая, як цяпер завецца казелец, што чапляецца, ваўчкі, была чэреда»* (в. Ганчанскае Клічаўскага р-на); *«Мая маці ў тоі маіх хлопцаў купала. У нас расце тоя ў жыце, сінія цвяточкі. Усякага зелля пасвяціць, і баго(-у)н лажылі»* (в. Церабаў Петрыкаўскага р-на); *«Трава прыбытнічак называлася, паложаць ета зелейка ў ваду і купаюць»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на). Бралі для першага купання і травы, якія мелі дадатковую сакральную моц: *«Нясуць сьвячу на Прачыстую і сьцелюць палатно, на палатно кідаюць кветкі. Паднімаюць этыя цьвяты і сушуць, а тады ў воду кладуць, як первы разок дзіця купаюць»* (в. Залатуха Калінкавіцкага р-на).

Каб абараніць немаўля ад нячыстай сілы, у ваду лілі пасвяцоную ваду, клалі соль, металічны прадмет, капалі воск з запаленай свечкі і тры разы перахрышчвалі яе: *«Як радзіўся наш сын, то наша баба Броня, ёй ужо было тады пад восемдзесят, прыходзіла яго купаць цэлы месяц. Яна адзявала белы фартушок, белую хустачку, адзявала чыстую блузачку, такі кафтанік, поўнасцю пераадзявалася. І купала яго, жагнала абязацельна, кладучы ў ваду, і даставала таксама жагнала. Мне ўжо самой хацелася, а яна: "Не, Леначка, ты пакуль вучыся". Так цікава было»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Воду лілі свячоную, траўкі свячоныя*

*под галаву клалі»* (в. Хацíслаў Маларыцкага р-на); *«Вадзічку перахрысцяць, свянцонай вадзічкі ўльюць туда, і тады купаюць эта дзіцятка»* (в. Будагова Смалявіцкага р-на). Паводле традыцыйных вераванняў, надзяляліся гаючай сілай і вясельныя ўпрыгожанні з дугі: *«З етай дугі жэншчыны, у каторых дзеці, рвалі цвяточкі і купалі дзяцей маленькіх, гэта палезна было. Стараліся, штоб абізацельна сарваць еты цвяточкі»* (Т. Валодзіна).

Былі пэўныя абмежаванні і ў выбары дня для купання немаўляці: *«Мы не купалі ў нядзелю і ў той дзень, як нарадзіўся. У нядзелю таму не купаюць, што святая нядзеля і шчытаецца, што тады дзіця будзе дужа да вады цягу мець»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Мне жэншчыны падсказвалі: "Ня мый, – гаворіць, – у пятніцу і скрэсенне, нельзя мыць. Ета святыя дні, абычай такі»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на). Вопытная павітуха ведала, што *«як родзіцца дзевачка і первы раз яе пакупаеш, то лілі ваду ету на трэцці вянец у хаце – тады месячныя ў яе бываюць тры дзянёчкі»* (в. Вудага Чэрыкаўскага р-на). Пакупаўшы дзіця, перад тым, як дастаць з вады, бабка тры разы абмывала твар немаўляці вадой, змешанай з аўсом, каб яго *«суроцы не бралі»* (Магілёўшчына). Падчас першага купання варажылі пра будучы лёс дзіцяці: калі мачылася ў ваду, гэта было гарантам, што ўсе прысутныя пап'юць піва на ягоным вяселлі.

Паводле народных вераванняў беларусаў, пры першым купанні павітуха магла выпраўляць фізічныя недахопы: раўняць ножкі дзіцяці, гладзіць яго па галоўцы, каб яна была круглая, злёгку сціскаць носік, каб ён быў прыгожы і г. д. Пакупаўшы, дзіця спавівалі ў мякенькія пялюшкі, зробленыя са старога адзення, бо паўсюль на Беларусі было не прынята загадзя рыхтаваць адзенне для дзіцяці – інакш, лічылася, яно хутка памрэ: *«Пакуда родзіцца дзіцёнак, не нада нічога гатовіць яму с адзежы, і нельзя купляць. Найдзеш, ёсць якая просцінка. І вы, маладыя, заранее не купляйце нічога. Як родзіцца дзіцёнак, тады й купіце, усё тады купіце. Даў Бог раток – дасць і кусок»* (в. Ляды Дубровенскага р-на). У беларусаў часам жартам, часам усур'ёз вопытная павітуха загортвала хлопчыка ў жаночую сарочку, каб яго, як падрасце, кахалі дзяўчаты, а дзяўчынку з той жа мэтай – у мужчынскую; спавівала поясам, завязвала яму хусцінку ці шапачку: *«Як радзіць, бабка прыходзіла, баба Хадора. Яна пакупала січас жа, спілінала ў чысценькую тряпачку, шапачку і ў калыску паложыць»* (в. Сава Горацкага р-на).

Выкупанае і спавітае чырвоным поясам дзіця павітуха падносіла бацьку і маці, якія яго цалавалі: *«Як дзіця родзіцца, пазавуць бабку. Яна купая, тады спаўе яго, дзіцятка тое, і паднясе пад рожаніцу, каб*

*маці яго пацалавала. І бацько паднясе, каторы возьме да ў адно вакно, у другое, у трэцяе, як дзевачка, штоб хлопцы так у вокны пазіралі, да дзевачку забралі. Дзіця спавівалі і ў калыбельку клалі»* (в. Паварчыцы, Салігорскага р-на); *«Пакупала, выцярла і аддала маме, штоб расла бальшая. Такое я помню»* (в. Будагова Смалявіцкага р-на). Шырокае распаўсюджанне на Беларусі мела вераванне, што калі дзіця пасля першага купання пакласці на правы бок, то яно ў далейшым усё будзе рабіць правай рукой «будзе праўшаком», а калі на левы – то, наадварот, «будзе леўшаком».

Ваду, у якой першы раз мылі дзіця, вылівалі ў такім месцы, дзе не хадзілі людзі і жывёла: *«Вылівалі на дваре пад вугол, дзе іконы вісяць»* (г. п. Хоцімск); *«А вадзічку вылівалі раньшы пад сараі, адзе людзі ня ходзюць, туда вылівалі* (в. Прусіна Касцюковіцкага р-на); *«Я знаю, што кагда рабёнак радзіцца і першы раз купаеш, то абізацельна нада пад печ зліць, каб ужо ніхто-ніхто не стаптаў шчасце, якое ён прынёс на гэтат свет. Ён тады ўсё сваё возьмецьַ»* (в. Германавічы Шаркаўшчынскага р-на); *«Ваду нада выліваць пад угалок ілі пад пуню, ілі пад хату»* (в. Сава Горацкага р-на); *«Як бабка першы раз купая, дак тую ваду вылівая на вугал хаты, на другое ці на трэцяя бярвяно»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Як дзіця пакупаюць, выліваюць ваду там, штоб людзі не хадзілі. І первы раз і кажды раз, як купалі, ваду па сцежцы ня вылівалі»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на).

Ваду пасля першага купання маглі выліць пад пладовае дрэва, каб дзіця добра расло: *«Тую вадзічку пад дзерава абычна лілі, пад яблыньку»* (в. Баркалабава Быхаўскага р-на); *«А тую вадзічку толькі пад куст ці пад дзерава выліваць, нельзя пад ногі»* (в. Печары Касцюковіцкага р-на); *«Як пакупаюць мальчыка, воду на яблыню льюць, а як дзівочку – то на грушу льюць»* (в. Оса Кобрынскага р-на); *«Дзевачку, як купаюць, вадзічку лілі пад яблыню, а мальчыку – на вугал дома»* (в. Ляды Дубровенскага р-на). Лічылася, калі хто пераступіць тое месца, дзе вылілі ваду пасля першага купання, то дзіця можа захварэць. На Палессі ваду пасля купання дзяўчынкі вылівалі на ганак, каб яна, стаўшы дарослай, хутчэй выйшла замуж.

Першае кармленне таксама патрабавала вялікай увагі і ведання мясцовых прыкмет, павер'яў, звычаяў. Найперш, усе маладыя мамы пільна сачылі, каб першы раз даць дзіцяці правую цыцку ды яшчэ і правай сваёй рукой – тады яно ўсё будзе рабіць правай рукой, што ў традыцыйным грамадстве пры тагачасным ладзе жыцця лічылася абсалютнай нормай: *«Цыцку давалі сразу, нада правую даваць, каб ня быў ляўшой»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на); *«Грудзі давалі правую,*

*каб ляўша не быў»* (в. Заходы Шклоўскага р-на); *«Грудзь нада правую даваць сначала, эта мне свякроў гаварыла»* (в. Гарадзец Шклоўскага р-на); *«Нас прэдупрэждалі, штоб правую грудзь даваць, штоб правай рукой рабіць. І дажа ў бальніцы акушэркі гаварылі»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Першы раз карміць дзіця давалі правую цыцку правай рукой, тады будзя праваю рукою ўсё рабіць, а хто ня панімая, да дасць леваю – будзя ляўшун. Яно ўжо кідаецца і пісаць леваю рукою, і есці леваю рукою»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Первы раз грудзь давалі правай рукой, еслі левай – то будзет левша. І такія прызнакі есць. У меня тут саседка, так ана гаварыла па-суседцкі, што ей, мол, мама левай рукой грудзь дала і ана все левой рукой дзелает: і шьёт, і копает, все время левая рука ей замешчала за правую»* (в. Хацíслаў Маларыцкага р-на); *«Мама мне гаваріла: "Дзетачка, дай правую цыцку сразу". Я й дала»* (в. Ляды Дубровенскага р-на). Як правіла, маці пачынала карміць дзіця грудзьмі ў дзень родаў, ці крыху пазней, «калі падыдзе малако». А да таго часу паілі немаўля салодкай вадой або адварам рамашкі, маглі даваць соску з жованкай з хлеба і цукра.

Паўсюдна на Беларусі жанчыны выконвалі разнастайныя забароны і правілы паводзін, каб у іх было малако для кармлення дзіцяці. Большасць з іх з'яўляліся рацыянальнымі ў сваёй аснове і былі накіраваны на тое, каб засцерагчы жанчыну ад прастуды, ад сполаху і іншых траўмаў і непрыемнасцяў. Акрамя таго, жанчынам, якія кармілі грудзьмі, забаранялася адліваць ваду назад у калодзеж – інакш малако прападзе; даваць піць ваду з вядра другой жанчыне, якая корміць свае дзіця, – малако пяройдзе да яе і г. д. Для магічнага стымулявання большай колькасці груднога малака, жанчына на парозе хаты ела «абыдзённы» пірог, спечаны з сумесі злакавых; сырое цеста з таго месца ў дзяжы, дзе быў выціснуты знак крыжа. Жанчына ў час кармлення дзіцяці павінна была сачыць за сваімі паводзінамі: *«Калі маці будзе нечым узрушаная, то яна не павінна даваць дзіцяці грудзі, перш чым зусім не супакоіцца, у крайнім выпадку можа пакарміць дзіця і адразу, але няйнакш як сеўшы на ключ, бо ў іншым разе ў дзіцяці пачнуцца канвульсіі»* (Ф. Вярэнька).

Кармленне грудзьмі, як лічылася ў народнай традыцыі, устанаўлівала паміж дзіцем і маці асаблівую як фізіялагічную (напрыклад, беларускае павер'е «Як мацеры малако ў грудзях кальне, а дзіцяці пад той час няма, то тады дзіця цыцкі захацела і плача»), так і эмацыянальную сувязь, у час якой ажыццяўляецца не толькі кармленне дзіцяці, але і, згодна з уяўленнямі, успрыманне ім каштоўнасцяў нематэрыяльнага плану. Сам працэс ссання мацярынскіх грудзей набывае сімвалічнае

значэнне карыстання дабротамі, прывілеямі (напрыклад, «Лісліваe шчанё / цялё дзве цыцкі ссе»). Паўсюдна малако маці лічылася для дзіцяці лепшым лекава-прафілактычным сродкам ад захворванняў скуры, хваробаў вачэй, насмарку: *«Казалі, што глазкі як загнаяцца ў дзіцяці – малачком мамы прамыў і ўсё»* (в. Паршына Горацкага р-на).

Выкананне рэжыму кармлення грудзьмі не лічылася абавязковым. Кармілі дзіця шмат разоў у суткі – усялякія неспакойныя паводзіны з боку дзіцяці, плач, ссанне сваіх ручак супакойвалі тым, што яму адразу ж давалі грудзі: *«Я малаком карміла ўсіх траіх сваіх дзяцей. Есць жа было нечага, ета ж цяперя і ядуць, і п'юць, і берягуць радзіху, Госпадзі мілы! А ў іх малака німа. А ў мяне есць не было чаго, хлеба не было куска -- а малако было! Што тады калхозы, дадуць якога смецця, да на жорны змелеш, да які-небудзь талалуй спячэш, што яго цяперя дажа б курі не елі. А мы елі і дзяцей малаком кармілі»* (в. Ляды Дубровенскага р-на).

Традыцыя раіла карміць дзіця малаком маці да аднаго-двух гадоў, хоць, канешне ж, сустракаліся адхіленні як у той, так і ў другі бок: *«Мы ж кармілі* <дзяцей грудным малаком> *па паўтара года»* (г. п. Хоцімск); *«Кармілі ў каго як у грудзях было: хто да года, а хто бывае і болей»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Перва доч радзілася, так я яе год карміла, бо нада ж была работаць, дзекрета не было, не седзелі так, як зараз сідзят. Патом маць яе гледзела»* (в. Хацісла Маларыцкага р-на); *«Дочку карміла доўга, ёй ужо гады два было як аднялася, нармальна аднялася»* (в. Гарадзец Шклоўскага р-на); *«А ўсяк кармілі: хто два гады, хто – трі, а хто й чятырі корміць. У нас адна сем гадоў карміла, кор-*



*Кармленне грудзьмі*

*мяць як у каго малака ёсць. Было, гаварілі, пака корміш, то не забяременееш. Як доўга корміш – дужа разумныя дзеці»* (в. Паршына Горацкага р-на). Праўда, існавала і процілеглае меркаванне аб залежнасці тэрміну кармлення і развіцці разумовых здольнасцей дзіцяці: *«Нельга доўга карміць дзіця грудзьмі – зробіцца дурное»* (Е. Раманаў).

У прамежку паміж кармленнем давалі своеасаблівы прыкорм: хлеб з цукрам, загорнуты ў льняное палатно, паводле народнай тэрміналогіі – «суслу», «сусолку», «куклу»: *«Прысмакаў у нас не было, суслу дзелалі, пячэння якога купіш і ў трапачку ілі ў бінцік і ссець. Мы жылі на хутары возле Дняпра»* (в. Гарадзец Шклоўскага р-на); *«Давалі хлеб с сахарам, у марлю ўкручвалі – сусолка звалася»* (в. Паршына Горацкага р-на); *«Давалі куклу: хлеб пожуе, пожуе маці да сахару, дробовы быў сахар, сахару дробок, і вжэ куклу тую дзіця ссе-ссе. Але ж трэбо нітку, каб не ўцягло ў рот, с полотна робілі куклу, ніточкою паравражам, каб таўсцей было»* (в. Хатынічы Ганцавіцкага р-на); *«Дзелалі яшчэ куклу: нажуе якога пячэньня ці хлеба, у льняную трапачку закручвае эту куклу – і дзяцёнку ў рот. Дак яно смокча эту куклу, пака мама працуе. Бывала, мама расказвала, што ў куклу эту дабаўлялі жованы мак, каб спала дзіця»* (в. Глыбоцкае Гомельскага р-на).

Калі ў жанчыны не было груднога малака, дзіця кармілі каровіным малаком, разбаўленым вадой. Такіх дзяцей называлі «скусцьвеннікамі»: *«Як малака не хватаець, малако* <каровіна> *кіпяцім, бутылачку, соску і даеш»* (в. Паршына Горацкага р-на).

Важным рытуалам, які сімвалічна афармляў канчатковае развітанне маці і дзіцяці, было адлучэнне ад грудзей. З утылітарных задач адлучэнне ад грудзей мела на мэце аблягчэнне пераходу ад вадкай (дзіцячай) ежы да дарослай, ад малака да кашы і асабліва да хлеба. Разам з тым пераход дзіцяці да дарослай ежы – яшчэ адзін крок у працэсе яго сацыялізацыі і паступовага выхаду са сферы прыроднага і ўключэння ў сферу культуры. Паводле традыцыйных уяўленняў, адлучаць ад грудзей раілася ў панядзелак, аўторак ці сераду, але ні ў якім разе не ў пятніцу: *«Старанна сочаць, каб дзень адлучэння ад грудзей не прыпадаў на пятніцу, таму што дзіця плача, не спіць і наогул блага пераносіць адлучэнне"* (Ф. Вярэнька);*"Калі ў пятніцу адняць дзіця ад цыцкі -- доўга плача, нудзіцца. Казалі ў аўторак харашо -- патом не будзе прасіць суслу»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на). Бытавала і такое перакананне: *"Каб дзіця не нудзіла доўга па цыццы, то найлепш адлучаць у той дзень, у каторым яно нарадзілася»* (М. Федароўскі). Паводле традыцыйных вераванняў, меў значэнне не толькі дзень, але нават і час сутак: *«Калі дзіця адлучыць вельмі рана, задоўга перад ядою, будзе*

*яно худое, а калі падчас абеду ці снядання, падвячорку ці вячэры – будзе тоўстае»* (Ф. Вярэнька).

З пораў года найлепшай лічылася вясна, калі з'яўлялася першая зяляніна: *«Атымаць ад грудзей нада, як пачынаець лес адзявацца, вясной»* (в. Паршына Горацкага р-на); *«Атымалі вясной, калі лясок адзенецца, каб толькі не на голы лес»* (в. Стары Дзедзін Клімавіцкага р-на); *«Атнімала ад грудзей, як лес адзенецца»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«Ну, як адвучалі? – Выбіралы якысь місяцы, на вісні, як сады цвітуць, подбіралы такія місяцы»* (в. Оса Кобрынскага р-на); *«Адлучаць ад грудзі найлепей увесну, калі вада пусціць і лясок адзенецца»* (Ф. Вярэнька). Царкоўна-хрысціянскі каляндар таксама аказваў істотны ўплыў на тэрміны адлучэння дзіцяці ад грудзей, бо ніколі не рабілі гэтага ў пост, а таксама назіралі, каб у той дзень не было памяці якога-небудзь мучаніка, інакш дзіця будзе пакутаваць (Е. Раманаў).

Лічылася, што пара года, прыродныя пераўтварэнні маглі ўплываць на будучае жыццё дзіцяці: *«Гавораць, што атучываць дзяцей няможна на голы лес, такая прыкмета, таму што будзе ўсю жызню беднае эта дзіця»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Восенню і вясной не нада атымаць* <ад грудзей>*. Як лісця падаець, як гола – нельзя, дзіцёнак голый, бедный будзіць»* (в. Трасцянка Талочынскага р-на); *«Адлучаць увосень нядобра, бо дзіця потым доўгі час будзе маркоціцца; калі ж у гэтую пару адлучаць трэба абавязкова, то рабіць гэта трэба, прынамсі, не раней, чым жыта ўзыдзе»* (Ф. Вярэнька).

Час адлучэння вызначаўся як сонечным, так і месяцовым цыкламі. Як вядома, поўны цыкл росту і ўтварэння месяца (каля 28 сутак) дзеляць на 4 фазы, ці квадры: маладзік, поўня, сход, ветах. Часцей за ўсё дзяцей адлучалі ад грудзей перад поўняю / на поўню: *«Луччы ўсяго атнімаць на поўню – тады дзеткі поўненькія, харошыя»* (в. Мышавое Касцюковіцкага р-на); *«На месяц глядзелі, атымалі ў поўная – тады дзеці здаровенькія»* (в. Хутар Быхаўскага р-на); *«Нада атнімаць поўнатай, каб вышла поўная жызь»* (в. Бялькоўшчына Верхнядзвінскага р-на). Улічваліся асаблівасці і іншых квадраў месяца: *«Хлопчыка і дзяўчынку лепш адлучаць веташком,* гэта значыць *у канцы апошняй квадры, бо ў такім разе дзіця хоць не вельмі добра расце, але бывае спакойнае. Калі дзіця адлучыць на маладзік, то яно расце добра, "як пухляк", але затое будзе "наравістае", "пражэрлівае". Некаторыя маткі лічаць, што найлепшая пара адлучаць хлопчыка – маладзік, а дзяўчынку – канец апошняй квадры. Часам таксама адлучаюць "у прыбытныя дні",* гэта значыць *перад поўняю – каб дзіця здаровае расло»* (Ф. Вярэнька). Уяўленні аб уплыве кармлення дзяўчынкі на яе будучы менструальны

цыкл назіраюцца ў рэгламентацыі адлучэння яе ад грудзей: *«Калі дзіця адлучыць на маладзік, дзяўчынка будзе мець доўгія месячныя і вялікія грудзі, якія звычайна маюць мала малака»* (А. Сержпутоўскі).

Акрамя інтарэсаў дзіцяці, улічваліся і інтарэсы маці, уплыў часу адлучэння дзіцяці ад грудзей на яе здароўе, знешні выгляд, жаноцкую прыгажосць: *«Як атымалі? – На маладзік не атымалі, сходамі атымалі, каб грудзі не балелі»* (в. Лаўрэнаўка Талочынскага р-на); *«Свякрова мне казала, атнімай дзяцёнка пад поўна, штоб былі грудзі поўныя, маладзіком ілі схадком – грудзі абвіслыя будуць, як панчоха»* (в. Заходы Шклоўскага р-на).

Абрадава-магічныя дзеі, звычаі, стэрэатыпы паводзінаў, звязаныя з гэтай падзеяй, сімвалізавалі пераход дзіцяці ў новы ўзроставы перыяд, да новай ежы: *«Я, як атымала ад грудзей, эта мяне свякрова вучыла, садзісь на парог, атрэж хлеба скібачку маленькую, пасып соллю, сядзь на парог, пакармі дзяцёнка груддзю і дай яму хлеб-соль і скажы: "Ідзі на свой хлеб-соль". І ўсё. Я так дзелала»* (в. Заходы Шклоўскага р-на).

Паўсюль на Беларусі ў ролі рытуальнай першай дарослай стравы часцей выступала яйка: *«Пасля малітвы з дзіцем маці садзіцца на парог, перад вачыма ў дзіцяці мажа саскі сажай, плюе на іх і гаворыць: "А вось кака", потым, падаючы цераз рукаў сваёй кашулі печанае яйка, дапаўняе: "А ета – цаца!". Дзіця хутчэй "пературжыцца па сісьцы"»* (М. Нікіфароўскі); *«Каб дзіцятка па цыццы не нудзіла, то вечарам, апошні раз накарміўшы, трэба яго пасадзіць у адным канцы пасцелі, а самой сесці ў другом і пакаціць да дзіцятка тры вараныя яйкі і, палажыўшы дзіця ў калубелі, трэ тыя яйкі пры ем пакласці на цэлу ноч»* (М. Федароўскі); *«Ну ек дітыну от груді отучівае, еечко зварым, через окошко подают, коб не нудзіў. Маленькій у хаті, она на двір, кроз окошко подае»* (в. Дубіца Брэсцкага р-на); *«Варіш яечка, садзішся на парог, пакорміш і яечка даеш: "Ну, дачушачка, на табе хлеб-соль – і солькай пасыпеш, і хлеба крошачку – не надзейся болей на маміна»* (г. п. Хоцімск).

Ад пакалення да пакалення жанчынам перадаваліся веды аб тым, што ні ў якім разе нельга зноў вяртаць дзіця да грудзей, бо яно будзе мець «урочлівыя вочы», ці само пастаянна падпадаць пад уздзеянне сурокаў: *«Калі дзіця аднімалі ад грудзей два разы, яно будзе прыносіць сваім вокам "дужа ўрэду" не толькі маладому статку і птаству, але нават і чалавеку»* (М. Нікіфароўскі); *«Нам расказвалі старэйшыя, што як корміш дзіця  і тады атучаеш яго ад грудзі. Дак некаторыя дзеці ж плачуць, не хочуць ні піць, ні есці, дак некаторыя паўторна даюць. Вот на такіх людзей гаварылі, што ў іх будуць дрэнныя надта вочы.*

*Сурочаць любога чалавека і ваабшчэ такі чалавек нехарошы»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Калі атымаеш дзіцёнка, другі раз нельзя прыкладваць, бо ён будзець баяцца сглазу, суроцы»* (в. Ляды Дубровенскага р-на); *«Гаварылі, гэта дзіця вельмі ўрочлівае, урэдныя вочы яго. Няльзя так дзелаць»* (в. Дудзічы Калінкавіцкага р-на); *«Як атняў, ужо нельзя прікладываць втарі раз – будзець на глаза ўредный»* (в. Паршына Горацкага р-на).

Каб пазбегнуць гэтага, маці туга перавязвалі грудзі, выварочвалі сарочку або мазалі грудзі сажаю / гарчыцаю, націралі часныком, давалі дзіцяці ў рот і казалі – *кака*: *«Калі дзіцяці не даюць больш цыцкі, але каб яно вельмі не скучала без цыцкі, яе намазваюць мёдам з перцам і даюць ссаць. Дзіця папробуе да й пачне крывіцца й плакаць, а яму й кажуць, што цыца кака, да й даюць яйцо: "Ось гэта цаца" – кажа матка»* (А. Сержпутоўскі); *«Мне нада было на работу выхадзіць, дак я, як атучала, мазала гарчыцай – тады ўжо не бярэ»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Атучалі, нада было абманваць дзіця, штоб яно не лезла. Яно ж лезе, то чым-небудзь памажуць, бывае перцам, каб яно ўжо супрацівілася, адвесці яго ад гэтага»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«У год адучала, перцам, часнычком мазала. Я дажа сваіх так тожа атучала: мазала перцам, ана саснёт – оно горкае, плюёт, большэ не просіт, не плачэт»* (в. Хаціслаў Маларыцкага р-на).

Некаторыя жанчыны клалі за пазуху шчотку і палохалі дзіця: *«Садзіцца кала стала: пераксціла, пасасіла і шчотку заклала – "Ой, вова там"»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на).

Таксама існаваў звычай аддаваць немаўля на некаторы час камусьці з родных, каб яно некаторы час не бачыла сваёй маці: *«Атвучалі, паплача трохі і ўсё. Матка мая забярэ к сабе, пабудзе трохі ў яе, ды ўсё»* (в. Дудзічы Калінкавіцкага р-на); *«Маме аднясеш, каб сваю маму ня відзеў» (в. Мышавое Касцюковіцкага р-на); «Бацькам отдавалы, каб пэрэнудзілася»* (в. Оса Кобрынскага р-на).

Пэўныя абрадавыя дзеянні здзяйсняліся і пры першым укладванні дзіцяці ў калыску (люльку, зыбку, гушкалку), каб забяспечыць здароўе і спакойны сон немаўляці. Калыска магла быць размешчана на падлозе, магла быць прымацавана да столі, яе выраблялі з дрэва, палатна, плялі з лазы ці саломы, надавалі ёй самыя разнастайныя формы. Гэта быў першы дзіцячы ложак, яго рабілі з дошак ці рэечак. У Заходняй Беларусі і Панямонні плялі з лазовых дубцоў, ракіты, карэнняў у выглядзе доўгага кошыка (часам з казырком). Плеценыя з лазы калыскі дэкаравалі спалучэннем розных спосабаў пляцення. Калыску падвешвалі на чатырох почапках да столі ці бэлькі, часцей – да жэрдкі (галіны),



*Калыска. Драгічынскі р-н. Фотаздымак Т. Кухаронак*



*Люлька – этнаграфічны экспанат ў этнаграфічным кутку ў в. Барсукі. Кармянскі р-н. Фотаздымак Т. Кухаронак*

якая адным канцом затыкалася за бэльку. З канца XIX ст. была пашырана калыска ў выглядзе невялікага ложка на ножках, падбітых папарна дугападобнымі брускамі. Яе часта аздаблялі прапілоўкай па краях дашчаных спінак, фігурнымі прафіляванымі накладкамі, точанымі ці разьбянымі элементамі, з якіх набіралі рашэцістыя бакавіны. Найбольш просты від калыскі ўяўляў сабою кавалак палатна, што нацягваўся на драўляную раму. Такую калыску было зручна браць у поле, дзе яе падвешвалі на трынозе, абгарнуўшы паверх абрусам ці посцілкай, нібы парасонам.

Для зручнасці калыхання ў хаце да калыскі мацавалі вяроўку (можна было калыхаць нагой ці рукой або на адлегласці): *«Дзіця спала, дзеревянная люлька, с аборак пачопкі такія, павесіш на брус і калышаш»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на).

Спецыяльнымі правіламі рэгламентаваўся выраб калыскі (лічылася, што рабіць яе павінны староннія людзі, але штосьці дробязнае дарабляў бацька, інакш дзіця не будзе яго шанаваць). Забаранялася рабіць калыску да нараджэння першага дзіцяці, бо лічылася, што дзіця тады памрэ. Калі майстравалі калыску, выбіралі адзін матэрыял: часцей за ўсё гэта былі расліны або дрэвы, якія хутка растуць: вярба, арэх, «каб так жа хутка расло і дзіця». У народных казках калыска была з золата ці срэбра.



*Калыска.
Драгічынскі р-н.
Фотаздымак
Т. Кухаронак*



*Калыска.
Жлобінскі р-н.
Фотаздымак
Т. Кухаронак*

Прынесеную ў хату, яе перш-наперш абкурвалі свянцонымі зёлкамі і ставілі так, каб на дзіця не падалі ні сонечныя, ні месяцовыя промні. Каб узмацніць ахову дзіцяці ў калысцы, падлогу вакол яе пасыпалі попелам свянцонай вярбы. Так, паўсюль на Беларусі, каб адагнаць ад дзіцяці злыя сілы, у/пад калыску клалі рэчы-абярэгі: вугельчык, хлеб-соль, вострыя ці металічныя прадметы, крыж, чацвярговую соль, якая была зашыта ў невялічкі мяшэчак з чырвонай тканіны. Ненадоўга клалі пірог і на некалькі хвілін садзілі ката. Над калыскай ве-



*Люлька.
Іванаўскі р-н.
Фотаздымак
Т. Кухаронак*



*Калыска.
Іванаўскі р-н.
Фотаздымак
Т. Кухаронак*

шалі чырвоныя паясы, званочкі, мацавалі невялічкі абраз. Калыску накрывалі полагам, які часта выраблялі з вэлюму, у якім маці ішла да шлюбу, або з яе спадніцы.

Першае ўкладанне дзіцяці ў калыску, як лічылі нашы продкі, было даволі значнай падзеяй у яго жыцці, таму для гэтага выбіралі самы спрыяльны дзень: напрыклад, той, на які ў тым годзе прыпадала Раство, каб у далейшым дзіця было «багатае і шчаслівае». І наадварот, «прапускалі» той дзень тыдня, на які ў тым жа годзе прыпадала Дабравешчанне. Звычайна, нованароджанае дзіця клалі ў калыску, толькі пасля «хрэсту».



*Люлька ў хаце Ніны Тарасаўны Петрашка з в. Вялікія Шылавічы. Слонімскі р-н. Фотаздымак Т. Кухаронак*



*У полі дзіця ў люльцы. (У кн.: Polesie: fotografie z lat dwudziestych i trzydziestych. Front Cover. Grażyna Ruszczyk, Anna Engelking. Instytut Sztuki Polskiej Akademii Nauk, 1996. – 246 s.)*



*З музея этнаграфіі, філіяла Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея. Фотаздымак Т. Кухаронак*

Па першым укладанні дзіцяці ў калыску прагназавалі яго будучы лёс. Калі немаўля намочыцца, перш чым засне – будзе спрыянне і яму, і бацькам, і ўсёй сям'і. Калі пакладзенае ўпершыню ў калыску дзіця хутка і спакойна засне, то яно нядоўга пражыве; а дзіця, якое закрычала, – будзе добра гадавацца. Шырокае бытаванне ў беларусаў мела вераванне, згодна з якім нельга было калыхаць пустую калыску, каб не калыхаць чорта, хваробу. Паводле вераванняў, нельга, каб адну калыску калыхалі два чалавекі: дзіця не адразу супакоіцца і трывожна будзе спаць. Перад сном калыску належала перахрысціць, каб не падступаў д'ябал. Калі дзіця спала, забараняллі ставіць яму пад калыску ваду, інакш сон будзе неспакойны. Пад люлькай падкурвалі кавалачкам рэшата, дзеркачом, воскам, вугалем, каб дымок прайшоў праз люльку. У хаце калыску ставілі бліжэй да печы, так, каб дзіця ляжала галавой да ганку. У калысцы дзіця трымалі ад году да трох. Калыска была адна на ўсіх дзяцей, каб браты і сёстры сябравалі паміж сабой. Потым калыску не выкідвалі, трымалі на гарышчы альбо дарылі.

## Парадзіха і немаўля ў першыя дні пасля родаў

У вялікай патрыярхальнай сям'і, дзе ў хаце было некалькі працаздольных жанчын, парадзіха мела магчымасць крыху паляжаць у ложку, узнавіць сілы, а ў малой, дзе парадзіха была адзінай гаспадыняй, першай яе памочніцай была бабка-павітуха. Яна заходзіла да парадзіхі на працягу трох або сямі дзён, зрэдку на працягу месяца, купала дзіця і прыносіла разнастайныя прадукты харчавання: бліны, яечню, кашу, макароны з малаком, ягады, сушаныя яблыкі: *«Бабка тры дні прыходзіць к парадзелі, усё прыносіць, тыя разы і ладачкі пякуць, і наліснікі, і мяса с каўбасою, кашу вараць, кампоту. Парадзеля – як па здароўю: хто тры дні паляжыць, хто – чатыры, баба памагая па хазяйству, а тады ўстанеш дай робіш»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на); *«Баба прыходзіць к радзіллі дні чатыры, прыносіць місу бліноў, купаіць»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на). У сям'і парадзіхі часта смяяліся: *«Зараз твая бабка прыдзя, ужо ладкі мачая»* (Бялыніцкі р-н). Ежу павітуха несла абавязкова ў гаршках, і ўсе казалі, што «баба ідзе з гаршкамі», што азначала: павітуха ідзе наведваць парадзіху. Па сведчанні К. Машынскага, *«павітуха павінна тры дні тры разы ў дзень насіць тры стравы: раніцай, у абед і ўвечары. Гэта боршч, прасяная каша, млінцы, булкі, адвараныя грыбы, рыба, хрушчыкі з ягадамі»*. Першы раз павітуха аддавала парадзісе прадукты харчавання з наступнымі пажаданнямі:

*«На тобі, моя ўнучачка, штоб то містэчко, дэ була паненка, зноў папоўнілася»* (Э. Яленская-Дмахоўская). Бабка таксама выконвала працу па гаспадарцы, што давала магчымасць парадзісе набрацца сіл пасля родаў. Пасля гэтага павітуха атрымлівала ўзнагароджанне за сваю дзейнасць: *«Бабка купала первыя тры разы. Ей падарак давалі. А бедна ж жылі, наметку даеш, на спадніцу купіш мацерьялу»* (г. п. Хоцімск); *«Ета бабуля мыла дзіця месяц, кажны дзень. Давалі ёй падарак – ласкутак які ці палаценца, тады ж што тама было. А то булачку якую спячэць, дасць»* (в. Сава Горацкага р-на); *«Када ж і баба пріходзя дзіця мыць, купаць, яна ж накладывая сумку. Там жа і для дзіцяці, перяматаць яго нада і падарак унучке. Эту сумку ставіць высока на печку, на пяколак, штоб дзіця бальшое і здаровае расло. Эта када яна первы раз ідзе купаць. Баба ж разы трі пріходзя і не з голымі рукамі, абезацельна што-небудзь нясець. Баба прінясла, дзіця пакупала, свой абряд ісдзелала, запеленала яго: «На, мамка, кармі яго»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на).

Знаходжанне павітухі ў доме парадзіхі патрабавала, паводле ўяўленняў беларускага сялянства, абавязковага ачышчэння, якое дасягалася пры дапамозе абраду «размывання рук / злівак»: бабка і парадзіха палівалі вадой адна адной на рукі і прасілі прабачэння. Так, ва Усходнім Палессі пасля таго, як баба перабабіла дзіця, ёй палівалі на рукі і давалі падарункі – хустку, фартух, матэрыю. У некаторых вёсках Віцебшчыны павітуха пасля прыняцця родаў мыла рукі над начоўкамі, у якія бацька дзіцяці ці іншая кроўная сваячка парадзіхі кідалі для яе грошы. У Магілёўскай губерні парадзіха, устаўшы на трэці дзень пасля родаў, «злівала на рукі» бабе-павітусе, гэта значыць што-небудзь ёй дарыла і частавала. Нам удалося знайсці толькі адно сведчанне таго, што абрад ачышчэння парадзіхі і павітухі адбываўся на хрэсьбінах. Яно адносіцца да сярэдзіны XIX ст. і дае поўнае ўяўленне пра абрад і яго асноўныя структурныя элементы. Па гэтай прычыне прывядзём яго поўнасцю: *«У першы дзень хрэсьбін... пасярод вячэры бабка бярэ тры галінкі з веніка, кладзе іх крыж-накрыж на падлогу і разам з парадзіхаю становіцца праваю нагою на гэтыя галінкі. Пасля здзяйснення гэтага абраду бабка бярэ міску з вадой, ідзе да парадзіхі і разам з ёю мые рукі. Парадзіха: "Прасці мяне грэшную", а бабка адказвае: "Бог прасціць". Гэты дыялог паўтараецца тры разы. Пасля абмывання рук парадзіха бярэ кавалак палатна ці намётку і кладзе яго на шыю бабцы, і абедзве выціраюць ім рукі... Затым бабка бярэ галінкі, на якіх яны з парадзіхай стаялі, і ваду, якой яны мылі рукі, і адпраўляецца да гасцей, пырскае на іх гэтай вадой, асабліва кумоў*

*(Полацкі павет Віцебскай губерні)»* (Архіў Геаграфічнага таварыства, г. Санкт-Пецярбург). Звычайна пасля злівак ладзілі невялікае застолле: «*Баба дзіцёнка спарядкавала, рукі памылі і бабу ж частуюць. Завуць дзеда, калі ў бабы дзед ё. Пасадзяць дзеда і бабу, частуюць, і сам з імі садзішся*» (в. Пачапы Краснапольскага р-на). Пасля гэтага павітусе дазвалялася ісці прымаць роды ў наступнай парадзіхі.

Паводле народнага меркавання, першыя сорак дзён пасля нараджэння былі самымі небяспечнымі для дзіцяці, таму з ім патрэбна было абыходзіцца вельмі асцярожна і берагчы ад уздзеяння злых сіл, для чаго выкарыстоўвалі агульнавядомыя абярэгі: жалеза, соль, вугаль, рэчы чырвонага колеру, святую ваду, ладан. У гэты час яно падпадала пад уздзеянне сурокаў, магло быць падменена з боку нячыстай сілы: «*Дзіцёнка не паказвалі месяцаў шэсць, каб не сурочылі. Гаварылі: "Соль табе ў вочы" – і перякрасціцца жэншчына, каторая дзіцёнка нясець, штобы нічога не прыставала. Тады ж дзяцей было і па дзевяць, і па дзесяць, і па дзвянаццаць*» (в. Ржаўцы Шклоўскага р-на). Па гэтай прычыне немаўля не раілі пакідаць аднаго, абстаўлялі шэрагам рэчаў-апатрапеяў, закрывалі ад чужых позіркаў. Каб засцерагчыся ад сурокаў, імкнуліся не вывешваць пялюшкі на вуліцы пасля заходу сонца, выліваць ваду пасля купання не на дварэ, а ў хаце пад печ. Лічылася, што дзіця (і наогул чалавек) падтрымлівае сувязь з Сусветам, адкуль яно прыйшло, праз раднічок, які знаходзіцца на цемечку і з якім вельмі асцярожна патрэбна было абыходзіцца. Дзіця, якое сурочылі, не брала грудзей, плакала, не расло, пазней не хадзіла і не размаўляла. Яно губляла сілы і ў рэшце рэшт памірала. Існавала шмат спосабаў лячэння ад сурокаў. Найбольш шырокае бытаванне мела абрадавае дзеянне, якое як бы ўзнаўляла акт паўторнага нараджэння дзіцяці: маці працягвала яго паміж ног ці пераступала праз дзіця, што ляжала на падлозе ці ганку; праводзіла рукой спачатку ў сябе паміж ног, а затым тыльным бокам далоні па твары дзіцяці і інш. Усе гэтыя магічныя прыёмы суправаджаліся слоўнай формулай: «Чым маці нарадзіла, тым і адхадзіла». У першыя дні і месяцы жыцця дзіцяці маці выступала як яго галоўная абаронца ад знешняга свету, нячыстай сілы і варожых людзей. На маці ляжаў клопат пра дзіця, яна прымала прафілактычныя меры, займалася лекаваннем: «*Вот родзіцца дзіця, так нельзя на таго ребёначка заглядывацца, бо бывают глаза плахія. Сурочылі. Тагда берёт эта маць сваю сподняю рубашку і выцірает ребёначка рубашкаю. Воду после купання вылівалі под угол где-то, до сходу сонца. Еслі маленькі ребенок болеет сільно, то вродзе ешчо купают его до схода сонца і перэд сходом сонца воду вылівают под дзерэво і говорят: "Ідзіце,*

*болезні, под дзерево, ідзіце, ребенка кроў не сушыце". Вот такія разговоры былі. Эта маці рабіла»* (в. Хаціслаў Маларыцкага р-на); *«Як дзіця мо дзе чаго спугалася ці сурочаць, к бабцы ідуць, яна вады пашэпча. Былі такія бабкі. Маці магла сама лячыць, нада, штоб падолкам сваім працерла, а бывая, кругом ножкі разы тры абнесці ў стале. Шукалі ўсякія лекі»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Як дзіця родзіцца і крычыць – эта называлася крактухі. Нашы тады прымерна, у сарай панясуць, паложаць. Адзін хто-та прынясе, паложыць, а другі забярэ, прынясе мне назад. Лажылі ў сарай у безапаснае места, каб яго там ні карова, ні конь ня ўдарылі. У курыны падпечак клалі – крактухі вывадзілі»* (в. Будагова Смалявіцкага р-на).

Пакуль дзіця не хадзіла і не гаварыла, у беларусаў яго называлі анёлкам, лялечкай. Асобнай семантыкай і функцыямі надзялялася ў традыцыйнай культуры пазашлюбнае дзіця, якое лічылася «дадзеным Богам», таму яму асабліва шанцуе ў жыцці, часам яго так і называлі Багданькай / Багданам. Але часцей найменні пазашлюбных дзяцей былі больш зняважлівыя: байструк, банкарт, самасей, чурка, крапіўнік.

ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ

# ПЕРШЫ ГОД ЖЫЦЦЯ НЕМАЎЛЯЦІ І СЯМ'І

## Адведкі

У хуткім часе пасля родаў да парадзіхі без запрашэння з боку бацькоў дзіцяці прыходзілі ў адведкі замужнія жанчыны. Прыходзілі, каб падтрымаць парадзіху пасля родаў, выслухаць яе, даць параду, падзяліцца жаноцкім і мацярынскім вопытам. Праўда, наведваць парадзіху («у ад(-т)ведкі», «давед(-т)кі», «ісці на красную», «на радзіны», «несці звар», «у вотва(-я)дкі», «у вотве(-э)ды», «вответкі», «у наве(-і)ды», «провідкі», «у адведзіны», «у (в-)отпыты», прыходзілі пераважна тыя, да каго ў свой час з такою ж мэтаю хадзіла яна сама: «Як сама ідзеш у даведкі, дык й к табе прыдуць, а не – дык не».

У адведкі прыходзілі ўсе разам у адзін дзень або па адной-дзве на працягу тыдня – двух тыдняў і болей. Грамадская думка вясковай

супольнасці асуджала жанчыну, якая не наведвала парадзіх, што ў свой час з аналагічнай мэтай прыходзілі да яе. Як адзначалася ў этнаграфічных апісаннях XIX ст., узаемнасць адведак строга прадпісвалася звычаем. Пра жанчын, якія гэтага не выконвалі, гавораць з вялікай непавагай: *«Яна багата, спясіва, чванавата, нас і знаць ня хочыць»* (М. Нікіфароўскі).

Нормы звычаёвага права прадугледжвалі і для парадзіхі пэўныя правілы паводзін: якая б здаровая яна ні была і чым бы ні займалася, заўважыўшы жанчыну, што ішла ў адведкі, кідала работу і клалася ў ложак. Так яна павінна была прымаць кожную наведвальніцу да хрышчэння дзіцяці (П. Шэйн). На Палессі, дзе жанчын, што прыйшлі наведваць парадзіху, не частавалі, парадзіха «аддорвала», гэта значыць давала ім гарбузікаў, сушаных чарніц, цукру, абаранкаў і інш. (А. Сержпутоўскі). Невыкананне гэтага няпісанага правіла магло наклікаць на парадзіху разнастайныя няшчасці і непрыемнасці («яна можа захварэць», «прападзе малако»). Адведкі былі пранізаны ўсялякімі ўмоўнасцямі і правіламі паводзін для парадзіхі і тых, хто прыходзіў яе наведаць. Так, паводле сведчання А. Сержпутоўскага, *«жанчыны моўчкі заходзілі ў хату, хутка праходзіля да полагу і, прысеўшы на край ложка, разгортвалі і аддавалі парадзісе ежу, што прынеслі. Толькі тады яны пачыналі гаварыць і "віншаваць". Парадзіха ж у сваю чаргу, як прынясуць ёй якую-небудзь страву, павінна была тут жа пры гэтай наведвальніцы, якая прынесла ежу, пакаштаваць ежу і пахваліць яе. Гэта трэба было зрабіць, паводле народных меркаванняў, каб "самой парадзісе хутчэй набрацца сіл, каб дзіця было здаровае і ў яго хутчэй раслі зубкі»*.

Паводле нормаў звычаёвага права, нельга было ісці адведваць парадзіху з пустымі рукамі, таму жанчыны прыносілі для яе самыя на той час і ў тых абставінах калярыйныя і смачныя стравы. Нават самыя бяднейшыя імкнуліся прынесці ёй хоць кавалак хлеба і солі. З прадуктаў харчавання абавязковымі з'яўляліся разнастайныя мучныя вырабы ці мука, крупы і яечня / яйкі. Неслі таксама кашу, каўбасу, сыр, масла, смятану, малако, мёд, мяса / сала (у скаромныя дні і калі была такая магчымасць). Багатым быў набор страў для наведвання парадзіхі на Палессі: бліны, булачкі, аладкі, піражкі, варэнікі, гаршчок крута зваранай кашы, боршч, патраўка (суп з курыцай), дзеруны (бульбяныя аладкі), звар (кампот з сушаных яблыкаў, ігруш, чарніц). Паводле сведчання А. Сіцынскага, на Палессі ў сярэдзіне XIX ст.: *«...жанчыны, ідучы наведваць парадзіху, неслі тры гаршкі яды: 1) у адным "узвар" – адвар ягад чарніц, сушаных ігруш, яблыкаў, сліў, вішань, цукру і еду; 2) гаршчок з квасам ці капустай, да якіх дабаўлена ў посныя дні –*

*перцу, грыбоў, яршоў і таранаў, уюноў; у скаромныя дні – перцу, сала, бараніны (на замену гэтай стравы зрэдку гатавалі яечню); 3) гаршчок з кашай, прасяной ці грэцкай. Каша замянялася калі-нікалі тварагам са смятанай. Акрамя таго, пяклі грэцкія бліны ці аладкі з цёртым макам, якія макаліся ў алей ці ў свіное сала».* Прадукты харчавання аддавалі парадзісе з разнастайнымі пажаданнямі: «З'еш, каб заклалася месца ў жываце», «Што выйшла з радзільніцы, то штоб папоўнілася», «Малае прыміце, а на большае выбачайце». Парадзіха ставіла ці клала прынесенае тут жа на ложку.

Паводле сведчанняў большасці нашых інфармантаў, адведкі захоўваліся доўгі час у сваім традыцыйным выглядзе: *«Як жонка родзіць, к ей ішлі ў вотведы бабы. Шчо е, то й няслі: кісель, пампушкі, кашу, хлеб»* (в. Мілашэвічы Лельчыцкага р-на); *«Як у атведкі ідзеш, напячэш бліноў, і булку такую. Пячэння накладуць у міску, стаіць цэлая тарэлка»* (в. Азяркі, Верхнядзвінскага р-на); *«В отвідкі ходылы, на родыны. Кашы навараць, кампоту яблык сухіх. Хліба булку спэкуць, чорнога, пшана, і шось шчэ домашняга возьмуць. Тылько жанчыны ходылы»* (в. Оса Кобрынскага р-на); *«Адветкі былі на другі, трэці дзень, а то і ў той дзень прідуць, як с бальніцы пріедзеш. Ідзець у адветкі – абязацельна далжна несць закуску. Сумку нада накласць. Баба кісялю наваря ўсягда, міску грушак прінясець, хто – халадзец, хто – што. А цяперя ўжо грошы ў карман і пашоў»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на). У галодныя пасляваенныя гады парадзіхі рады былі кавалку хлеба: *«У атветкі пріхадзілі. Свякровіна цётка прышла, праснушку прінясла – эта бульбу с мукой таўклі ў ступе, а тады ў печ. Так эта цётка, у яе была карова, намакала ў смятану і прінясла мне праснушкі. Як сечас помню»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на); *«Пріходзілі ў атветкі. Тады нічога па магазінах не было, усё сваё: ладак спячеш, сала крошку возьмеш, мы былі рады хлеба паесць»* (пас. Леніна Краснапольскага р-на).

Для дзіцяці прыносілі старыя сарочкі, палатно «на пялёнкі»: *«На радзіны хадзілі, неслі, што было ў каго. У маё ўжо ўрэмя неслі распашонкі, а раньше якую навалачку старую баба распора, нічога ж не было ў людзей»* (в. Буглаі Краснапольскага р-на). Непажаданым лічылася ў час адведак цікавіцца здароўем дзіцяці, наогул падыходзіць і глядзець на яго, каб не сурочыць. Мужчынам і незамужнім дзяўчатам забаранялася хадзіць у адведкі: *«У атветкі пріходзілі жэншчыны, саседкі, маміны падругі, мужчыны – не, на чорта ж мужчыны пойдуць к бабам. Бабы пасядзяць адны, пагаворяць, бутылачку разап'юць і ўсё»* (в. Сава Горацкага р-на); *«Шчыталася, што дзеўкам і мужыкам не нада хадзіць у атветкі»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на). Калі ў час адведак у хату

выпадкова заходзіў мужчына, то з яго зрывалі шапку, выганялі з хаты і пасля ў вёсцы доўга смяяліся, што «ён пуп аблізаў». Паводле народнага меркавання, ісці наведваць парадзіху не маглі цяжарная жанчына і жанчына, у якой у дадзены момант была менструацыя. Іх прыход, лічылі, мог прынесці шкоду парадзісе і дзіцяці.

Агульнабеларускі характар мела перакананне, што наведванне парадзіхі станоўча магло паўплываць і на саміх жанчын, што прыходзілі ў адведкі, – «на тым свеце яны пападуць у рай». У час наведвання ладзілася невялікае застолле для жанчын. Муж парадзіхі, калі ў сям'і не было іншых жанчын, павінен быў частаваць тых, хто прыйшоў наведаць яго жонку.

У Заходнім Палессі зафіксаваны спецыфічны звычай, які не сустракаўся на астатняй частцы Беларусі. Згодна з ім, да парадзіхі незадоўга да святкавання хрэсьбін (акрамя адведак) збіраліся на радзіны толькі яе родныя («свой род»), зрэдку – павітуха і будучыя кумы. Ладзілася невялікае застолле, абавязковым частаваннем на якім была каша, прынесеная жанчынамі ці прыгатаваная самой парадзіхай. Парадзіха ела кашу першай, пасля – усе астатнія госці, выказваючы пры гэтым разнастайныя пажаданні, адрасаваныя як парадзісе, так і дзіцяці: «Каб у паражыллі малако было», «Каб крэпкі рос», «Каб кашу таксама еў, моцны быў».

Калі ж парадзіхай аказвалася незамужняя дзяўчына, то да яе звычайна ніхто не прыходзіў, акрамя павітухі і вельмі блізкіх сябровак. Напрыклад, на Віцебшчыне, паводле сведчання А. Шлюбскага, «у такім разе дзяўчаты "ў складку" куплялі падарункі для сваёй нешчаслівай сяброўкі і адсылалі ёй праз павітуху».

## Наданне імя дзіцяці

Усведамляючы, што ўсё на зямлі ўзаемазвязана, беларусы вельмі адказна падыходзілі да выбару імя дзіцяці, бо ад гэтага залежаў яго лёс, яго шчаслівае ці, наадварот, нешчаслівае жыццё. Паводле традыцыйных уяўленняў, дзіця, якое не мела імя, было небяспечным, яно было нічым. Вера ў рэальную магчымасць перадаць праз словы тыя якасці, уласцівасці, што адлюстраваны ў яго значэнні, паступова стварала імёны, у якіх было выказана пажаданне тых ці іншых рысаў характару. Такімі з'яўляліся старажытнарускія імёны Дабрыня, Уладзіслаў, Яраслаў, Усевалад, Уладзімір і г. д. Як адзначалі этнографы мінулага стагоддзя і як сведчаць нашы экспедыцыйныя матэрыялы, на тэрыторыі Беларусі шырокае распаўсюджанне мела павер'е, што калі даць дзіцяці імя

вядомых у наваколлі людзей з дрэннай рэпутацыяй (п'яніц, злодзеяў, гультаёў), то і дзіця будзе такім жа дрэнным чалавекам.

Каб папярэдзіць смерць дзіцяці (калі ў сям'і папярэднія дзеці паміралі), для яго «з мёртвых знімалі імя», гэта значыць давалі імя даўно памерлага продка, імкнуліся тым самым паставіць дзіця пад ахову рода. У асобных сем'ях імя, асабліва для хлопчыкаў, перадавалася ад пакалення да пакалення. Імя дзіцяці, якое нядаўна памерла, новаму немаўляці не давалі, баючыся, што яго напаткае такі ж самы лёс. Бывалі выпадкі, калі давалі імя першага сустрэчнага чалавека, якога бацька нованароджанага чакаў, стоячы на перакрыжаванні дарог (так рабілі, калі папярэднія дзеці ў гэтай сям'і паміралі).

Пры хрышчэнні дзіця атрымлівала імя аднаго з праваслаўных ці каталіцкіх святых, свята ў гонар якога адзначаецца ў 8-дзённы тэрмін з дня нараджэння дзіцяці. Нельга было выбіраць імя святога, чый дзень памяці ўжо прайшоў. Праўда, для дзяўчатак межы часта пашыраліся, бо святых жанчын было не так шмат. Усяго ў святцах сустракалася 2500 святых, з іх каля 600 жанчын, аднак імён – значна менш: каля 900 мужчынскіх і 250 – жаночых. Лічылася, што пры нараджэнні Бог дае кожнаму чалавеку анёла-ахоўніка, а пры наданні імя чалавек набывае яшчэ і анёла-апекуна – святога, у гонар якога ён быў названы. Суаднесенасць імя з днём таго ці іншага святога давала немаўляці неабходную яму падтрымку і апеку ў зямным жыцці.

Разам з тым працягваў існаваць абрад надання імя дзіцяці бабай-павітухай пад назвай «ахрысціць дзіця з вады», асабліва калі немаўля было слабое і магло памерці заўчасна. Калі павітуха купала першы раз дзіця, яна па просьбе бацькоў давала яму імя. Пасля выздараўлення дзіцяці, кумы ў дадзеным выпадку гаварылі ў царкве (касцёле): «Бабка дала (такое-та) імя», і святар, як правіла, згаджаўся з гэтым, хоць былі і выключэнні.

Як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы XIX ст., наданні імя дзіцяці ў Магілёўскай губерні адбываліся наступным чынам: бабка-павітуха купляла белы хлеб і ішла да святара «па імя». Прыйшоўшы да яго ў хату, яна клала на стол белы хлеб і казала: «Бог даў (такому-та) сына (дачку), прыйшла па імя». Святар чытаў малітву і даваў імя. Бабка вярталася ў хату бацькоў і, павіншаваўшы іх, аб'яўляла імя дзіцяці; калі ў сям'і былі дзеці, то бабка гаварыла: «Я вам прынесла маленькага братца Іваньку, глядзіце, жалейце і любіце яго» (А. Дэмбавецкі). Звычай несці падарунак святару, каб «атрымаць імя», існаваў паўсюдна: часцей за ўсё кумы неслі хлеб, пірог, ручнік, пазней – грошы. З развіццём капіталістычных адносін на вёсцы падарункі сталі замяняцца адпрацоўкай пэўнай коль-


METRYKA

Ангеля Асташенко

дочка Міколы і Марыі

з дому Жыдовіч

naradziłася u в. Будзіч...ве

dnia 1-I 1944 h. i achry...

dnia 16-I-1944 h. u Mie...

Katalickim Parachijalnym Kaściele Катэдральным

Метрычны № 31

Ks. PROBAŠČ

Mieńsk

12 снежня 1944

SIGILL. ECC. PAR. CATHED. NAT. B. M. ... MINSK

*Пасведчанне аб нараджэнні. Фотаздымак Т. Валодзінай*

касці дзён у гаспадарцы святара, на полі ці сенажаці. «*Зразу назвалі імянем, там, Таццяна, Хрысціна, Паўліна, Воля. Назнакуюць дома, а поп дась*» (в. Рог Салігорскага р-на). Звычайна святар даваў імя дзіцяці ў адпаведнасці з царкоўным календаром (святцамі), але зрэдку і тое, якое хацелі самі бацькі, калі апошнія былі яго сябрамі, «любімчыкамі», як іх называлі ў народзе. А пасварыўшыся з кім-небудзь ці тым,

хто, на яго думку, прынёс невялікі падарунак, святар мог даць для іх дзіцяці нетрадыцыйнае, немілагучнае імя (напрыклад, Пуд, Пакталій, Кісар), якое не сустракалася ў дадзенай мясцовасці, і ўладальнік яго ў наступным падвяргаўся кпінам з боку аднавяскоўцаў. Незаконнанароджаным дзецям часцей за ўсё даваліся біблейскія імёны Адам і Ева.

## Выбар хросных бацькоў (кумоў)

Першым крокам у падрыхтоўцы да хрышчэння дзіцяці быў выбар хросных бацькоў – кумоў, якія выконвалі ў першую чаргу патранажныя функцыі ў адносінах да дзіцяці. Але не толькі гэтыя абставіны вызначалі такое сур'ёзнае стаўленне да кумаўства. Яно было абумоўлена жыццёвым укладам беларускай дарэвалюцыйнай вёскі. Побач з суседскімі, сваяцкімі, сяброўскімі ўзаемаадносінамі, якія існавалі паміж жыхарамі пэўнага пасялення, значная роль належала адносінам кумаўства. Да кумоў пасля здзяйснення абраду ставіліся пэўныя патрабаванні, выкананне якіх кантралявалася грамадскай думкай вёскі. Напрыклад, рэзкае асуджэнне з боку аднавяскоўцаў выклікала сварка паміж кумамі. Яны павінны былі дапамагаць адзін аднаму пры сельскагаспадарчых работах, прымаць агульны ўдзел у святах і важнейшых падзеях жыцця. Запрашэнне кумоў паўсюдна на тэрыторыі Беларусі ажыццяўлялася аднолькава. Часцей запрашаў у кумы бацька немаўляці, але маглі гэта зрабіць таксама свякруха ці маці парадзіхі. Яны абавязкова неслі з сабою хлеб. Запрашэнне ў кумы суправаджалася разнастайнымі магічнымі дзеяннямі. Так, той, хто запрашаў, не меў права садзіцца ў гэтым доме – інакш, лічылася, дзіця не будзе доўга хадзіць. Ніколі не бралі за кумоў бяздзетных людзей. Паводле народнага меркавання, ад выбару і паводзін хросных бацькоў дзіцяці таксама шмат у чым залежаў яго будучы лёс. Звычайна бралі людзей маладзейшых за родных бацькоў, такіх, якія мелі ў наваколлі рэпутацыю сумленных, працавітых, разумных. Паводле ўяўленняў, першым хроснікам у хроснага бацькі павінна быць дзяўчынка, а ў хроснай маці – хлопчык.

Згодна з народнымі звычаямі, адмаўляцца ад кумаўства не раілася, хоць такія выпадкі зрэдку і здараліся. Асабліва ахвотна ішлі хрысціць незаконнароджаных дзяцей – «байструкоў», бо верылі, што кумам пасля будзе ва ўсім удача. З гэтай мэтай кум запіхваў сабе за пояс аброць, каб у яго вяліся коні, клаў за пазуху каласы жыта, аўса, каб быў багаты ўраджай. Кума брала з сабою лён, каб ён добра рос, за пазуху клала «цадзілку», каб у каровы было шмат малака і г. д. (А. Сержпутоўскі). У кумы да «байструкоў» імкнуліся ісці дзеўкі, якіх доўга не бралі замуж:

існавала павер'е, што яна выйдзе замуж, як толькі яе хроснік пачне хадзіць. Паводле народнага меркавання, тая дзяўчына будзе мець шмат кавалераў, у якой першы хроснік быў хлопчык, і той хлопец будзе мець поспех у дзяўчат, у якога першая хросніца – дзяўчынка. У кумы запрашалі сваіх і чужых аднолькава: *«За кумоў бралі, хто захочыць, саседзей, падружак. Я сваю падружку кумой брала, мы ў школе ўчылісь, гулялі ўмесце, а кум – сасед наш»* (в. Вялікія Шарыпы *Горацкага* р-на).

Кумоў, што хрысцілі першынца, імкнуліся захаваць для ўсіх наступных дзяцей: *«Так не гожа, што дытынка, то новынка» (Палессе).* На Віцебшчыне, напрыклад, лічылі, што ў таго чалавека, які часта мяняе кумоў, будуць нядобрасумленныя дзеці. На Гродзеншчыне стараліся браць за кумоў чужых людзей, «каб болей было радні», «каб тут больш сваіх было». З гэтай жа мэтай ва ўказаным рэгіёне да кожнага наступнага дзіцяці запрашалі новую пару кумоў. Замена кумоў адбывалася таксама ў выпадку смерці аднаго з іх, доўгатэрміновага ад'езду, цяжарнасці кумы.

Паўсюдна на Беларусі замянялі кумоў, калі папярэднія дзеці паміралі, для чаго бралі за кумоў выпадковых людзей («(у-)стрэчных», «збожжых», «спатыканых»). Калі нованароджаны быў хлопчык, бацька адразаў «крайчык» хлеба, пасыпаў яго соллю, загортваў у ручнік, браў пад паху правай рукі і ішоў на скрыжаванне дарог. Калі ж была дзяўчынка, бацька адразаў «скібку» (адрэзаны па крузе кавалак хлеба) і, паклаўшы яе пад паху левай рукі, ішоў туды ж. Сустрэўшы на дарозе мужчыну ці жанчыну, ён адламваў кавалак хлеба, даваў ім і казаў: «Я бяру цябе за хрёснага (хрёсную)»: *«Бывая, як ня гадуюцца дзеці, то бяруць за кумоў каго стрэнуць на вуліцы: старога, малога, маладога – таго ўжо бяруць за кумоў, штоб дзеці гадаваліся»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на).

Звычайна ніхто не адмаўляўся, калі толькі ў людзей не было вельмі тэрміновай справы. «Устрэчных» кумоў перад адпраўленнем у царкву абавязкова кармілі. Пасля вяртання з царквы кумы не заходзілі ў хату, а перадавалі дзіця бацькам праз акно. Дзейсным сродкам захаваць дзіцяці жыццё лічылася імітацыя яго продажу: бацькі, калі ў іх паміралі дзеці, «прадавалі» немаўля праз акно чужым людзям: жанчыне або мужчыну, у якіх усе дзеці былі жывыя. «Пакупнік» даваў бацькам крыху грошай і заносіў дзіця назад у хату, аддаваў яго са словамі: *«Выгадуйця яго, зара гэта дзіця мае»* (Заходняе Палессе). Бацькі, калі страчвалі надзею, рабілі так і на Магілёўшчыне: *«Раньшы дзяцей куплялі. Няўрослыя дзеці, гаворюць. Радзіўся харошы – памёр, і так пяць ці сколька. У Тамарінай бабы дзед прішоў са службы і жаніўся на маладой дзеўкі – у іх было 15 дзяцей, і мёрлі ўсё, трое асталася. Ну дык вот – у каго*

*многа дзяцей і расьлі, дык куплялі. Во, на табе дзенежку, а мне прадай этага дзіцёнка. Ужо ня твой ён, а як мой будзець – і так расьлі. У мяне была такая і саседка, у яе ўміралі – дык купляла бабушка, у каторай было восем сваіх»* (в. Канічы Касцюковіцкага р-на).

Даволі часта на Беларусі ў выпадку смерці папярэдніх дзяцей да наступных бралі ў кумы малалетніх брата і сястру. Усё гэта рабілася, каб увесці ў зман злыя сілы, якія маглі пашкодзіць здароўю дзіцяці і прывесці да яго смерці.

## Хрэсьбіны

Значнай падзеяй у жыцці традыцыйнай сям'і з'яўлялася хрышчэнне дзіцяці паводле царкоўнага абраду, якое адбывалася ў адзін з нядзельных дзён у першыя два-тры тыдні пасля нараджэння дзіцяці. Яно давала дзіцяці ахову не толькі на небе (анёл-апякун, святы), але і на зямлі ў асобе хросных бацькоў. Хросныя бацькі на працягу зямнога жыцця хросніка выступалі ў якасці духоўных дублёраў кроўных бацькоў. У выпадку смерці кроўных бацькоў выхаванне і адказнасць за дзіця неслі хросныя бацькі. У важных сямейных пытаннях, якія тычыліся хросніка, абавязкова раіліся з хроснымі бацькамі, і яны маглі карэктаваць дзеянні і меркаванні кроўных бацькоў. У праваслаўнай традыцыі хросныя павінны былі ўсё жыццё маліцца аб сваіх хросніках і клапаціцца аб іх духоўна-маральным выхаванні.

Кожны з запрошаных у кумы нёс хлеб ці ручнік. Кума несла яшчэ кавалак палатна («крыжма», «мятлік», «прокстак»), на які клалі дзіця пасля хрышчэння: *«Кум і кума несуць у цэркаў, адна пара. Маць хросная*



*Хрышчэнне. Фотаздымак Я. Пясецкага*

*далжна сваю рубашачку, распашоначку палажыць после крэста і пара пелёначак, ужэ ана заварачывает»* (в. Хаціслаў Маларыцкага р-на). Святар упершыню надзяваў на дзіця крыжык і кашулю.

Паралельна з царкоўным існаваў старадаўні народны абрад далучэння дзіцяці да сям'і, хатняга ачага, супольнасці. Ён выконваўся часцей за ўсё да хрышчэння, але зрэдку і пасля яго. Для гэтага пасярэдзіне хаты ставілі стол і па яго вуглах клалі па кавалачку хлеба з соллю. Пакупаўшы дзіця і спавіўшы яго, бабка разам з кумам тры разы абыходзіла стол, кожны раз хрысцячыся і цалуючы хлеб. Стол і печ з'яўляліся сакральнымі месцамі ў хаце беларусаў. Часам павітуха пасля купання дзіцяці клала яго на кажух, разасланы на падлозе каля ганка ці каля печы, пераступала праз дзіця некалькі разоў, прыгаворваючы: «Каб вялікае расло, каб добра спала» ці «Як шуба касмата, будзь так багаты». Затым павітуха са словамі: «Даём Вам нараджонае, а нам прынясіце хрышчонае» – аддавала дзіця куме, якая разам з кумам адпраўлялася да святара: *«Кумы абносяць дзіця так во кругом стала: кросная трымая на руках дзевачку, а кросны – хлопчыка. Абышлі тры разы і паехалі ў цэркаў»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на).

Шэраг магічных дзеянняў і прыёмаў здзяйсняўся перад адпраўленнем і па дарозе ў царкву / касцёл. На Віцебшчыне перад дарогай кум сядаў на лаўку, а кума – на тачыльны камень, што, паводле народнага меркавання, садзейнічала таму, каб дзіця расло здаровым і моцным. Тут і ў паўночных раёнах Міншчыны, калі везлі хрысціць хлопчыка, каля ганка хаты клалі сякеру, пілу, долата, каб кумы, едучы ў царкву / касцёл, пераступалі праз іх – тады іх хроснік вырасце добрым майстрам. Калі кумы неслі хрысціць дзяўчынку, то каля ганка з той жа мэтай клалі лён, нажніцы, верацяно, іголку. У Навагрудскім павеце, калі прыходзіў час везці дзіця да святара, кумы падносілі яго спачатку да бацькоў, а потым да ўсіх прысутных, звяртаючыся да іх са словамі: «Бацьке, дзядзьке, дзядзіны і цёткі, суседзі і прыяцелі, благаславіце яго да хрысту». На такі зварот хто-небудзь з прысутных адказваў: «Няхай яго Бог гадуе, шчасце і долю гатуе, бацьку і мацеры на пацеху і па паслугу». Павітуха ў гэты час купала дзіця і загортвала хлопчыка – у мужчынскую сарочку, дзяўчынку – у жаночую, у рукаў якой завязвалі хлеб, соль, жыта, каб уберагчы дзіця ад сурокаў. Акрамя таго, лічылася, калі ў сям'і былі толькі дзяўчаткі, а бацькі хацелі, каб наступны нарадзіўся хлопчык – тады дзяўчынку перад адпраўленнем да хросту таксама загортвалі ў мужчынскую сарочку (А. Сержпутоўскі). Кум у сваю чаргу аддаваў дзіця куме: хлопчыка – на ганку, дзяўчынку – праз грэбень.

Пры ад'ездзе ў царкву / касцёл сярод гасцей адбываўся наступны абрад: жанчыны зрывалі шапкі з мужчын і кідалі іх на воз. Паводле на-

роднага меркавання, рабілася гэта дзеля таго, «каб дзіця ціхае было, і людзі не абгаворвалі». Як і пры ўсялякім выездзе ў дарогу, кумы садзіліся на лаўку, а гаспадыня зачыняла печ засланкаю, каб была ўдалая паездка («каб у дарозе добра паводзілася») (А. Сержпутоўскі). Па дарозе кумам забаранялася размаўляць паміж сабой, каб дзіцё не было крыклівым. На перакрыжаванні дарог, калі ехалі хрысціць дзіця, кумы выкідвалі гліну і соль, каб засцерагчы малое ад сурокаў. На Палессі пры гэтым яшчэ прыгаворвалі: «На тобі, чорце, плату». Калі па дарозе ў царкву / касцёл ішоў снег або дождж, прадказвалі ў будучым дзіцяці багацце: *«Як едуць хрысціць і дождж – ета харашо»* (в. Вялікія Шарыпы Гарацкага р-на). Кумам належала перад дарогай паесці ў хаце бацькоў дзіцяці.

Звычайна ў дзень царкоўнага хрышчэння адзначалі сямейную ўрачыстасць з нагоды нараджэння дзіцяці – хрэсьбіны, якія па-рознаму называлі ў розных мясцовасцях: *крэсьбіны, кресьбіны, хрысціны, хрыстыны, крысціны, крісціны, ксціны, радзіны*. Калі ж хрышчэнне дзіцяці ў сілу абставін здзяйснялася ў хуткім часе пасля яго нараджэння і сям'я не паспявала як след падрыхтавацца, правядзенне хрэсьбін адкладвалася на некалькі дзён або тыдняў.

У той час, як кумы адпраўляліся ў царкву / касцёл, гаспадар пасылаў каго-небудзь запрашаць сваякоў і суседзяў на ўрачыстасць. Існавалі разнастайныя варыянты запрашэння, напрыклад: «Прасілі тата і мама, і я прашу на хрэсьбіны» – заходзячы ў хату, казала дзяўчынка; «Прыходтэ на родыны»; «Прыходзьце на малую / малога на баль». Пакуль кумы былі ў царкве, госці, пераважна сямейныя пары, паступова збіраліся ў хату да бацькоў дзіцяці: *«А як вжэ хрыстылы, на хрыстыны ішлы тоды з мужыкамі. Хліба булку возмэш, тое-другое, пілёнак з полотна тканога занысэш»* (в. Оса Кобрынскага р-на). Без запрашэння на гэтую ўрачыстасць ніхто не прыходзіў. Маладыя хлопцы і дзяўчаты звычайна не ўдзельнічалі ў хрэсьбінах, бо там здараліся жарты і выказванні гуллівага характару, і народная традыцыя тактоўна іх засцерагала ад таго, каб не трапіць у няёмкае становішча.

Усе жанчыны, што ішлі на святкаванне, неслі з сабой прадукты харчавання, якія адрозніваліся прыкметнай аднастайнасцю па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Гэта былі ў першую чаргу хлеб, пірагі, сыр. У Гродзенскай губерні, акрамя таго, кожная запрошаная жанчына несла яшчэ *«гаршчок грэцкай кашы, малако, яечню»*. У Віцебскім павеце хрэсьбіны пачыналіся вечарам. Тут жанчыны неслі з сабой на ўрачыстасць *«бліны, баранкі, булкі, кашу, яечню, варанае мяса»* (Е. Раманаў), мужчыны – абавязкова хлеб. Да сярэдзіны XX ст. звычай несці на хрэсьбіны прадукты харчавання захоўваўся: *«На хрыстыны кампот варылі,*

*штоб там былі сухія грушы і чэрніка сухая обязацельно – такі кампот дзелалі. Раньшэ такія гладышкі былі, ідуць на хрыстыны тыя, несёт кума гладышку, і там грушы тыя і чэрніка, і все ставяць на стол»* (в. Хаціслаў Маларыцкага р-на). Збіраючыся на хрэсьбіны, кожны лічыў сваім абавязкам прыгатаваць і аднесці парадзісе падарунак, часцей за ўсё што-небудзь смачнае з ежы. Найбольш багатыя выпякалі пірагі з пшанічнай мукі, аладкі, хрушчыкі, палівалі гэтыя вырабы растопленым салам або смятанай, складвалі ў міску ці латушку і неслі з сабой: *«Падаркі прыносілі, як раньшэ былі платочкі такія дзяшовенькія, платочак еты прынясець кума. А цяперь жа кума нада багатая. Кума драчону спячэць, пірог такі з мукі, і прынясець, ета як сталі мы жыць багата»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на). Больш бедныя ішлі на хрэсьбіны звычайна з хлебам, пасыпаным соллю (П. Самцэвіч). Запрошаныя мужчыны неслі з сабой грошы для парадзіхі і для павітухі, а найбольш багатыя – яшчэ і гарэлку.

У некаторых вёсках Валожынскага р-на ў дзень хрэсьбін, перад тым як прыходзілі дарослыя госці, гаспадары збіралі малых з усёй вёскі: ад тых, што пачалі ўжо хадзіць, да 6–7-гадовых і частавалі іх кашай або хрушчыкамі, каб, як тут казалі, *«яны наша дзіця ў крапіву не садзілі»*.

Хрэсьбіны ўключалі ў сябе і агульнае частаванне. На стол падавалі стравы, прыгатаваныя гаспадыняй і прынесеныя гасцямі: *«Ксціны гулялі, самі ўсё дзелалі і кашу варылі, і бліны, і халадзец, а тады завем гуляць»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на). Як засведчыў П. В. Шэйн, у XIX ст. звычайнымі стравамі на хрэсьбінах з'яўляліся: квас (кіслы суп з пара-



*Хрэсьбіннае застолле. Фотаздымак Т. Кухаронак*

сём), млінцы, узвар (мястэчка Ельск). У Быхаўскім павеце падавалі *«мяса, аладкі, рэзнікі, а затым боршч, крупень і іншыя вараныя стравы»* (Е. Раманаў). У Лепельскім павеце колькасць страў, паводле народнага меркавання, павінна была быць няцотнай: 3, 5, 7 і г. д. *«Першай падавалі на стол поліўку, потым лапшу густую ці бабку, затым халадзец, тушаную бульбу з мясам, апошняй жа – кашу ячную ці грэцкую з маслам...»* У іншых месцах Віцебскай губерні на хрэсьбінах ставілі на сталы яшчэ *«пірог пшанічны, халоднае мяса, каўбасы, кашу з ячменных круп і юшку з гусіным ці цялячым тлушчам...»*. Да сярэдзіны XX ст. закускі ў час хрэсьбін заставаліся ў асноўным традыцыйнымі: *«На стол сала понаразаюць, колбаскі, як у нас кажуць, пальцам пханая, каша, боршч. Пірагі обязацельно пекуць на хрысціны, пырогы с шаблямі, як тут кажуць. Шаблі – эта фасоль, картошка. Пірагі пяклі такія бальшыя. Навараць картошкі, фасолі, натаўкуць вмесце, вмесце зажаруюць і запраўляюць салам, лукам і тады такія камкі скатываюць – і в печку. І такія пірагі абязацельна далжны быць на хрысцінах»* (в. Хаціслаў Маларыцкага р-на).

Хросных бацькоў разам з дзіцем, што вярталіся з царквы / касцёла, на ганку сустракалі родныя бацькі і госці. Усе прысутныя ўставалі, калі кумы з дзіцём вярталіся з царквы / касцёла, каб дзіця не стала «седуном» (М. Нікіфароўскі). Бабка-павітуха была апранута ў вывернуты поўсцю наверх кажух, каб дзіця не баялася сурокаў. Кум адразу аддаваў дзіця бабцы, а тая клала яго на ложак. У другіх вёсках быў другі звычай: кума клала немаўля на некалькі хвілін у падпечак, што, як лічылі, спрыяла спакойнаму, добраму сну дзіцяці, і толькі затым аддавала яго маці. Іншым разам хросныя аддавалі дзіця родным бацьку або маці са словамі: «На табе тваё ражонае, а наша хрышчонае» або: "Дай Бог твайму сыну (дачцэ) стаяць так пад вянцом, як пад хрэстом". Прыняўшы дзіця, бацька перадаваў яго маці. Сярод мясцовых беларусаў-католікаў у Віцебскай губерні бытаваў наступны звычай: калі вярталіся з касцёла, кумы перадавалі дзіця бацьку, які ў сваю чаргу клаў яго на некалькі хвілін на ганак, што называлася *«асвяціць дзіця праз парог»* (А. Кіркор). Лічылася, каб дзіця пачало своечасова хутка і выразна гаварыць, хросныя бацькі павінны былі, пераступіўшы ганак хаты, хутка назваць імя дзіцяці, якое яму далі пры хрышчэнні; калі яны пры гэтым запнуцца – дзіця будзе заікацца (М. Нікіфароўскі ).

Калі збіраліся ўсе госці, гаспадар запрашаў грамаду за стол. Спецыяльнага абраду, які б распачынаў хрэсьбінную ўрачыстасць, на большай частцы тэрыторыі Беларусі не існавала. На Палессі ж і ў некаторых раёнах Паазер'я хрэсьбіны пачыналіся з абраду «перапівання кумоў»:

гаспадар выпіваў чарку, клаў туды грошы і напоўненую перадаваў куму. Той рабіў тое ж самае і перадаваў чарку са сваімі дарамі гаспадару. У іншых месцах Беларусі, каб пачаць хрэсьбіннае застолле, некалькі прывітальных слоў гаварыў кум: «Як мы відзелі (імя дзіцяці) пад храстом, штоб так відзелі пад вянцом, штоб ён добра пахаў ды добра малаціў», а затым звяртаўся да бацькоў: «Дай Бог вам і налета гэта». Маглі пачацца хрэсьбіны і якім-небудзь жартам. Напрыклад, гаспадар, падняўшы першую чарку, звяртаўся да бабкі: «Будзем жывы і здаровы, бабуля!», на што тая адказвала: «Сахарам на душу, галубок». На хрэсьбінах «бацька парадзіхі ці другі блізкі кроўны сваяк дарыў нованароджанага вуллямі, пчоламі, мёдам» (К. Машынскі).

Па традыцыі самыя ганаровыя месцы за сталом належалі кумам і бабцы-павітусе. Кумы, седзячы за бяседным сталом, прытрымліваліся пэўных правілаў паводзін. Так, на Палессі яны садзіліся блізка адзін да аднаго, каб у дзіцяці выраслі густыя зубы і каб яно жыло ўсё жыццё з людзьмі ў згодзе (А. Сержпутоўскі). Таксама кумам раілі паболей гаварыць, жартаваць на хрэсьбінах, каб іх хроснік (хросніца) рос гаваркім, ветлівым, прыязным да людзей. З мэтай жа засцерагчы дзіця ў будучым дарослым жыцці ад п'янства, кумы самі не павінны былі напівацца, а выпіць толькі цотны лік чарак (часцей за ўсё дзве), каб іх хроснік жыў у пары.

У беларусаў Смаленскай губерні дзеці ў час хрэсьбін падыходзілі пад акно хаты з пеўнем, калі нованароджаным быў хлопчык, і з курыцай – калі нарадзілася дзяўчынка, і драпалі лапкай птушкі па шкле да таго часу, пакуль не атрымлівалі кавалак пірага або кашы.

Спецыяльнай абрадавай стравай на хрэсьбінах з'яўлялася бабіна каша, якую ў большасці раёнаў Беларусі гатавала хросная бабка ці бабка-павітуха, толькі ў Заходнім Палессі сама парадзіха ці яе маці: *«А кашу всегда варыць хазяйка ці маці ее, маці радзіхі»* (в. Хаціслаў Маларыцкага р-на). Звычайна для прыгатавання абрадавай стравы куплялі новы гліняны гаршчок, прыкладнай ёмістасцю 1 ці 1,5 л: *«Гаршок новы абізацельна баба брала для кашы. Гаршкі былі после вайны гліняныя, латушкі зваліся»* (в. Валёўка Дубровенскага р-на). Часцей за ўсё гэта была прасяная, пярловая, ячная, пшанічная, грэцкая, рысавая каша, якую варылі ўкрутую з вялікай колькасцю малака, масла, дадавалі мёд або цукар: *«Як ужо кресьбіны былі, бабіну кашу варілі. Каша ета крупяная, асобенна пярловая ці ячмень, абтоўчаны ў ступе. Ці быў тады рыс, ці была тая гречка?»* (в. Ляды Дубровенскага р-на); *«Кашу с пшана варілі – туда і масла лажылі, і мёд»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«На крестіны кашу варылі с па(-у)шаніцы, салодкую»*

(в. Валёўка Дубровенскага р-на); *«На хрэсьбіны кашу варілі нармальную: ці з рыса, ці с пшана, ці са сваіх круп, пярлоўку дажа варілі»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на). Але нездарма ж кажуць: «Што край – то абычай». Так і з бабінай кашай: гэта магла быць і яечня, прыгатаваная ў вялікай місцы і ўпрыгожаная зверху абаранкамі; любая выпечка з мукі, нават у выглядзе "курыцы с куранятамі", піражкі з прасяной кашы: *«На хрэсьбіны бабіна каша: пякла такі пірог круглы як торт, ня з круп, не, з мукі»* (в. Бялькоўшчына Верхнядзвінскага р-на); *«Баба, катора пуп атразаіць, пячэць кашу – эта такія сухары. Такія сухарыкі – накруціць, нарэжаць. Місу напячэць і закрыіць, завяжаць»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«На хрэсьбіны варылі кашу – яіц наб'ець і ў печ»* (в. Дзяньгубы Лепельскага р-на); *«Бабіна каша – эта не каша, а проста там пячэнне, канфеты. А раньшы каша с крупы, пярлоўкі. Эта цяпер культурнейшая каша»* (в. Трасцянка Талачынскага р-на); *«На хрэсьбінах баба далжна кашу мець – купляіць канфеты, пячэнне бальшую міску. Ета яе каша і за ету кашу ёй аплачвалі»* (в. Маскаляняты Гарадоцкага р-на). У некаторых вёсках на ўсходзе Беларусі лічылася неабходным прыгатаваць на хрэсьбіны тры кашы: ад бабкі, кума і кумы. А дзе-нідзе, акрамя крупяной кашы, яшчэ варылі сапраўдную курыцу. Прышоўшы ў госці, бабка ставіла прыгатаваную кашу ў камору на паліцу.

Кашу ўпрыгожвалі папяровымі або жывымі кветкамі, каснікамі, цукеркамі, на Магілёўшчыне яшчэ і галінкамі дрэў: каліны, рабіны, вішні – для дзяўчынкі, клёна, дуба – для хлопчыка. Але незалежна ад таго, як бабіна каша была прыгатавана, яна паўсюдна на Беларусі падавалася ў канцы хрэсьбіннага застолля, і яе падзел з'яўляўся кульмінацыйным момантам урачыстасці, без якога прысутныя не ўяўлялі сабе гэтага святкавання.

Усе, хто ішоў на хрэсьбіны, акрамя хіба што тых, хто жыў у Заходнім Палессі, добра ведалі аб абрадзе разбівання гаршка з кашай, з якім у народнай свядомасці звязваліся шматлікія ўяўленні магічнага характару. Паводле Е. Р. Раманава ў XIX ст.: *«У канцы абеду падае сваю крута звараную з грэцкіх круп кашу бабка. Яна ставіць яе на стол з пажаданнем: "Дай жа, Божа, каб у етым домі было шмат дзетак на вару (у хляву) і ўсякага дабра гэтаму двару!" Гаршчок баба перадае куму. Кум бярэ з яго тры лыжкі кашы, кладзе на талерку, яшчэ гарэлку, грошы і нясе парадзісе. Яна яму дае кавалак палатна. Вярнуўшыся, кум бярэ гаршчок і крычыць: "Ай, гаряча! Ай, гаряча!" І пры гэтым як бы незнарок упускае гаршчок на стол так моцна, што ён разбіваецца. Бабка прыбірае чарапкі, а звараная каша стаіць і не развальваецца. Гэта лічыцца добрым знакам: дзіця будзе жыць доўга і ў багацці.*

*Калі каша развальваецца, то дзіця доўга не пражыве. Бабка кладзе кашу на чарапкі і раздае ўсім: “На-тка, бабінай кашы! Паглядзім на рублікі вашы! Гарэлачку выпі, кашай заясі, тарэлачку пазалаці!”»* (в. Аслянка Мсціслаўскага павета).

У Віцебскай губерні, пакуль павітуха ставіла на стол бабіну кашу, прапануючы гасцям выкупіць яе, хто-небудзь з дзяцей хапаў кашу са стала і хутка бег з ёю на двор, што нібыта садзейнічала таму, каб дзіця, як вырасце, хутка бегала. Дзяцей угаворвалі, давалі ім крыху грошай ці іншыя падарункі, пасля чаго яны вярталі кашу.

Паміж бабкай і кумам адбываліся разнастайныя жартоўныя дыялогі, разыгрываліся цэлыя імправізаваныя сцэнкі, у якіх адбіўся невычарпальны народны гумар. Вось некаторыя з іх: «*Пасля таго як бабка паставіць кашу на стол, разыгрываўся “шпіктакль”. Кум: “Адкуль прыйшла?” Бабка: “Пусціце нанач”. Кум: “Вашы дакументы”? Бабка працягвала палатно (гэта дакументы), станавілася на лаву, абгортвалася ім і казала: “Вось мае дакументы”. Кум браў, чытаў, пытаўся: “Пусціць старуху нанач?” Усе госці адказвалі: “Раз дакументы харошыя, пусціць нанач. Старуха харошая”. Пасля гэтага бабка садзілася за стол*» (Радзінная паэзія, с. 642–643). Або яшчэ: «Кум (*няўдала кідаючы гаршчок*): “Ой, баба, які гаршчок крэпкі ў ганчара выбрала. Б'ю, б'ю, ніяк разбіць не магу”. Бабка: “Ну, кумок, у другі раз як пайду, дык не буду браць такога крэпкага. Ужэ прыстаўлю дзіравы, абы кашу зварыць”. Кум (*б'е ціхенька гаршчок у другі раз*): “Ай, баба, ці не зялезны твой гаршчок? Ніяк не разаб'еш”. Баба: “Ну-тка, бі, бі! Відна, кумок мала еў”. Кум за трэцім разам разбівае гаршчок. Бабка збірала чарапкі і прыгаворвала: “На каго каша нахінецца, таму кварту купляць”. Госць, у бок якога нахілялася каша, адказваў бабцы: “А табе штонядзелі быць у етым дзелі”» (Е. Раманаў).

Бабіна каша і сама бабка на хрэсьбінах былі ў цэнтры ўвагі, вакол іх разгортваліся жарты, гульнёвыя сцэнкі, пастаянна гучаў смех. Бывала, акрамя кума і бабы, да гульні падключаўся вясёлы і вынаходлівы госць. Ён, напрыклад, мог правесці торг за кашу, расхвальваючы яе на ўсе лады. Тады з хусткі рабілі звязак, які ставілі на кашу, туды госці кідалі грошы. Па ўмовах гульні каша заставалася таму, хто апошні пакладзе ў звязак манету. Па гэтай прычыне кожны імкнуўся не купляць кашу напачатку, каб прымаць удзел да канца. А «прадавец» без перапынку выклікаў «пакупнікоў», на ўсялякі манер расхвальваў свой тавар: «Харошая, смачная каша, перапечкі, хрушчыкі, цукрам пасыпаная, есці да аблізвацца. Хто купляе?» Торг цягнуўся даволі доўга, бо кожны з гасцей назапасіў капеек. Жанчыны, праўда, амаль не ўдзель-

нічалі ў згаданым абрадзе. Калі хто-небудзь падыходзіў і клаў манету, «прадавец» гучна аб'яўляў: «Каша застаецца за Рыгорам. Хто дае больш? Раз, два, тры». Калі да ліку «тры» хто-небудзь іншы паспяваў кінуць капейкі, торг пачынаўся зноў. Часцей за ўсё каша заставалася за кумам, які па традыцыі павінен быў зрабіць большы падарунак (П. Самцэвіч). Пра гэта і прыказка сведчыць: «Гнісь, кум, не гнісь, да каля кішэні павярнісь».

Нават у самых апошніх экспедыцыях інфарманты пастаянна вельмі падрабязна расказваюць пра святкаванне хрэсьбін і абрады з бабінай кашай: *«Усе ложаць і ложаць грошы: "Маё вышша". Вы, напрымер, ложыце грошы і: "Маё выша". Якія ж тады грошы? – Пяць, дзесяць, дваццаць капеек. А кум: "Маё выша". А яму нада было многа грошай, намяняя мелачы, штоб усех перябіць. Тады ўсе: "Кумава каша, кумава каша". Кум жа кашу біў"»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«І сейчас хресьбіны ў нас так гуляюць, усё як нада: і кашу варюць, хуваюць, шукаюць, то петуха паднясуць, то бульбіну ўсунуць у гаршок, бабу дражняць. Баба атнекваецца: "Не мая каша, не мая каша". А бывае і ашыбнецца: "Мая, мая" – глядзяць, кура паляцела, выскачыла і паляцела. Смяёмся, на то ж і сабіраешся, штоб павесяліцца. Проста так сядзіш і дражніш бабу: "Ай, баба кашу не таўкла, нічога не дзелала яна. – Не, таўкла, таўкла, шукайце харашо, каша есць, шукайце". І тады ўжо шукаюць эту кашу. Паднашуюць: "Твая, баба, каша? – Не, не, не мая". Другі раз этыя, што паднашуюць, і пераадзяюцца, другі раз – і не. У цыганку пераадзяюцца, у цыгана, панамазваюцца, павымажуцца, то бураком панакрашуюцца, мама родная! Хресьбіны ў нас весела гуляюць. А еслі яшчэ гармонь – с ума сходзяць ат гармоні! А счас пад касеты этыя танцуюць»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на); *«Гулялі, дай кашу б'юць: хто грошай паложыць рубля, тры ці пяць – гаршка б'е. "Благаславі ацец і маці, хто есць у хаці, кашу біці". А мы ўжо сядзімо на печы, глядзім: дадуць ужо той кашы ці не дадуць»* (в. Церабаў Петрыкаўскага р-на).

Госці, удзельнікі святкавання, спрабавалі ўкрасці кашу, а бабка – уратаваць яе. Для гэтага яна наймала «міліцыю» – двух ці трох рослых мужчын, якія бралі ў рукі чапялу, палкі і ішлі ў камору сцерагчы кашу. А ў гэты час найбольш вясёлыя госці, часам пераапранутыя ў цыганоў, доктара, афіцэра, мужчыны – у жаночае адзенне і наадварот, так званыя *задзеланыя*, *ражаныя*, "*цыгане*" спачатку клалі ў гаршчок ката, гарбуз, бульбіну, качан капусты і настойліва прапаноўвалі куму купіць такую «кашу»: «Наша каша з-за граніцы, выкупляй, кум, не скупісь». *«Гулялі: то курей бяруць у гаршок, нясуць к сталу, пытаюцца ў бабы*



*«Цыгане» на хрэсьбінах у в. Вялікая Касіна. Віленскі р-н. 1970 гг. Фотаздымак Ю. Внуковіча*

*“Твая каша?” – “Не, не мая”. Этыя, што неслі петуха, пераадзяваліся ў цыгане там, такое. Тады ўжо кашу няслі, паднімалі і малага паднімалі. Хто грошай паложыць болей – той і разбіваў гаршок»* (в. Буглаі Краснапольскага р-на). Напрыклад, баба, убачыўшы падстаўную кашу, гаварыла: *«“Ета не мая каша, мая прасяная”. А дзед дадаваў: “Я ўжо проса тоўк на кашу, не, не, ета не наша каша”. “Цыганы” ж і “прадаўцы” ўсё роўна на ўсе лады расхвальвалі сваю кашу, называючы яе то “загранічнай”, то “царскай”... Не здавалася і бабка: “Ета каша не мая! Мая ўкусная, мы яе з дзедам усю ноч таўклі”. Калі ж уносілі жывую курыцу, дзед казаў: “Ета не маёй бабы курыца, не, не маёй. Наша рябенькая; за ету плаціць ня буду”»* (в. Старая Каменка Слаўгарадскага р-на).

Дыялог працягваўся некаторы час, *«задзеланыя»* ўсё чапляліся да кума, абзывалі яго «скупярдзяем», прасілі больш грошай і толькі пасля ўносілі гаршчок з сапраўднай бабінай кашай. Гэта заўсёды была імправізацыя, праўда, вытрыманая ў традыцыі: *«Бабіну кашу шукалі, а яна возме ды схувае. Дак мяне яшчэ надзенуць у парваную кухвайку якую, горб сдзелаюць, сажай вымажуць. Я тады палезу пад стол, яны сядзяць, а я кашу там шукаю. І мужыкі лазілі шукалі, баб за ногі лапалі. Шукаюць і не находзяць. Баба атдаець кашу. У яе купляюць, кум біў гаршчочак і раздаваў кашу»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на).

Асабліва на Магілёўшчыне былі пашыраны разнастайныя жартоўныя сцэнкі, звязаныя з бабінай кашай: *«Кашу баба варіць, кашу пріносіць і куды схаваець. Тут п’юць-гуляюць. – “Дзе бабіна каша? Дзе бабіна каша?” Баба дастаець гарелку, такім маладзіцам разьбітным – пашлі шукаць кашу. – “Баба. Ці твая каша? – Не, эта нейкая жывая”.*

*Кот! Так, яшчэ пашлі. Эта нешта ня то. Пятух. Яшчэ. "А-а, вот эта каша мая". Наліла па чарке ім. Ставюць кашу на стол. Кума бярэць, раньшы шырінкі былі, накріваець кашу платочкам. Кум паглядзеў, які эта платочак, сколькі грошай нада даць. Куму шутку якую, каб кашу не пабіў: як трэці раз апускаець – яму ці тряпку якую* <падложаць>, *ці кусок хлеба, каб кашу не пабіў»* (в. Канічы Касцюковіцкага р-на).

Нарэшце «цыгане», атрымаўшы ад бабкі грошы, або сама бабка ўносілі і ўрачыста ставілі на стол, на разасланы ручнік гаршчок з сапраўднай бабінай кашай. У некаторых вёсках кашу разам з бабкай прыносіў на руках адзін з «міліцыянераў», што ахоўваў яе. Бабка ставіла кашу на стол і прыгаворвала: *«Я варыла кашу з лімонцамі, а вы – з чырвонцамі»* (в. Хутар Быхаўскага р-на); *«Мая каша з канапелькамі, а вы, госцейкі, с капейкамі»* (в. Мокравічы Бялыніцкага р-на). Сустракаліся бабкі – сапраўдныя акцёркі: *«У маёй кашы з сямі палёў пшаніца, ад сямі кароў масліца. Я яе доўга сюды несла: і на самалёці везла, і на параходзі, і на кані, і пешшу ішла аж дзесяць кіламетраў. Нават чаравікі парвала. А госці крычалі: "Пакажы, бабка, нагу!" У адказ бабка паказвала босую нагу. Госці крычалі яшчэ мацней: "Вышэй пакажы нагу! Яшчэ вышэй!" У гэты час мужчыны, якіх тут называюць "рысакамі", спрабуюць вырваць з рук бабкі кашу. Яна і за імі сачыла, і нагу падымала, каб госці бачылі яе босую, і перамовы вяла»* (в. Варатынь Бабруйскага р-на). У Мсціслаўскім р-не «цыганы», акрамя кашы, уносілі і прыгатаваную бабкай курыцу, павязаўшы ёй на шыю банцік. Дзед плаціў ім грошы і казаў: *«Во за ету заплачу і ўжо бабіну курачку з рук ня выпушчу»*. У в. Бяседавічы Хоцімскага р-на несці гаршчок з кашай нанімалі мужчыну, і ён, спатыкнуўшыся знарок па дарозе два разы, за трэцім разам падносіў кашу і грошы парадзісе, якая сядзела разам з мужам каля люлькі, і частаваў іх. Пасля нёс кашу да стала і аддаваў яе куму, а той разбіваў гаршчок. Але перад гэтым кашу імкнуліся ўкрасці прысутныя жанчыны.

На Віцебшчыне, каб выклікаць бабку, госці спявалі:

А ты, бабка, шавяліся,
Ды на кашу не скупіся.
Ні хавай ты пад палу,
А давай яе к сталу

(в. Вялікае Жэжліна Лепельскага р-на).

У Шчучынскім р-не, пакуль не дзялілі кашу (яечню, упрыгожаную вялікімі папяровымі кветкамі), хто-небудзь з гасцей пераапранаўся ў старое адзенне, браў сякеру і рашуча накіроўваўся да яе – *«лес сячы на кашы»*. У Мядзельскім р-не на хрэсьбіны ў час падзелу бабінай кашы

прыходзіў пераапрануты персанаж «бусел» (чалавек у вывернутым кажуху, зверху звязаныя рукавы нагадвалі дзюбу птушкі). Ён віншаваў бацькоў з нараджэннем дзіцяці, прыносіў ляльку (другое дзіця) і казаў, звяртаючыся да іх: «Калі добра будзеце прасіць, дык я іх (дзяцей) буду насіць, насіць і насіць».

Паводле няпісаных вясковых правілаў выкупіць гаршчок з кашай і разбіць яго павінен быў абавязкова кум: *«Гулялі крезьбіны, кашу варілі, кум разьбіваў махотачку эту і па кусочку ўсім дзялілі»* (г. п. Хоцімск); *«На кашу ж доряць, і самы бальшы падарак должан падаріць кум. Ён ложыць падарак наверх, а патом эту кашу б'ець»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на); *«Баба кашу варыць, паб'юць кашу, у гаршку гліняным паб'юць. Хто больш грошай паложыць – той і б'е кашу, кум найчасцей»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на).

Калі ж здаралася, што выкупляў кашу нехта іншы, гэта лічылася вялікай ганьбай для кума, і яго больш не запрашалі на такую ганаровую ролю. Мужчыны, ведаючы традыцыю, імкнуліся падражніць кума, кладучы пасля яго яшчэ больш грошай («набівалі кума»). Кум кожны раз клаў большую купюру, так што сума атрымлівалася немалая. Нарэшце, пасля працяглага «торгу», кум атрымліваў у сваю ўласнасць гаршчок з кашай і заяўляў: *«"Я купіў кашу! Будзем біць?" Госці крычалі: "Бі кашу, паглядзім, што там унутры". Кум два разы ціхенька стукаў гаршчок аб вугал стала і толькі на трэці раз разбіваў яго, прыгаворваючы: "За первым разам – добрым часам, за другім разам – добрым часам, за трэццім разам – добрым часам!" Або: "Б'ю кашу за трэццім разам!»* (в. Ліпаўка Хоцімскага р-на); *«Як ужо кресьбіны былі, бабіну кашу варілі. Гаршок разбівалі аб вугал стала, кум абычна разбіваў. Ніхто яе не дзяліў, кушалі ўсе ложкамі, черпалі і кушалі»* (в. Ляды Дубровенскага р-на).

Разбіць гаршчок з кашай правільна – вялікае майстэрства, бо каша павінна была застацца цэлай, а не рассыпацца – тады ў дзіцяці будзе шчаслівы лёс, добрае здароўе: *«Як опытны кум, ён знаець, б'ець аб вугалок і бачком. У гаршчка дно крепкае. Ну, каша крепкая, харошая – будзець здаровы рябёнак»* (в. Канічы Касцюковіцкага р-на); *«Кашу бабіну як разаб'юць, яна далжна стаяць – тады харашая жізнь рябёнку. А як упадзець – тады плоха. Бабка як гатовіць кашу, нада вынуць яе і быстренька ў ваду халодную пастаў. Тады разабьець кум – яна і стаіць»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«Кашу білі, б'юць пряма на стале. А тады ўжо ўхітріліся, варілі ў чом-нібудзь, каб яна не сразу разбілася. Інціресна гуляць было»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на). Верагодна, адсюль узнікла і прымаўка: «Не разбіўшы гаршочка, не будзем есці кашкі».

Кум рабіў і іншы неабходныя і патрэбныя на хрэсьбінах, з пункту гледжання носьбітаў традыцый, рэчы: *«Як толькі біць кашу, кум трі ложкі сьверьху снімаў, там жа яшчэ канфеткі сьверьху ложаць, такія абвязвалі на нітачку. І тыя канфетачкі, і кашу перядавалі парадзісе»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на). У той час, калі разбівалі гаршчок з кашай, хто-небудзь з мужчын падносіў дзіця да стала: *«Хто-та, мужчына, пріносіць младзенца, трі разы падымаець, штоб бальшы рос»* (в. Канічы Касцюковіцкага р-на); *«Вот яшчэ што, када кашу кум біў і* <гаварыў>*: "Маё выша", хто-та прінасіў дзіцёнка і падымаў – "Маё выша". Перад цем, як біць кашу, маленькага вынасілі падымалі, каб бальшы рос»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на). Кум разбіваў гаршчок, а бабка пры гэтым прыгаворвала: *«Скольկі будзя чаряпочкаў – столькі будзя дзяцёначкаў»* (в. Рубанаўка Мсціслаўскага р-на). Пасля лічылі чарапкі і па іх колькасці прадказвалі, колькі дзяцей яшчэ будзе ў гэтай сям'і.

Наогул, чарапкі ад гаршка з бабінай кашай, паводле народных вераванняў, валодалі незвычайнымі магічнымі ўласцівасцямі: *«А ету кашу тады зьедалі, а етыя чяряпкі хлапцам да мужыкам надзявалі на галаву, штоб радзіла жонка. Толькі мужыкам!»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«І таго шчэ гаршка чарапкі на галаву адно аднаму клалі, каб дзеці разводзіліся. Хоць і е дзеці, усё раўно кладуць, каб шчэ дзеці былі»* (в. Церабаў Петрыкаўскага р-на). У в. Варатынь Бабруйскага р-на чарапкі хапалі госці і клалі свайму суседу на галаву, пры гэтым прыгаворваючы: *«На табе чарапочак, каб у цябе праз год быў сыночак»*. Тыя з гасцей, што мелі ўжо па некалькі дзяцей, уціскалі галаву ў плечы – не хацелі ўжо болей дзяцей. Тут госці пачыналі бегаць адзін за адным і класці чарапкі на галаву. Панавала сапраўдная весялосць. Ва Усходнім Палессі жанчыны – удзельніцы хрэсьбін кідалі адна ў адну чарапкамі ад разбітага гаршка ці клалі іх на галаву бяздзетных жанчын і пры гэтым выказвалі пажаданне: *«На табе, каб і ў цябе праз год была каша»*.

Выкарыстоўвалі чарапкі і ў гаспадарчых мэтах: *«А тыя чаряпкі хватаюць, хто скарей схваціць. Як с хресьбін ідуць, так кідаюць у сьвінушнік, штоб сьвіньні вяліся»* (в. Канічы Касцюковіцкага р-на); *«І помню бабы бралі этыя шкаропачкі ад гаршка і неслі дамой, штоб скот вёўся»* (в. Бугаі Краснапольскага р-на); *«Чарапочкі бралі сабе і ў сарай кідалі, штоб прыплод быў у каровы, у свіней»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на).

Лекавальнымі ўласцівасцямі валодалі, паводле вераванняў, і рэшткі бабінай кашы: *«Калі хрезьбіны, бабка кашу варіць і пріносяя. Разьбівалі на стале, кум разьбіваў, тады бяруць крошкі тыя, ат кашы, штоб зубы не балелі»* (в. Мышавое Касцюковіцкага р-на).

У некаторых раёнах Магілёўшчыны, паставіўшы кашу на стол, бабка зрывала ці збірала шапкі ў мужчын, і яны павінны былі іх выкупіць. Гэтыя грошы павітуха аддавала парадзісе: *«Грошы зьбіралі абычна бабцы, тая сколькі сабе возьме і дае рожаніцы»* (в. Баркалабава Быхаўскага р-на). Па іншым сцэнары бабка, аддаўшы падарункі, станавілася перад абразамі на калені і малілася: *«Госпадзі, падай маёй унучачцы яшчэ штук пяць унучкаў ці ўнучак. Сколькі ў етай хаці шчэлачык, каб столькі было дзевачык, а сколькі сучкоў, каб столькі было сынкоў". У той час, як баба малілася, хто-небудзь з гасцей падліваў пад яе ваду і казаў: "Ай, баба старая абмачылася". Усе на яе валіліся, а дзед абараняў: "Баба мне яшчэ патрэбна, ня трогыйця яе, за бабу я гарой!"»* (в. Сялец Мсціслаўскага р-на).

У час падзелу бабінай кашы выконваліся і абрадавыя дзеянні, закліка얼ныя паспрыяць хуткаму фізічнаму і разумоваму развіццю дзіцяці. Так, у Мінскай губерні, пасля таго як кум разбіваў гаршчок з кашай і яна распаўзалася па стале, госці спяшаліся з'есці кашу, каб дзіця хутчэй пачало хадзіць і гаварыць.

Па традыцыі за атрыманую бабіну кашу госці абавязаны былі заплаціць / адарыць наўзамен: *«Бабка Лукер'я сядзіць у шубе, у кажуху навыварат на куце, на галаве чапец – і кашу прадавала. Да, і пячэнне і канфет туды і пірог такі спічэць – тады на эту тарэлку. А скока там народу прыглашона – далжны плаціць этай бабе. Тады яна раскрываець тарэлку і эту бабскую кашу ядуць»* (в. Маскаляняты Гарадоцкага р-на); *«Дзеляць ужо ўсім па сталах кашу. Грошы клалі, а хто што: мацяр'ял клалі, адзіяльца паложыць – хто што маў»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на); *"Ксціны гулялі, баба кашу пріносіць, кашу білі, кум біў. Кашу прадавала бабка, капейкі ёй давалі»* (в. Сава Горацкага р-на); *«Баба насіла кашу кала столу, дзе госці. Бярэш этай кашы і плоціш – эта бабуліны зарабаткі»* (в. Трасцянка Талачынскага р-на); *«Баба сухары свае, кашу прыносіць на стол ужо ў канцы гулянкі. Платочак на яе паложаць. А тады платок збоку кладзець. І на яго кладуць падаркі, а яна сухаркоў раздаець. Прыглашаець: "Складайце ўжо ўсе на мыла, дзяцёнка купаць". Баба тады платок увяжаць і радзесе аддаець"»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«Баба ходзіць с тарэлкай і сабіраіць на мыла: "Ой, на мыльца грошы дай, мой унучак хочаць беленька хадзіць". Бадэкаіць адно за адным»* (в. Дзяньгубы Лепельскага р-на); *«Бабка варіла кашу, як кресбіны. Гаршок кум разбіваў. Бабулька ідзець, а мы грошы кладзём на ету кашу. Еслі бабка вясёлая, што-небудзь скажэць, каб рос, каб шчасліў быў»* (в. Паршына Горацкага р-на).

Гэты намёк, часта ў гумарыстычнай форме, утрымліваўся ў зваротах павітухі ці кума да гасцей. Напрыклад, у Барысаўскім р-не павітуха,

паставіўшы кашу на стол, звярталася да гасцей: *«Да гэтага вы, дарагія госцікі, пілі-елі бясплатна, без грошай, а цяпер кашу будзе есці тэй, хто адкупя яе!»* (П. Самцэвіч). У Бялыніцкім р-не бабка ўносіла сваю кашу з наступнай прыгаворкай:

Я баба Ярохава,
Мая каша гарохава,
У маёй кашы бублікі,
А вы, мужчынкі, кладзіце па рубліку.

Матыў неабходнасці збору грошай на кашу мог гучаць і ў песні:

*Ой, чыя то каша не гарожана,*
*Срэбрам-золатам не абложана?*
*Трэба тую дыру загарадзіці.*
*Срэбрам-золатам тай аблажыці.*

* * *

*Ой ты, Ванька, дзельца знай, дзельца знай,*
*А на мыла рубля дай, рубля дай.*
*Ой, ня маеш рубля даць, хоць капеечак пяць.*
*Ў нас радзілась паненка,*
*Хочыць мыцца бяленька*
(в. Судзілавічы Ушацкага р-на).

Пасля таго як кум разбіваў гаршчок, бабка або кума рэзалі кашу на кавалкі і раздавалі ўсім гасцям: *«Бабуля кашу раздавала: "Ну-ка, ешця, кумаву кашу, куміну кашу, бабуліну кашу". Давалі грошы»* (в. Валёўка Дубровенскага р-на); *«Режаць кашу па-трошкі.* <Кажа>: *"Бабіна каша з канапелькамі, а вы, дзядзечкі, з капейкамі". Усе младзенцу ложуць капейкі»* (в. Канічы Касцюковіцкага р-на); *«Тады ўжо з етай кашай ходзюць угашчаюць усіх: калі ўжо ўгасцілі -- заплаці за кашу. Ну, й плацілі мы»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на); *«Парэжуць па кусочку, прадаюць, сама баба прадавала»* (в. Бялькоўшчына Верхнядзвінскага р-на). У некаторых вёсках кума пераапраналася «ў цырульніка», брала нож ці трэску і прапаноўвала гасцям-мужчынам «пабрыць» іх. Тыя адкупліваліся, давалі ёй грошы, а кума пасля аддавала іх парадзісе.

Госці прымалі кашу ў рукі, пакрытыя хусцінкай ці насовачкай, з'ядалі крыху і пачыналі хваліць: «Ой, смачная бабіна каша!» З асаблівай нецярплівасцю чакалі падзелу бабінай кашы дзеці: *«Помню ў дзетстве гаршок эты разбівалі, а мы малыя пад сталы -- і хваталі там кашу»* (в. Буглаі Краснапольскага р-на). У Слаўгарадскім і Мсціслаўскім р-нах пасля кашы паміж усімі гасцямі дзялілі яшчэ і «курыцу». Госці спачатку як бы не хацелі яе браць і гаварылі: *«Ай, баба, голая твая курыца»,*

*«няўкусная, крывая, не хачу яе»*. Пасля, аднак, бралі і елі. Падарункі для дзіцяці, частку грошай, сабраных ад гасцей, баба аддавала парадзісе, частку – забірала сабе.

Бацьку дзіцяці таксама надавалі ўвагу на хрэсьбінах. Пад канец урачыстасці разам з кашай для гасцей для яго падавалася лыжка моцна падсоленай кашы. Ён з'ядаў яе і клаў грошы на талерку (Полацкі павет, Віцебская губерня). А ў іншых вёсках гатаваўся для бацькі спецыяльны «хрысцінны збіцень»: сумесь рэдзькі, мёду, хрэну, солі, гарэлкі і г. д. Як патрабаваў этыкет, радасны бацька павінен быў яго праглынуць, сказаць яшчэ які-небудзь жарт і пакласці на талерку грошы. Часта, з'еўшы такую «страву», бацька высока, аж да столі, падскокваў і выкрыкваў: *«Так расці і прыгай, маё ражонае дзіцятка»*. У гэты час жанчыны спявалі песню накшталт наступнай:

*Да спасіба кавалю,*
*Што ўстроіў нам гульню.*
*Малаточкам ня стукаў,*
*І ў ручанькі ня хукаў.*
*Толькі жоначку патрос,*
*Нам гарэлачкі прынёс*

(Радзіны: Абрад. Песні. С. 222).

На хрэсьбінах выконваліся разнастайныя абрадавыя гульні. Папулярнай у мінулым сярод гасцей была гульня – «падстаўныя роды»: адна з жанчын разыгрывала ролю парадзіхі, клалася на лаўку, прывязаўшы да жывата падушку, стагнала, крычала, другая – бабкі-павітухі, якая прымала роды. Бабка-павітуха падыходзіла да яе і пыталася: *«"Што з табой? – "Ой, радзіць буду"»*. Прыбягала другая жанчына, апранутая доктарам, шчупала жывот: *«Паціша, паціша, скора будзя лёгка, яшчэ мінутачку пацярпіця»*. А парадзіха ўсё стогне. Тут і «роды» адбываюцца, на жывот кладуць ляльку, крычаць: *«Дзіця, дзіця!»* Ляльку спавіваюць у пялюшкі. Доктар кажа: *"Усё, усё, радзіўся ў цябе сынок"*. Парадзіха супакойваецца. Усе яе віншуюць. Потым яна ўстае» (в. Рубанаўка Мсціслаўскага р-на). Лічылася, што такім чынам можна было ўвесці ў зман злыя сілы, каб яны не нанеслі шкоду сапраўднаму дзіцяці.

Усе прысутныя не толькі самі елі бабіну кашу, але абавязкова неслі па кавалачку сваім дзецям як пачастунак і «каб багата жылі»: *«І дамой, канешне, неслі, гаворя: "Бабіна каша", "Бабіна каша". Я помню і мае бацькі хадзілі на крезьбіны к роцсвеннікам і прінасілі нам, да»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«І кашу бралі, і канфеткі бралі, кашу ўкрашалі канфеткамі кругом гаршчочка, дзецям атдавалі»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на).

Калі ў якіх палескіх вёсках не было прынята разбіваць гаршчок з кашай, там кашу раздавала павітуха, госці кідалі грошы ў талерку ці ў калыску дзіцяці: *«Вот поедзят, вып'ют і ставяць пад канец кашу, пшонную, сладкую. І все, хто на хрысцінах, кладуць дзеньгі ребёначку. І патом разыходзяцца»* (в. Хацíслаў Маларыцкага р-на); *«Кашу варылы, грошы клалы, сітца на пілёнку. Просто раздовалы кашу, кашу з'ілі, грошы положылы і конэц»* (в. Оса Кобрынскага р-на). У Столінскім р-не грошы часта наогул не збіралі. У Кобрынскім р-не гаршчок з кашай разбівала сама бабка-павітуха з пажаданнямі: «Каб к нашэй дзеўцы хадзілі кавалерцы» або для хлопчыка: «Каб жаніўся, у пары жыў». Затое на Заходнім Палессі гасцей частавалі вадкай малочнай кашай у самым пачатку хрэсьбіннага застолля. Там, дзе бабінай кашай з'яўлялася яечня, пасля падзелу і з'ядання яе, міску, у якой была абрадавая страва, кум біў аб стол ці кідаў яе на падлогу і таптаў нагамі ці кідаў да ганка, пры гэтым прыгаворваючы: *«Гэта, каб за дзеўку, як яна вырасце, так біліся хлопцы»*. Як бачым, адносна дзяўчынкі асабліва важнае значэнне мелі шлюбная стратэгія і дзетанараджэнне ў шлюбе.

На хрэсьбінах спявалі шмат песень. Яны групуюцца пераважна вакол важнейшых дзеючых асоб сямейнай урачыстасці: саміх яе «віноўнікаў» – бацькоў і дзіцяці, а таксама бабкі, кума і кумы. Ім прысвечаны песні-велічанні, песні-зычэнні, песні апавядальнага характару, застольныя і бяседныя. Большасць беларускіх хрэсьбінных песень пранізаны імкненнем выпрасіць-вымаліць шчаслівую долю дзіцяці ў Бога ці іншых нябесных сіл. Добрую долю немаўляці даюць бабка-павітуха, кум з кумою або просяць яе ў Бога. Сярод розных доляў найбольш важнымі былі тры – «хлебавая», «грашавая» і «вянчальная», што азначала матэрыяльны дабрабыт і сямейнае суладдзе. У песнях згадваюцца таксама долі «збожжавая», «багатырская», «свабодная», «здаравейкая»:

*А ў нядзелечку спараненечку*
*На небе развіднела,*
*Кумочак ходзіць, дзіцяцю носіць.*
*А ў Бога долі просіць:*
*– А дай, Божа, етай дзіцяці*
*Усякую долю ўзяці:*
*І хлебавую, і салявую,*
*Трэцяю – здаравейкаю*

(Радзінная паэзія. С. 127).

Або:

*Арэшанька-чарушанька,*
*Што ж ты рана расцвіла?*
*Маладая ты, Зіначка,*
*Што ж ты рана радзіла?*
*А радзёмшы сына,*
*Ты добрую долю дала,*
*Эх, штоб быў здароў, вялік рос*
*І нам шчасце прынёс*

(Радзінная паэзія. С. 144).

У сучасным побыце асабліва шмат жартоўных песень.

*А бабуля, бабуля,*
*Таўчы-малоць нядужа.*
*Таўчы-малоць нядужа,*
*А на падаркі дасужа.*
*Таўчы-малоць – дык няма,*
*Па падаркі – дык сама.*

(в. Слабодка Клічаўскага р-на).

* * *

*Наша бабка падпіла*
*І пад прыпячак лягла.*
*А мышы пашалелі*
*І бабе дырачку праелі*

(в. Малыя Бортнікі Бабруйскага р-на).

* * *

*Ай, упілася кума*[1]*,*
*Пад парогам лягла.*
*Паглядзіце, хлопцы,*
*Ці ў тонкай сарочцы.*
*А калі ў тонкай,*
*Хай ляжыць шчэ столькі.*
*А калі ў паскадной,*
*Палажыце пад скам'ёй*

(в. Асавец Бялыніцкага р-на).

* * *

*Эх, кум куме рад,*
*Павёў куму ў віныград:*
*– Еш, кума, ягодкі,*
*Каторыя салодкі.*

[1] Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

*Каторыя горькі,*
*Будуць маёй жонкі.*
*Каторыя сладкі,*
*Эта маёй маткі*

(в. Бяседавічы Хоцімскага р-на).

* * *

*Эх, кумка-кума,*
*Кума люблiная,*
*Што ж у цябе рубашачка*
*Не падрубленая?*
*Буду кумку любіць*
*І рубашку рубіць. І-іх!*

(в. Бяседавічы Хоцімскага р-на).

* * *

*Хто ж ета йдзець? – кум да кумы.*
*Што ж ён нясець? – куль саломы.*
*А што ў том кулю, кулю?*
*Чаравічкі куме, куме,*
*Кумка мая, ты галубка мая.*
*Ох ты, кумка мая,*
*Ты, галубка мая,*
*Атвары-ка судака,*
*Штобы юшка была.*
*Да звары жа судака,*
*Штобы юшка была,*
*Штобы юшачка да з пятрушачкай.*
*Штобы юшачка да і з пятрушачкай,*
*Кума-люба, кума-люба, кума-душачка*

(в. Малыя Бортнікі Бабруйскага р-на).

На хрэсьбінах гучалі прыказкі, прымаўкі, выслоўі, жарты, разнастайныя пажаданні дзіцяці, яго бацькам. Сярод тых шматлікіх якасцей, якія хацелі б бачыць бацькі і вясковая грамада ў сваіх нашчадкаў, асноўнае месца займалі працавітасць, адпаведныя «мужчынскія» ці «жаночыя» працоўныя навыкі, высокія маральныя якасці, прыгожая знешнасць. Напрыклад, у Магілёўскай губерні бабка-павітуха, падносячы кожнаму з гасцей на чарапках ад разбітага гаршка кашу, прыгаворвала: *«Во, пасылаець Вам пані палагавая (парадзіха) кашу і масла к ней, кушайце за здароўе нашай радзіны, штоб здароў быў і добра малаціў»*. На Міншчыне дзяўчынцы бабка жадала: *«Каб мая ўнучка не была бела+ручка, рана ўставала і добра працавала»*. Добрае дзіця тое, якое шануе сваіх бацькоў, даглядае іх у старасці, што таксама знаходзіла сваё месца

ў хрэсьбінных прыгаворках: *«Каб мой унучак здаровенькі падрастаў і бацьку з маткай шанаваў»; «Жадаю бацькам у Алесю мець пацеху, у старасці (горасці) – уцеху»*. Шчасце, паводле народных уяўленняў, было неразрыўна звязана са здароўем, дабрабытам. Адсюль і адпаведныя словы: *«Каб ты быў крэпак, як вада, багат, як зямля, вясёл, як пчала, а красен, як вясна»*. Формулы-пажаданні на хрэсьбінах таксама сцвярджалі абавязковасць будучага шлюбу дзіцяці: *«Як відзялі пад храстом, штоб так відзялі і пад вянцом»*.

Вялікае значэнне на хрэсьбінах меў абмен падарункамі паміж парадзіхай, з аднаго боку, і кумамі і бабкай-павітухай – з другога. Звычайна ў якасці падарункаў для бабкі і кумоў выкарыстоўваліся наміткі (прычым пад гэтым тэрмінам выступалі не толькі ўласна наміткі, але і іншае палатно, кавалкі якога адмяраліся з такім разлікам, каб кум мог пашыць з яго штаны, а кума і бабка – сарочкі ці спадніцу). Часта парадзіха дарыла ручнікі, абрус, хустку. У намітку парадзіха загортвала хлеб, у некаторых месцах спецыяльна выпечаны для хрэсьбіннай урачыстасці. У Цэнтральнай Беларусі хлеб упрыгожваўся зверху, па скарынцы, рознымі геаметрычнымі фігуркамі. У Магілёўскай губерні пасля падзелу бабінай кашы парадзіха давала бабцы намітку і вялікі бохан хлеба, куму – ручнік і хлеб, куме – кавалак палатна і хлеб (Е. Раманаў).

У чарговы раз, пасля атрымання падарункаў, павітуха выходзіла на першы план, бо, паводле народных уяўленняў, павінна была выканаць неабходныя абрадава-магічныя дзеянні, каб прынесці дзіцяці шчасце, здароўе, багацце, а таксама забяспечыць дабрабыт у хаце яго бацькоў. Так, у Полацкім павеце Віцебскай губерні, "бабка накрывалася хусткай, падыходзіла да стала, станавілася на лаву і, прыгаворваючы разнастайныя добрыя пажаданні дзіцяці, тры разы перакручвалася на сваім месцы, пляскала ў далоні, затым саскоквала на падлогу" (П. Шэйн). У Магілёўскай губерні, па сведчанні Е. Р. Раманава, «...бабка, атрымаўшы намётку, узлазіла на лаўку і скакала там, прыгаворваючы: *"На палу рабяткі, пад палом ягняткі, в хлеві парасяткі"*. Іншая павітуха, атрымаўшы падарунак, перакручвалася на месцы тры разы, столькі ж разоў падскоквала ўверх, па магчымасці вышэй, і гаварыла: *"Каб мой унук вялік рос, шчасліў быў. Каб на яго долю паслаў Бог усяго уволю"*. Або так: бабка надзявала намітку на галаву і пачынала падскокваць сярод хаты ўверх, прыгаворваючы: *"Радзі, Божа, у маіх унукаў жыта, пшаніцу і ўсякую пашніцу. Дай Божа, сколькі ў гэтай хаце сучкоў, каб у маіх унучкаў столькі было дзіцючкоў, а сколькі дзірачак, каб столькі дзевачак!*» (в. Аслянка Мсціслаўскага павета).

Да сённяшняга дня звесткі пра гэты звычай добра захоўваюцца ў памяці інфармантаў, жанчын сталага веку: *«Бабке мацер'ял давалі,*

*яна на лаўку лезла, гулялі, а счас не гуляюць»* (в. Бугаі Краснапольскага р-на); *«Тады бабуля, ёй жа радзішка дае намётку, бабуля лезець на лаўку с етай намёткай, увязваець намётку сюда на шыю, лезець на лаўку, скачэць: "Каб мой унук ці ўнучка, вялік рос, шчасліў быў, добрым людзям на ўвагу, бацьку з маткай на пацеху"»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на); *«На крезьбінах парадзіха давала падаркі бабе, куме, куму. Мацерьял атразалі і давалі. Што тады было? У маё ужо ўремя пакрывала давалі, скацерць, на юбку. Бабцы дадуць падарак, яна танцуя, скача па лаўках. Яшчэ гаворяць, нада падарак зарубіць, штоб баба паставіла бутылку. Ёсць яшчэ такая прымаўка: "Ой, бабка мая, бабка любленая, а твая намётачка не зарубленая". Нада, штоб бабка абязацельна бутылку паставіла за падарак»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«Бабуля, як дадуць падарак, на лаўке скакала. Скамейка стаяла, бабуля станець на ету скамейку: "Каб дзіцё расло бальшое, здаровый быў да разумный быў". А ей возьмець хто-небудзь нарочна вады лінець і гаворіць: "Вой, бабуля абасцалась". Ну, смех, ну, і ўсё»* (в. Ляды Дубровенскага р-на); *«Бабка з наміткай залазіла на лаўку і падскоквала там тры раза: "Дай, Божа, майму ўнучачку шчасліваму быць і здароваму быць. Гоп, баба!" І падскокне. Тады апяць: "Дай, Божа, майму ўнучку ў клеці мяшкамі, на стале пірагамі". Апяць падскокне і дальша: "Каб мая ўнучка не была бела ручка, рана ўставала, тонка прала, намётку ткала, бела бяліла і бабе намётку падарыла". Так тры раза»* (в. Асавец Бялыніцкага р-на); *«Баба варыла кашу і прынасіла. А рожаніца купляла бабкі намётку і сваей матке, і сьвякрусі. У магазіне бралі мацяр'ялу – называлася намётка. Палатно насілі. Дажа я пасьледнюю* <дачку> *радзіла і купляла і сьвякрусі, і мамінай сястры, што глядзела»* (в. Баркалабава Быхаўскага р-на); *«А ўжо як хрэсьбіны, дак ужо абязацельна той бабе, што роды прымала, нада мацерыялу на плацця даць, і пярэдніка, і хустку, ці палатна, ці палаценца давалі»* (в. Церабаў Петрыкаўскага р-на); *«Намётку давалі бабе, а куму – штаны, куме – мацерыю завязвалі. А цяперь кум куме даець шампанскае і канхвет»* (в. Паршына Горацкага р-на); *«Парадзеля дае падаркі куму, куме, бабе, свякрыві дае, свёкру»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на); *«Бабе давалі намётку, яна за шыю завяжець і скакала, і гопала, і пела нешта: "Сколька сучкоў – столька будзець сынкоў"»* (в. Сава Горацкага р-на).

У в. Рубанаўка Мсціслаўскага р-на, атрымаўшы намёткі, бабка і кума вешалі іх на ікону, а самі скакалі па лаўках. Намёткі віселі там два дні, пасля чаго бабка і кума забіралі іх дадому. У Слаўгарадскім р-не Магілёўскай вобл. бабка, абкруціўшыся ў намётку, тры разы падскоквала і прыгаворвала: *«Каб мой унук вялікі рос, вялікі рос, шчаслівы быў. Гоп, баба!»* Намётку, якую баба атрымала ў падарунак, іншыя госці

імкнуліся ўкрасці, каб пасля атрымаць ад яе выкуп. У іншых вёсках было прынята, каб бабка, атрымаўшы падарунак, скакала і спявала прыпеўкі:

*Ай, кум куме рад, павёў куму у сад:*
*– Шчыплі, кума, ягыдкі, каторыя салодкі.*
*Каторыя горкі – кідай маёй жонкі*

(в. Лютня Мсціслаўскага р-на).

Пасля скокаў і прыпевак бабка вешала палатно на ікону.

Па прынятым у некаторых раёнах звычаі падарунак парадзіхі куме павінен быць большы за падарунак, атрыманы ёю ад кумы, у шэсць разоў (Мазырскі павет) (П. Шэйн). Зрэдку кум, даючы парадзісе некалькі манет, прыгаворваў: «Кума куму – халсціну, а кум куме – палціну» (Е. Раманаў). Падарункі кумам і бабцы аддавала сама парадзіха, пры гэтым тры разы з кожным з іх цалавалася.

Абрад раздачы падарункаў таксама суправаджаўся адпаведнымі песнямі:

*Наша бабка нядужа,*
*На намётачку дасужа.*
*Таўчы-малоць – ай, туды,*
*Намётачку – дай сюды.*
*Як таўчы-малоць – бабка нядужа,*
*Пад намётачку – бабка дасужа*

(в. Велеўшчына Лепельскага р-на).

Хрэсьбіны на большай частцы тэрыторыі Беларусі (за выключэннем Заходняга Палесся) завяршаў спецыяльны абрад пад назвай «цягаць бабку на баране». Для гэтай мэты выкарыстоўвалі як сапраўдную барану, пакрытую вывернутым кажухом, так і санкі, каляскі, начоўкі, нават лесвіцу. Трэба адзначыць, што выкарыстанне каляскі, санак – пазнейшая з'ява, першапачаткова, у больш старажытныя часы, павітуху садзілі на барану, пакрытую кажухом, і цягнулі барану па зямлі.

Вось як, паводле сведчання П. Шэйна, весяліся нашы продкі ў канцы XIX ст.: *«У канцы хрэсьбін бабка пачала нібыта капрызнічаць: "І хата ў цябе, унук, цесная і паскакаць мне негдзе". Тады мужчыны запыталі гаспадара: "Чы ёсць у цябе коні, штоб пакатаць нашу княгіню-бабу?" Гаспадар на гэта адказаў: "І коні е, і карэта, пайду запрагаць". У гэты час зайшоў у хату малады мужык з аброццю на шыі і сказаў: "Бабко, княгіня, паедзем у карчму, там і паскачаш". Каля ганка стаяла ручная каляска, на якой ляжала барана, накрытая кажухом. Двое мужчын узялі бабу на рукі і пасадзілі на каляску, прытрымліваючы яе, каб не саскочыла. Некалькі чалавек узяліся за дышла і хутка пацягнулі бабу ў карчму»* (мястэчка Ельск Мазырскага павета).

Часта бабу «цягалі на баране», размаляваўшы ёй шчокі ярка-чырвонай фарбай, сажай, націралі іх бураком, упрыгожвалі пер'ямі, каснікамі, жывымі ці штучнымі кветкамі, на галаву павязвалі шмат хустак, так, што атрымліваўся сапраўдны вянец. У рукі ёй давалі дубец або венік, якімі яна падганяла гасцей. Часам бабка ў час выканання гэтага абраду надзявала кажух, а ў руцэ трымала чырвоную стужку. У некаторых вёсках было прынята «цягаць бабу на баране» на другі дзень пасля святкавання хрэсьбін.

Госці выходзілі на двор, рыхтавалі санкі ці калёсы, садзілі бабку і везлі яе да карчмы або да хаты. Госці пераапраналіся ў карнавальныя касцюмы «доктара», «салдата», жанчыны – у мужчынскае адзенне і наадварот, многія на галаву надзявалі рэшата, вымазвалі сабе твар сажай, ідучы па вуліцы, спявалі, крычалі, пляскалі ў далоні, стукалі палкамі ці качалкамі ў пустыя вёдры, чыгункі, ігралі на піле, гармоніку, балалайцы, спявалі.

*Запрагайце, закладайце*
*Да дванаццаць валоў,*
*Адправадзьце, адвязіце*
*Да бабульку дамоў.*
*Наша бабулечка, наша галубачка*
*Падводанькі любіць,*
*Да яна нам, малодзенькім,*
*Да яна нам, харошанькім,*
*Гарэлачку купіць.*
*Да не то купіць, не то купіць,*
*Да й падсалодзіць,*
*Да нам, малодзенькім,*
*Да нам, харошанькім,*
*Да вельмі нам дагодзіць.*
*Да запала, запала,*
*Дарожка сняжком,*
*Да пойдзе наша бабулечка*
*Да дадому пяшком.*
*Да запала, запала*
*Да рожка расою,*
*Да пойдзе, наша бабунька,*
*Уся бяседа з табою*

(Радзінная паэзія. С. 265).

*А юбка мая, юбка ў точкі,*
*А пад юбкай сядзіць – вылупіла вочкі*

(в. Асавец Бялыніцкага р-на).



*Цяганне бабы на баране ў час хрэсьбін у в. Вялікая Касіна. Віленскі р-н. Фотаздымак Ю. Внуковіча*



*Цяганне бабы на баране ў час хрэсьбін у в. Вялікая Касіна. Віленскі р-н. Фотаздымак Ю. Внуковіча*



*Цяганне бабы на баране ў час хрэсьбін у в. Вялікая Касіна. Віленскі р-н. Фотаздымак Ю. Внуковіча*



*Цяганне бабы на баране ў час хрэсьбін у в. Вялікая Касіна. Віленскі р-н. Фотаздымак Ю. Внуковіча*

І ў пазнейшыя часы, як сведчаць нашы экспедыцыйныя запісы, гэты абрад карыстаўся вялікай папулярнасцю: *«І бабу вязуць, і кума, і куму дамой, тады яны ва дваре частуюць. У карыта пасодзюць і цягнуць. І на калёсах, і на санях, я сем раз бабаю была, папавазілі! У нас падаркі ўцюжаць, содзяць на стула ці на скамейку ці бабу, ці кума, ці куму, а баба тады рашчытуецца, водку становіць, закуску. Эта называецца ўцюжаць падаркі»* (в. Палядкі Краснапольскага р-на); *«Када ўжо хресьбіны згуляюць, кашу паб'юць, тады бабу садзяць у тачку. Прывязваюць туда кансервныя банкі, када вязеш па дзяреўні, яны брязгаюць. А я ў жалезнае вядро ложак накідаю і кручу, і барабаню – такі лямант падымаецца, такі гармыдаль! І на санках вязуць, і ў карыце яком, усяк. І яшчэ разы два ці тры скінуць с санак па дароге. Дамой яе вязуць, а баба тады ўсіх гасцей частуя, усё сваё на стол выстаўляе»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на); *«Бабу вазілі на тачке, і ніхто не напіўся ніколі, харашо было. Вязлі бабу к ей дамой, яна ўжо ўгашчала ўсіх»* (в. Буглаі Краснапольскага р-на); *«Ну, якую-небудзь каляску знойдуць ці калёсы, садзяць і вязуць, і песні пяюць усякія. Бабулю ету*

*на куце абаллюць вадою ўсю, а тады на вуліцы звозюць яшчо пад калонку і апяць аббаллюць тама, памыюць тама. Мяне як звазілі, як аблілі...»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на); *«Бабулю вазілі вазілі па вуліцы, у карыце, каб грымела. Вазілі, як дамой ужо расхадзіліс»* (в. Ляды Дубровенскага р-на); *«На лесніцы бабу вазілі ў піўнушкі. Пасадзюць на лесніцу і павязлі. А яна ім піва купляла»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на).

Уся працэсія рухалася па вуліцы ў накірунку да крамы або хаты, дзе жыла бабка. Па дарозе яе абавязкова тры разы, а то і болей, выкульвалі на зямлю (ці ў снег – зімой): *«Бабу вазілі на кресьбінах, хто ў карыце, хто на баране, кулялі, аж ногі задзярэ»* (в. Канічы Касцюковіцкага р-на); *«Бабулю цягалі на санках, на калясках, каб яна выкупліваласъ, гарелкі давала. Еслі не дасць, казалі, утопяць»* (в. Паршына Горацкага р-на).

Нарэшце, даставіўшы бабку ў краму ці ў яе хату, госці патрабавалі выкуп і ў хуткім часе атрымлівалі яго. Па традыцыі бабка абавязана была пачаставаць гасцей гарэлкай за ўласныя сродкі: *«У магазін цягалі, санкі падчапілі к матацыклу. Усе парваліся са сьмеху. Там* <у магазіне> *угашчала, а каторая – дамой. Гэта і цяпер ёсь»* (в. Баркалабава Быхаўскага р-на); *«У калясцы бабу вазілі, пасодзяць і вязуць, пяюць і к магазіну, яна ім плоціць»* (в. Сава Горацкага р-на); *«А тады бабу садзюць на барану і вязуць. Баба ім гарэлкі, а к бутылкі лентачку прывяжаць»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«На саначках цігалі бабу, пака бутылку не дась»* (в. Бялькоўшчына Верхнядзвінскага р-на); *«Цягалі бабу, на каляску паложаць да вязуць ужо к бабе, к куму і куме. Вязуць па вуліцу, ідуць ззаду да паюць ужо. І ўжо там частуюцца. Баба ж ведая, што яе прывязуць і прыгатуецца, стол, падходзяць, п'юць, ядуць»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на).

У Мсціслаўскім р-не бабку цягалі на баране толькі па дварэ той сядзібы, дзе спраўлялі хрэсьбіны. Барану з бабкай, якая першы раз сядзела на ёй, а потым стаяла, цягалі тры разы ад хаты да брамы і назад да хаты. Пры гэтым госці прыгаворвалі розныя добрыя пажаданні для дзіцяці: *«Каб шчаслівы быў»*, *«Каб здаровы быў, жаніўся»*, *«Каб ціхі быў, спагадлівы»*. У Клічаўскім р-не бабку пасля заканчэння хрэсьбін неслі па вуліцы ў пасцілцы некалькі мужчын па чарзе. У некаторых жа вёсках на калёсы ці санкі садзілі не толькі бабу, але і кумоў: *«Бабу вазілі на калясцы дамой, яна тады ўгашчала хто вязець. І кума вазілі і куму вазілі, зімой – на санках»* (в. Вялікія Шарыпы Горацкага р-на). Апошнія адкупляліся ад астатніх гасцей таксама гарэлкай.

Калі ж бабка не хацела, каб яе вазілі па вуліцы, тады госці ў хаце садзілі бабку на стул, дзе ляжала падушка, і падымалі ўгору тры разы. Бабка пасля частавала іх уласнай гарэлкай. Тое ж самае ўдзельнікі хрэсьбін рабілі з кумамі і з дзедам – мужам бабкі-павітухі, за што так-

сама ад іх атрымлівалі пачастунак. На гэтым хрэсьбінныя ўрачыстасці заканчваліся.

Праўда, у некаторых месцах напрыканцы хрэсьбін здзяйсняліся абрадава-магічныя дзеянні, закліканыя надзяліць дзіця любоўю і майстэрствам ў працы. Так, у беларусаў Смаленскай губерні па завяршэнні хрэсьбін, калі святкавалі нараджэнне дзяўчынкі – кума хутка выбягала з хаты і хапалася за вядро, каромысел ці які-небудзь іншы прадмет, што ўваходзіў у лік прыладаў жаночай працы; калі нованароджаным быў хлопчык – то бег кум і хапаўся за сякеру, саху, барану і г. д. На Віцебшчыне сустракалася такое павер'е: усе хлебныя крошкі, што заставаліся пасля хрэсьбін, раілася старанна сабраць і на працягу трох дзён даваць курам, выключаючы ўсялякі іншы корм, тады ў гаспадыні, лічылі, будуць рэдка нараджацца дзеці (М. Нікіфароўскі).

Самым блізкім ад святкавання хрэсьбін быў абрад ачышчэння нованароджанага пасля царкоўнага мірапамазання, які на Беларусі насіў назвы: *муравінкі*, *жмуркі*, *зліўкі*, *змурынкі*. У час царкоўнага хрышчэння дзіцяці разам з іншымі выконваўся і абрад мірапамазання, які павінен быў забяспечыць яму пры дапамозе наліплага на цельца масла «благадаць Боскую». Мяркуючы па этнаграфічных апісаннях XIX ст. і нашых экспедыцыйных даных, выконваўся абрад ачышчэння дзіцяці наступным чынам. На трэці, радзей – на другі дзень пасля хрышчэння дзіцяці, пакуль збіраліся нешматлікія госці, у асноўным блізкія сваякі і кумы, павітуха рыхтавала ваду для купання дзіцяці, якое, акрамя ўласна купання, уключала яшчэ і рытуальнае абмыванне. Для гэтага абмывання бабка прыносіла авёс і хмель. Стол засцілалі кажухом, на кажух ставілі голае дзіця, на галаву якому клалі дзе-ндзе абаранкі (в. Гарадзец Быхаўскага павета) і аблівалі сумессю вады, аўса і хмелю. (Е. Раманаў). Затым бабка купала дзіця ў начоўках, як звычайна. Ваду пасля купання вылівалі абавязкова ў такое месца, дзе ніхто б не хадзіў і не заглядвалі сонца і месяц. Той жа сумессю, што заставалася ў місцы, павітуха мыла твары ўсім прысутным і выцірала іх ручніком. Некаторыя з гасцей кідалі пры гэтым грошы ў міску. Ён быў распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі, за выключэннем Заходняга Палесся. На гэтым хрэсьбінныя ўрачыстасці заканчваліся.

## Дзіця падрастае: першы зуб, першы крок, першае пастрыжэнне

Дзіця падрастала з кожным днём, а ў бацькоў з'яўляліся новыя клопаты. Нормы звычаёвага права прадугледжвалі прытрымлівацца ў далейшым пэўных правілаў паводзін пры тых ці іншых змяненнях у фізічным і разумовым развіцці дзіцяці.

Шэраг абрадава-магічных дзеянняў здзяйснялі ў сям'і пры з'яўленні і выпадзенні першага зуба дзіцяці. Першы зубок у немаўляці прарэзваўся прыкладна ва ўзросце ад 6 месяцаў да 1 года. Для таго, каб гэты фізіялагічны працэс праходзіў лягчэй («каб зубы хутчэй праразаліся»), дзіця садзілі ў рэшата і вазілі ў ім па падлозе. Для таго каб зубы раслі моцнымі і не балелі, маці пры з'яўленні ў дзіцяці першага зуба жавала часнок і тры разы дзьмула («хукала») яму ў рот. На Палессі існавала павер'е, згодна з якім, для больш хуткага і лёгкага праразання зубоў рэкамендавалася павесіць на шыю дзіцяці свіны клык, воўчы зуб ці мяшочак з галавой мышы, што мела на мэце паўплываць на рост і моц зубоў (А. Сержпутоўскі). Для аблягчэння праразання зубоў раілася злавіць голуба, надрэзаць яму лапку і крывёю птушкі намазаць дзіцяці дзясну. А ўвогуле лічылася, калі ў дзіцяці доўга не прарэзваюцца зубкі, у яго будзе ўстойлівая псіхіка (*«будзе здаровае на голаў»*) (М. Федароўскі). Калі ў дзіцяці пачыналі рэзацца першыя зубкі, патрэбна было адрэзаць скурку ад сала і даць маломy смактаць, бо лічылася, што тады будуць расці крэпкія зубы. На Магілёўшчыне сачылі за з'яўленнем першага зуба, таму што па месцы яго знаходжання, паводле народнага ўяўлення, можна было прадказаць лёс дзіцяці: калі зуб быў угары, лічылася, што дзіця хутка прамрэ, калі ўнізе – будзе доўга жыць.

Тэрмін службы першага камплекта зубоў, які называўся малочным, быў параўнальна невялікім. Змена малочных зубоў у дзяцей на пастаянныя пачыналася прыкладна ў 5 гадоў. І тут, паводле традыцыйных уяўленняў, патрэбна было праяўляць пільнасць, уважлівасць, бо ад таго, як абышліся з першым выпаўшым зубам дзіцяці, залежала, якія яны ў яго будуць пастаянныя. Першы выпаўшы малочны зуб кідалі за печ, на печ ці пад печ, каб астатнія трымаліся доўга. Наўзамен прасілі даць новы моцны: *«А зубок кала галоўкі тры разы абкруціць і на печ: "Расці, зубок, новенькі"»*



*Першы зуб.*
*Фотаздымак А. Шрубок*



*Печ. Фотаздымак Т. Валодзінай*

(в. Бялькоўшчына Верхнядзвінскага р-на); *«Зубок абкруціш вакол галоўкі, пераксціш і на печку кініш»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«Першы малочны зуб кідалі на печ ці пад печ: "Мышка, мышка, на табе касцяны зуб, дай мне жалезны". І цяпер так робяць»* (в. Клінок Чэрвеньскага р-на); *«Як прымерна первы зуб выпадзе, бралі эты зуб і круця кругом галавы: "Мышка, мышка, на табе касцяны зуб, а дай мне залаты" – тры разы скажа і кіня туды на печ, у куток»* (в. Будагова Смалявіцкага р-на); *«Кідалі пад печку і гаварылі: "Мышка-барабышка, на табе касьцяны, а дай нам залаты»* (в. Грудзінаўка Быхаўскага р-на).

У іншых сем'ях яго «аддавалі мышы» з разнастайнымі прыгаворамі-просьбамі: *«Зуб* <кідалі> *і гаварілі: "Мышка, мышка, на табе касцяный, а мне дай залатый"»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на); *«Помню, як я малая была, дак бабуля мая, як зуб атваліўся, дак яна над гала-*



*На печ кідалі першы выпаўшы зуб. Фотаздымак Т. Кухаронак*

*вой пакруціла-пакруціла і куда-та кінула. Бабуля мне гаварыла: "Дай ей* <мышы> *зуб репный, а папрасі крепкій»* (в. Ляды Дубровенскага р-на); *«Пэрвы зуб выпадэ, кідалі на піч: "На тобі, мышка, косцянога, прынэсі нам золотого"»* (в. Пінкавічы Пінскага р-на); *«Як выкінецца первы зубчык, кажам* <дзіцяці>*: «Бяры ў руку і нясі за комін кідай, хай мышка забярэ»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«На табе, мышка, зубок прасты, а мне дай касьцяны»* (в. Стары Дзедзін Клімавіцкага р-на).

Моц, здароўе зубоў асацыяваліся ва ўяўленнях нашых продкаў з жалезам / золатам: *«Зуб вываліцца, а тады: "Мышка-ламышка, на табе касцяны, а дай мне жалезны". Такія разгаворы вядуцца»* (пас. Леніна Краснапольскага р-на); *«Мышка, мышка, на табе дзеравянны, а мне дай залаты»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«Як зуб выпадзець, кідалі ў вугал і гаварілі: "Мышка, мышка, на табе касцяны зуб, а мне дай залатый". Мяне так бабушка вучыла»* (в. Паршына Горацкага р-на); *«Першы зуб кідалі самэ дзіця за комін: "На тобе, мышка, косцяного, а мне дай золотого»* (в. Хатынічы Ганцавіцкага р-на); *«Як зуба вырвіш, то кідалі і говорылы: "Мышка, на тобі порохнявого зубчыка, а мэні дай жалезного"»* (в. Олтуш Маларыцкага р-на); *«Бывала, на печ кінеш: "Вазьміця касьцянэй, а мне дайця залатэй"»* (г. п. Хоцімск).

Догляд за дзіцем у першы год яго жыцця праяўляўся і ў тым, каб навучыць яго поўзаць, сядзець, стаяць, хадзіць. Дзіця пачыналі садзіць толькі пасля таго, як яно само спрабавала гэта зрабіць, месяцаў у пяцьшэсць, абкладваючы з усіх бакоў падушкамі. Бацькі выраблялі невялікія зэдлікі з высокай спінкай і ледзь ніжэйшымі сценкамі-падлакотнікамі.

Дзіця сядзела ў ім такім чынам, што спінка прыціскалася да задняй сценкі зэдліка, ручкі зручна ляжалі на падлакотніках. Праз куты сценак прапускалася драўляная планка – своеасаблівая завала, якая засцерагала дзіця ад падзення. Пад спінку падкладалася мяккая падушачка, каб немаўля не стукнулася патыліцай.

У гэтым узросце дзіця пачынала ўжо актыўна рухацца – спрабавала поўзаць, падымаць ручкі ўверх-уніз, самастойна пераварочвацца. З падтрымкай дарослых рабіла і першыя спробы стаяць на ножках каля апоры. У традыцыйных сем'ях для гэтага меліся спецыяльныя стойкі. Стойку рабілі як прыстасаванне ў выглядзе табурэткі з прарэзанай у верхняй дошцы круглай дзіркай, у якую ставілі дзіця, каб прывучыць яго стаяць на ножках.

Першы крок дзіцяці выклікаў у сям'і ўсеагульную радасць. Але ж дзіцяці патрабавалася дапамога дарослых, каб засвоіць гэтае ўменне. Дзіця, якое рабіла першыя крокі, вадзілі па лаве, бо не так стамлялася спіна ў нянькі, або ставілі каля лавы, ускладвалі яго ручкі на край і ласкава клікалі да сябе. Хвалілі за поспехі і шчыра суцяшалі пасля чарговага падзення. Для прывучвання дзіцяці да хады амаль у кожнай вясковай хаце меўся хадунок. Часцей за ўсё гэта быў шост, які свабодна ўстаўляўся ў адтуліны ў бэльцы і падлозе. Дзесьці прыкладна на вышыні 60–80 см ад падлогі да яго гарызантальна прымацоўвалі другі шост ад 1 да 1,5 м даўжынёй з абручом на канцы. Вось у гэты абруч і ставілі дзіця, якое, перабіраючы ножкамі, хадзіла па крузе. Пазней



*Дзіцячая стойка – этнаграфічны экспанат у этнаграфічным кутку ў в. Барсукі. Кармянскі р-н. Фотаздымак Т. Кухаронак*



*Хадунок для дзіцяці – этнаграфічны экспанат у музеі народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» у в. Бездзеж. Драгічынскі р-н. Фотаздымак Т. Кухаронак*

бацькі навучыліся рабіць хадункі ў выглядзе невялікага абруча з тонкай ляшчыны або лазіны на чатырох ножках з калёсікамі, у якіх малому было рухацца значна лягчэй.

Калі дзіця ў год яшчэ не навучылася хадзіць, лічылася, паводле традыцыйных вераванняў, што яго скоўвалі нябачныя, але моцныя «путы», якія неабходна «разрэзаць». Для гэтага дзіця ставілі на падлогу і хто-небудзь са старэйшых нажом, нажніцамі ці лучынкай, проста рукой рабіў паміж ножкамі дзіцяці рух, які імітаваў разразанне. Пасля чаго ён працягваў рукі да дзіцяці і гаварыў / клікаў: *«Ходачкі, ходачкі, хадулечкі»*. Лічылася, што пасля гэтага дзіця будзе хадзіць упэўнена, не будзе частаваліцца на падлогу ці на зямлю. Звычай дажыў да нашых дзён, у любой беларускай вёсцы некалькі чалавек з вялікай ахвотай раскажуць пра яго і пакажуць, як гэта рабілася: *«А путы, як шагнець дзіцёнак, тады скарей хватаюць ножык*



*Стойка для дзіцяці – этнаграфічны экспанат у музеі народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» у в. Бездзеж. Драгічынскі р-н. Фотаздымак Т. Кухаронак*



*Хадунок – стойка ў в. Цераблічы. Столінскі р-н. Фотаздымак з Інтэрнэту*



*Хадунок – этнаграфічны экспанат з музея этнаграфіі філіяла Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея*

*перярезаць між ног пута, каб ён скарей пашоў»* (в. Ляды Дубровенскага р-на); *«Да, баба путцы разразала, як пашоў» (*в. Пінкавічы Пінскага р-на); *«Дочка моя як пошла, свекроў – раз і ножом, штоб ходыла хорошо»* (пас. Гарадзішча Пінскага р-на); *«Пачыная хадзіць, ножыкам так – чік, паміж ножак»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«Шчыталі, што дзіцёнак спутаны. А як первы шаг сдзелаець – яму пута разразалі: ножыкам так чыркміжа ног па палу»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«Як пачынае хадзіць, нада пута перерезаць і нож лажыць уверьх лезьвіем»* (в. Мышавое Касцюковіцкага р-на); *«Путачка рэжаш, як зьмецца сам стаяць: ножыкам раз і разрэжаш»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); *«Як дзіця пойдзець – між ножак так кресцікам»* (в. Паршына Горацкага р-на); *«Бывая дзіцятка яшчэ за руку водзяць, яно ніяк не адважыцца адчапіцца, то ножыкам шаргане па палу паміж ножак. Тады ўжо лічыцца, што дзіця скора пойдзя»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«Нажом вот так накрэст па палу, путы перарэзаць, штоб пашоў дзяцёнак»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на); *«Абязацельна путцы разразалі, я і сама так дзелала ўсягда. Дзіця пачынае хадзіць: раз-раз-раз – пра-*

*вядзеш кала ножак, разрэжаш путцы рукой. Тры разы правядзеш рукой па палу, нешта яшчо гаварылі»* (в. Будагова Смалявіцкага р-на); *«Пута разразалі, нейкія слава гаварылі. Нажом паміж ножак, каб стаяў, і па палу» (в. Хутар Быхаўскага р-на).*

Прыгаворы павінны былі ўзмацніць акцыянальнае дзеянне: *«Во табе, сынок (дачушка), пута разрэзалі, цяпер ты пашоў (пашла)»* (в. Васілёўка Хоцімскага р-на); *«Дай, Божачка, у добры час» (в. Варатынь Бабруйскага р-на); «Прыпускаем у дарогу цябе» (*в. Будняў Клічаўскага р-на).

Здзяйсняліся ў беларусаў пэўныя абрадавыя дзеянні і ў тым выпадку, калі дзіця пасля спаўнення яму аднаго года не хадзіла: маці прыносіла ў падоле сарочкі некалькі гладкіх камянёў з перасохлага ручая і, расклаўшы іх на падлозе хаты, вадзіла па камянях дзіця датуль, пакуль яно моцна не стоміцца *(«пакуліцька яно не змардуецца»)* (М. Нікіфароўскі). У сям'і былі перакананы, што пасля гэтага дзіця пачне хадзіць. Калі гэта не дапамагала і заставалася небяспека, што дзіця зусім не пачне хадзіць *(«застанецца сідуном»),* бацькі вясною выносілі яго на толькі што ўзаранае поле і, пасадзіўшы на зямлю, абсявалі вакол канаплямі. Затым назіралі: калі канаплі ўзыходзілі, спадзяваліся, што дзіця хутка пойдзе, калі ж не ўзыходзілі – гэта сведчыла пра тое, што яно яшчэ доўга ці наогул не пойдзе. Добрым сродкам для таго, каб дзіця хутчэй пачало хадзіць, з'яўлялася катанне перад ім курынага яйка ў той час, як дзіця стала поўзаць (*«стала на дыбкі»*). Шукалі паратунку і ў шаптух: *«Як дзіця доўга не хадзіла, тады яго вязлі к бабкам лячыць. Былі такія бабкі, іх усе зналі і вазілі к ім лячыць. Яны там штота шапталі. Мае ўсе дзеці, слава Богу, пашлі да года, як адзінаццаць месяцаў – так і пашлі»* (в. Будагова Смалявіцкага р-на).

Першае пастрыжэнне (*«стрыжкі / пастрыжыны»*). На большай частцы тэрыторыі Беларусі стрыглі дзіця першы раз (*«первы волас здымалі»*), калі яму спаўняўся год. Гэта вераванне найлепей захоўваецца не толькі ў памяці вяскоўцаў сталага веку, але часта сустракаецца і ў сённяшнім паўсядзённым жыцці маладзейшых прадстаўнікоў лакальнай супольнасці: *«Да года валосікі не стрíглі. Но і сечас да года не стрігуць. Валосікі заматаеш і ў грубку спаліш, штобы птушкі гнязда не вілі, а то, мол, галава ў малога будзе балець. Стріг абезацельна дзед, штоб у год прішоў і пастріг. Сечас жа дзень раждзенія атмечаеш, завеш дзеда з бабай, угашчаеш іх. І дзед пастріжэ ўнука. Дзед – эта муж той бабкі, што купала первы раз»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на).

Згодна з народным меркаваннем, калі абстрыгчы дзіця раней – тады яно можа заўчасна памерці, ці ўсе жыццё пражыве ў вялікай

беднасці або ў яго будзе дрэнная («*кароткая*») памяць. Таксама забаранялася стрыгчы дзіця да года па той прычыне, што ў дзіцяці вырастуць вельмі рэдкія непрыгожыя валасы. У Віцебскай губерні, паводле сведчання М. Нікіфароўскага, пастрыжэнне дзяцей дапускалася ў выключных выпадках: дзяўчатак зусім не стрыглі, а ў хлопчыкаў валасы «падсікаліся», пры гэтым хлопчыка ставілі на «дзежку-хлебніцу», а адрэзаныя валасы старанна збіраліся і захоўваліся да наступнай «падсечкі», затым іх кідалі ў чыстую праточную ваду.

Звычайна першае пастрыжэнне здзяйснялі бацька ці маці дзіцяці – у каго на той момант было болей вольнага часу. Акрамя іх, дзіця маглі пастрыгчы яго хросныя бацькі або дзед з бабкай, малодшы ці старэйшы сваяк пажадана з бацькоўскага боку. Калі стрыгла маці, яна садзіла дзіця да сябе на калені і састрыгала яму валасы спачатку на макушцы, а затым усе астатнія. У тым выпадку, калі пастрыжэнне здзяйсняў бацька, дзіця ўладкоўвалі на стул, накрыты кажухом, пад які падкладвалі капейкі, а таксама хлопчыку – кнігу, дзяўчынцы – кудзелю, ніткі або садзілі на стол, «*каб яму быў пачот*». У час стрыжкі дзіця абвязвалі чырвонай ніткай або да яго адзення прымацоўвалі мяшочак з соллю. Часам, як стрыглі хлопчыка, у стол збоку ўтыркалі нож. Было і так: хросная маці трымала дзіця, а хросны бацька – стрыг.

Перад тым як прыступіць да пастрыжэння, маці расчэсвала валасы дзіцяці, пасля гаварыла: «*Дай, Божачка, у добры час*»; «*Каб волас рос*»; «*Каб кудры завіваліся*»; «*Дай, Божа ласкавы, каб ты, сынок (дачушка), ніколі не заблудзіў і шоў простаю дарожкаю*» (Гродзенскі павет) (П. Шэйн).

Звычаем забаранялася кідаць састрыжаныя валасы «куды папала», «абы-дзе», іх старанна збіралі і ў залежнасці ад мясцовай традыцыі захоўвалі (затыкалі ў сцяну, дзверы, страху хаты, за бэльку, клалі за абразы): «*Валаскі, як перва абстрыгуць, дзе за ўшак лажылі*» (в. Бяльбкоўшчына Верхнядзвінскага р-на); «*За ікону первыя валаскі клалі, торкалі як дастанеш вісока*» (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на); «*Да года ня стрыглі, у год ці пазней пастрыгуць і валосікі пад бэльку, каб расло вялікая*» (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); «*Да года не стрыглі, няльзя. Пастрыгуць первыя валосікі і паложаць высока над дзвярмі, каб ён хадзіў пад этымі валосікамі. Ці яна, ці ён*» (в. Будагова Смалявіцкага р-на); «*Крёсны бацька стріг к году. Старушкі сабіралі* <валасы> *і лажылі за ікону*» (в. Печары Касцюковіцкага р-на).

У іншых вёсках, згодна са звычаем, састрыжаныя валасы дзіцяці абавязкова нішчылі – спальвалі ці кідалі на ваду: «*Да года не стрíглі, такой закон, што да года нельзя, таму што можна яму і век укараціць.*

*Валосікі нельзя кідаць, нада спальваць са славамі: "Як этаму воласу гарець – столька галаве балець"»* (пас. Леніна Краснапольскага р-на); *«Стрыглі ў год ці пасля года. Самі, найбольш мама. Еслі абстрыг, штоб нідзе не было ні аднаго воласа, сабірай – і ў печку. А то будзе балець галава, еслі не спаліш і будуць валяцца»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на); *«Да года не стрыглі, а пасля года толька, стрыг бацька, а мо дзед, абы-хто стрыг. Кажуць, не можна да года, кажуць птушкі схопяць, да гняздо саўюць – галава балець будзе. Валосікі ў печку, спальвалі. Так ідзе па наследству, і цяпер жа так»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на).

Паводле народнага меркавання, калі састрыжаныя валасы кінуць «абы-дзе», то іх можа падняць птушка і звіць з іх гняздо, пасля чаго ў дзіцяці саўецца каўтун і ўсё жыццё будзе балець галава: *«До годыка не стрыглы, у годзік налыса стрыглы. Косы нельзя на ўліцу кыдаты, птушка возмэ – каўтун будэ віцца. Його ж нэ рошчэшаш і отразаты нельга, почці што йон до кожы прыкліваецца»* (в. Пінкавічы Пінскага р-на). Калі ж птушка занясе валасы ў якое-небудзь скрыпучае дрэва – чалавек стане ўвесь час хварэць («скрыпець»). Таксама лічылася: *«калі птушка возьме валасы – чалавек зробіцца няпамятлівы і лысы»* (Шаркаўшчынскі р-н); *«птушкі кубла ўюць – валасы вылезуць»* (Пінскі р-н).

Небяспеку, паводле традыцыйных вераванняў, у дадзеным выпадку ўяўляла і мыш: *«Мыш можа ўзяць валосікі ў гняздо – тады очень галава баліць. Мышы забіраюць, гнёзда ўюць, плоха тады чалавеку»* (пас. Леніна Краснапольскага р-на).

Здзяйсняючы тыя ці іншыя дзеянні з састрыжанымі валасамі, адначасова выказвалі разнастайныя добрыя пажаданні дзіцяці. Напрыклад, кідаючы на ваду, каб раслі прыгожыя, шаўкавістыя, доўгія валасы, прыгаворвалі: *«Паплывуць валасы – коскі расці будуць»;* затыкаючы валасы пад страху, жадалі высокага росту дзіцяці, асабліва хлопчыку: *«Каб высокі рос»*. На Магілёўшчыне, калі стрыглі дзяўчынку, валасы кідалі на гной у хлеў, дзе стаяла карова, каб *«косы раслі доўгія»*.

Уяўленні, веды пра тое, калі першы раз стрыгчы дзіця, што належыць зрабіць з састрыжанымі валасамі і сёння добра захоўваюцца ў памяці вясковых людзей, аб чым сведчаць матэрыялы нават самых апошніх палявых экспедыцый: *«Да года ня стрiглі, я не стрігла, мне жэншчыны падсказвалі. І січас ня стрігуць. Валосікі етыя на загнет выкінеш ды згараць, а куды іх будзеш дзіваць»* (в. Міхалінава Дубровенскага р-на).

Паўсюдна на тэрыторыі Беларусі ў дзень першага пастрыжэння дзіцяці бацькі ладзілі невялікае застолле. На Магілёўшчыне бабка і хросная маці прыносілі яму падарункі: па 2–3 м яркага кваціcтага паркалю для дзяўчынкі ці чорнага або ў палоску – для хлопчыка.

Беларускія сяляне ўважліва сачылі за першым словам дзіцяці: калі яно было «тата», лічылася, што наступным у гэтай сям'і народзіцца хлопчык, калі «мама» – дзяўчынка. На Гродзеншчыне існавала павер'е, што калі дзіця раней стане хадзіць, чым гаварыць, то яшчэ гаварыць доўга не будзе, бо *«яно затаптала мову»* (М. Федароўскі). Паводле традыцыйных вераванняў, забаранялася разам з грудным малаком адначасова даваць яйка, бо лічылася, што ў гэтым выпадку *«дзіця не хутка пачне гаварыць»* (М. Нікіфароўскі); *«Помню, як мамуся пякла хлеб, дак нас садзіла перад печчу і цераз нас сунула хлеб у печ, каб мы чыста гаварылі»* (в. Новыя Рубяжэвічы Стаўбцоўскага р-на).

У асяроддзі беларускіх сялян у мінулым стагоддзі не рэкамендавалася да спаўнення дзіцяці аднаго года шыць яму кашулькі і іншае адзенне з новага палатна, а абавязкова са старога, каб дзіця добра расло, а як вырасце – не выдаткоўвала марна грошы. Асаблівасць крою першай дзіцячай кашулькі надзвычайна простая – на тканіне, перагнутай папалам, рабілі адтуліну для галавы, бакавых швоў і рукавоў не было. Першую кашульку з рукавамі шылі звычайна тады, калі дзіця пачынала сядзець, для хлопчыкаў і дзяўчатак яна была аднолькавая. Яшчэ і ў пасляваенны час маленькія дзеці абодвух палоў насілі аднолькавыя кашулькі, пашытыя з фабрычнай тканіны.

Існавалі і іншыя прыкметы, што тычыліся малога дзіцяці, якія сведчаць пра вельмі ўважлівыя адносіны дарослых да яго. Так, паводле народнага меркавання, стоячы над дзіцём, забаранялася пацягвацца – інакш дзіця вырасце гультаяватае (М. Федароўскі). У Панямонні існавала павер'е, згодна з якім, нельга было дзіця садзіць на стол, бо, як мер-



*Коля 9 месяцаў з в. Новы Двор. Поразаўскі р-н. Фотаздымак М. Грынблата. Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. 1953 г.*

кавалі, калі яно пачне хадзіць, то будзе доўгі час на зямлю падаць (М. Федароўскі). Бытавала яшчэ і такое перакананне: калі дзіця ўпала і ляжыць на зямлі, то праз яго ні ў якім разе нельга пераступаць – яно расці не будзе. Каб дзіця не вырасла ўпартае, што ў народзе лічылася даволі значным недахопам характару, яго не раілі браць задам (П. Шэйн). А каб дзіця не стала злое і капрызнае, яго, аддаючы камунебудзь на рукі, нельга было біць хоць бы нават жартам (П. Шэйн). Ні ў якім разе беларускія сяляне да спаўнення дзіцяці годзіка не давалі яму ў рукі люстэрка і не падносілі да люстэрка – інакш у яго будуць вельмі цяжка і доўга прарэзвацца зубкі: *«Некалі гаварылі, што да года і ў люстэрка няможна дзіця паказваць. Я пыталася ў адной старой бабулькі – чаму? "Эта для таго, – яна гаворыць, – што ў дзіцяці будуць надта ж дрэнныя зубы"»* (аг. Навасёлкі Ашмянскага р-на).

Лічылася таксама, што такім чынам дзіця можа моцна спалохацца і захварэць: *«Гаварілі, што не нада, штоб дзіцёнак бачыў сябе ў зеркале да года, а то спужаецца, закрічыць, можа заікацца»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на); *«Да года дзіця ў зеркала не паказваюць, штоб яно не пугалася само сябе. Ну, цяперь жа дзеткі развітыя, і ў сем, і ў восім месяцаў падпаўзе і паглядзіць у зеркала»* (в. Пачапы Краснапольскага р-на).

У выпадку, калі дзіця паваліласся і ўдарылася, існавалі ў беларусаў разнастайныя магічныя спосабы лячэння ад сполаху з мэтай пазбегнуць непажаданых вынікаў. Напрыклад, на большай частцы тэрыторыі Беларусі быў распаўсюджаны наступны магічны прыём: на тое месца, дзе павалілася дзіця, у тую ж хвіліну выл івалі тройчы крыху вады або тры разы плявалі (П. Шэйн). Акрамя таго, трэба было адцягнуць дзіця з месца падзення за ногі, каб, паводле народнага меркавання, не прыпыніўся яго рост. Часта ў такіх выпадках з мэтай засцерагчы дзіця ад вывіху, пухліны на месца падзення ўтыркалі нож і не вымалі яго да таго часу, пакуль дзіця не пераставала плакаць ("*пакулечкі не нарумзаіцца*") (М. Нікіфароўскі).

Калі немаўля было яшчэ зусім малое, дарослыя ўжо імкнуліся вызначыць характар яго будучай працоўнай дзейнасці. Як толькі яно пачынала праяўляць цікавасць да навакольнага свету, да рэчаў, што яго акружалі («бавіцца цацкамі»), бацькі клалі на стол грошы, сякеру, зерне, кнігу, для дзяўчатак – кудзелю, нажніцы і глядзелі, за які прадмет перш за ўсё ўхопіцца дзіця. Паводле народнага меркавання, адпаведным рамяством яно і будзе займацца ўсё жыццё. У іншых месцах усе вышэйназваныя прадметы маці выпякала з цеста і таксама расклад-

вала на стале перад дзіцём. Калі яно і ў другі раз хапалася за той жа самы прадмет, то ўжо ніякіх сумненняў наконт яго будучай працоўнай дзейнасці не заставалася (М. Нікіфароўскі). Паўтаралася гэтая дзея і пры адыманні дзіцяці ад мацярынскіх грудзей: *«Калі аднімаюць дзіця ад грудзей, кладуць перад ім хлеб, грошы і кніжку. За што дзіця напачатку схопіцца, таго і будзе пільнавацца ўсё жыццё»* (Е. Раманаў); *«Дзецям, аднімаючы іх ад грудзей, даюць тры рэчы на выбар: грошы, розгі і кніжку. Калі выбера першае – будзе багаты, другое – дабрачынны, трэцяе – разумны»* (А. Сержпутоўскі); *«Як адымаюць, на стале кладуць дзеньгі, хлеб, воўну. Мама пакорміць пасследні раз кала стала, паварачаваецца – за што ён перва ўхваціцца: за дзеньгі – будуць дзеньгі, за воўну – скот будзець добры»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на).

## Маці і дзіця ў маленстве

На працягу сарака дзён пасля родаў стан парадзіхі ўспрымаўся як межавы («На радзіху сорак дзён яма зявае»), яна лічылася «нячыстай», па сканчэнні перыяду мусіла «ўводзіцца» ў царкву, а таксама прытрымлівалася ў сваіх паводзінах пэўных абмежаванняў. Так, забаранялася жанчыне заходзіць да суседзяў, мясіць хлеб, хадзіць па ваду да калодзежа, ёй не дазвалялася наведваць храм. Калі ж здаралася пільная патрэба зайсці да суседзяў, жанчына мусіла ўзяць з сабой кавалачак хлеба і пакласці яго на прыпечак, каб у тых, да каго яна прыйшла, «не біўся посуд».

Парадзіха павінна была засцерагацца ад прастуды, сурокаў, не ўступаць у інтымныя адносіны з мужам, бо гэты перыяд лічыўся вельмі небяспечным для яе (*«на радзіху магіла адкрыта»*) (П. Шэйн). Пасля заканчэння 40-дзённага тэрміну парадзіха ішла ў царкву (касцёл) для ачышчэння «ўводу»: *«Праз 6 нядзель маці і дзіця ідуць у царкву. Бацюшка хлопца нясе за царскія вароты, дзеўку – да варот, за ім уводзіцца і жанчына. Казалі "пойдзе ўводзіцца", да ўвода няльзя было жыць з мужам»* (в. Клінок Чэрвеньскага р-н); *«Радзіха ідзець увадзіцца чэраз 6 нядзель»* (в. Асвея Верхнядзвінскага р-на). Пасля здзяйснення «ўводу» ўсе забароны здымаліся, і сям'я парадзіхі спраўляла невялікую ўрачыстасць («уводзіны»), куды запрашаліся кумы і блізкія сваякі.

У беларускай вёсцы мінулага стагоддзя дзяўчына, якая нарадзіла пазашлюбнае дзіця, падвяргалася ўсеагульнаму асуджэнню. Так, калі для здзяйснення абраду ачышчэння ў царкву прыходзіла маладая жанчына, што нарадзіла «байструка», святар клаў ёй на галаву вянок з гарохавай саломы з доўгім гарохавым хвастом і загадваў абвесці



*Маці і дзеці з в. Цераблічы. Столінскі р-н. Фотаздымак з Інтэрнэту*



*Маці з дзецьмі з в. Цераблічы Столінскі р-н. Фотаздымак з Інтэрнэту*



*Дзеці і маці з в. Цераблічы. Столінскі р-н. Фотаздымак з Інтэрнэту*



*Дзеці з в. Цераблічы. Столінскі р-н. Фотаздымак з Інтэрнэту*



*Жонка рыбака з дзецьмі ля ўласнай хаты з в. Кудрычы. Пінскі р-н. Фотаздымак з інтэрнэту*



Маці з дзецьмі з с. *Пісараўка. Клінцаўскі павет, Унечская воласць. Гомельская губерня. Фотаздымак А. Сержпутоўскага*

яе тры разы вакол царквы і прывязаць да дрэва. Там яна стаяла некалькі гадзін, што з'яўлялася добрым урокам для іншых дзяўчат, каб яны захоўвалі сваю цнатлівасць да шлюбу (Гродзенскі павет) (П. Шэйн).

На першым годзіку жыцця немаўляці мама была для яго асноўнай выхавацелькай, нянькай, карміліцай-паіліцай, даглядчыцай. Традыцыйнай нормай адносін маці да сваіх дзяцей і дзяцей да маці ў беларусаў былі клапатлівыя, эмацыянальна цёплыя, паважлівыя, даверлівыя адносіны.

З першых дзён з'яўлення дзіцяці асаблівае значэнне набываў вербальны код, які праз калыханкі-замовы таксама засцерагаў яго ад уздзеяння злых сіл, садзейнічаў росту, развіццю і выхаванню. У традыцыйнай сям'і калыханкі для немаўляткі спявала маці ці бабуля. Калыханка маці прызначалася не толькі для таго, каб заспакоіць дзіця і мякка ўвесці яго ў сон, – яна была таксама зыходнай формай далучэння дзіцяці да свету блізкіх людзей. Дзеці слухалі калыханкі, забаўлянкі, засвойвалі асноўныя паняцці, знаёміліся з навакольным светам. Таму так шмат у калыханках памяншальна-ласкальных слоў, галоўныя героі калыханак – кот, куры, галубы. Сучасныя псіхолагі даказалі, што мурлыканне ката супакойвае. Адсюль «спяваць ката» азначае «спяваць

калыханку». Калыханка не толькі закалыхвала, заспакойвала дзіця, але і ўводзіла яго ў казачны жыццёвы свет, вучыла народнай мудрасці, спрыяла росту і развіццю дзіцяці. Праз калыханку дзіця засвойвала першапачатковы слоўнікавы запас, без якога немагчыма было пазнанне навакольнага свету, развіццё мыслення. Сустракаліся адны і тыя ж апаэтызаваныя персанажы, прадметы, з'явы прыроды. Паходжанне калыханак вельмі старажытнае, пра што сведчыць замоўная форма некаторых з іх:

Ходзіць коцік па капусце,
Носіць сон у белай хусце,
Ходзіць коцік па палях,
Носіць сон у кашалях.
Бабка коціка прагнала,
Сон для дзеткі адабрала,
А ты, коця, вон, вон,
А дзіцяці – сон, сон

(в. Баранава
Старадарожскага р-на).



*Жанчыны з дзецьмі. Палессе. 1930-я гг. Фотаздымак Ю. Шыманьчыка*



*Дзіця ў люльцы на двары. Палессе. 1930-я гг. Фотаздымак Ю. Шыманьчыка*



*Кот – герой калыханак.*
*Фотаздымак Т. Валодзінай*

Старэйшыя жанчыны да гэтага часу вельмі добра памятаюць традыцыйныя калыханкі і нават калі-нікалі іх спяваюць сваім праўнукам і праўнучкам:

Пашоў коцік у лясок,
Нашоў собе поясок,
А ты, Васька, параймай,
Поясочка отбірай,
Паражы попрушку,
Да спі цэлу ношку

(в. Хатынічы
Ганцавіцкага р-на).

* * *

Баю-баю-бай,
А ты, Васька, засыпай,
А ты, Машка, не ходзі,
А мне Ваську не будзі,
Няхай Васько крэпко спіць,
А ты, Машка, не будзіць

(в. Хатынічы
Ганцавіцкага р-на).

* * *

Люлі-люлі, люлі,
Прыляцелі гулі,
Селі на варота
У чырвоных ботах,
Сталі шчабятаці,
Трэба ім естачкі даці.
Пасып, сынка, грэчкі,
Каб неслі яечкі

(в. Мётча Барысаўскага р-на).

* * *

*Люлі-люлі-люлі,*
*Палез кот на дулі,*
*Ці самому з'есці,*
*Ці хлопчыку занесці*

(в. Мётча Барысаўскага р-на).



*Каты –
героі калыханак.
Фотаздымак
Т. Валодзінай*



* * *

Пашоў коцік вон, вон,
Прынясі дзіцяці сон, сон,
Які той сон? – Да прыятны,
Нашаму Валодзьку да панятны

(в. Касцяшы Уздзенскага р-на).

* * *

Пашоў коцік пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток,
Пытаецца, дзе мне дзець?
Ці самому з'есці,
Ці дзіцяці несці

(в. Касцяшы Уздзенскагаі р-на).

* * *

Люлі, люлі, люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на варотах
У чырвоных ботах,
Сталі сакатаці,
А што есці даці,
Далі курам грэчкі,
Каб неслі яечкі
А куры грэчкі не ядуць
І яечак не нясуць

*(в. Крычкі Мінскага р-на).*

* * *

А псік, каток, пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток,
Ці самому есці,
Ці дзіцяці несці.
Я й сам разок укушу,
І дзіцятку занясу

(в. Крычкі Мінскага р-на).

* * *

Баю-баюшкі-баю,
Не лажыся на краю,
Прыдзя шэранькі ваўчок
І ўкуся за бачок

(в. Крычкі Мінскага р-на).

* * *

Люлі, люлі, люлі,
Палез кот па дулі,
Да памерзлі лапкі,
Полез кот на полаткі,
Сталі лапкі грэцца.
Німа котку дзе дзецца

(в. Рог Салігорскага р-на).

* * *

Люлі-люлі-люлі,
Усе дзеткі паснулі,
Адна Танячка ня спіць,
Як серы каток вурчыць,
І ня спіць, і ня гуляе,
Усіх дзетак разбужае

(в. Клінок Чэрвеньскага р-на).

* * *

Люлі-люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на варотах,
У чырвоных чаботах,
Сталі куткудаці,
Што вам есці даці:
Дала б я вам проса,

Бочачка паросла.
Дала б я вам жыта,
Бочачка забыта.
Дала б я вам пшэніцы,
Шчэ з вас мало водыцы.
Шчэ з вас, куркі, мало,
Шчоб вас разарвало

(в. Моталь Іванаўскага р-на).

* * *

Люлі-люлі-люлі,
Дзеткі ўсе паснулі,
Толькі коця ходзіць па балоце,
Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток,
Ці самому есці, ці дадому несці?
Думаў, думаў наш каток,
Адкусіў адзін разок,
І панёс дадому хлопчыку малому

(в. Грышын Клімавіцкага р-на)

* * *

Люлі-люлі, каточок,
Злізаў бабчын мядочок,
Сама бабка злізала,
На коціка сказала.
Пашоў, коцік, пашоў вон,
А на Іваньку добры сон

(в. Родня Клімавіцкага р-на).

* * *

Трэба катка біты,
Каб не будыў дзіты,
Трэба котка вэльмі,
Шчоб не стукаў двэрмі

(в. Моталь Іванаўскага р-на).

* * *

Хадзі, сонейка, да нас,
Будзе табе добра ў нас.
У нас хата цяпленькая,
А Маруся маленькая.
Люляй Марусю, люляй,
Вочкі стуляй, стуляй

(в. Турэц Чэрвеньскага р-на).

Зараз выяўлена, што на першым месяцы жыцця мелодыя калыханкі, як асаблівы гарманічны гукавы строй, супакойвае немаўля, і назаўсёды застаецца ў падсвядомасці як увасабленне гармоніі, спакою, шчасця. Менавіта яна (ужо неўсведамляная!) часта ўтрымлівае чалавека ад адчаю ў цяжкіх жыццёвых абставінах і ў гэтым сэнсе ахоўвае яго жыццё.

Каб дзіцятка супакоіць перад сном, яму распавядалі доўгі вершык і пры гэтым гладзілі па спінцы:

Мышка, мышка,
Дзе ты была? – у Бога ткала.
А што ты зарабіла? – кусок сала.
А дзе тое сала? – кошка ўкрала.
А дзе тая кошка? – пад печчу пабегла.
А дзе тое падпечча? – вадою заплыла.
А дзе тая вада? – сівы волы папілі.
А дзе тыя волы? – на войну пашлі.
І там іх пабілі

(в. Церабаў Петрыкаўскага р-на).

* * *

Сіўка-варонка, куда паляцела,
На Іванаў двор,
Што Іван дзелаець – касу клепе,
А на што яму каса – сена касіць,
А на што яму сена – карову карміць,
А на што карова – малако даіць,
А на што малако – дзетак карміць,
А на што дзеці – свінней пасці,
А на што свінні – жалуды збіраць,
А на што жалуды – свінней карміць,
А на што свінні – гару капаць,
А дзе тая гара – зарасла краскамі,
А дзе тыя краскі – дзеўкі парвалі,
А дзе тыя дзеўкі – замуж пашлі,
А дзе тыя мужыкі – пашлі на гумно

(в. Мыслеўшчына Клімавіцкага р-на).

З дапамогай органаў пачуццяў дзіця ўспрымала навакольны свет. Дарослыя актыўна дапамагалі развіццю слыху, зроку, такцільных адчуванняў, нюху, смаку.

Згодна з правіламі народнай педагогікі беларусаў, каб выхаваць здаровага, жыццярадаснага чалавека, у дзіцяці патрэбна было ў часы

яго рухавасці падтрымліваць радасныя эмоцыі. Для гэтай мэты існавалі разнастайныя забаўлянкі, якія спалучаліся з фізічнымі практыкаваннямі і своеасаблівым масажам. Забаўлянка вырашала адначасова тры задачы: развівала дзіця фізічна, вучыла яго паслядоўна мысліць, даравала радасныя эмоцыі.

Вядомая паўсюль на Беларусі гульня з ручкамі дзіцяці «у ладкі / ладачкі», дзе неабходныя рухі выконваліся, падпарадкоўваючыся такту песенькі:

* * *

Ладкі-ладушкі, прыляцелі птушкі,
Селі на варотах у чырвоных ботах,
Сталі шчабятаці, што дзіцяці даці:
Адна кажа – піражок, а другая – кока,
З вароніна вока

(в. Клінок Чэрвеньскага р-на).

* * *

Ладушкі-ладкі,
Дзе былі? – у бабкі.
Шчо вы елі? – кашку.
Шчо вы пілі? – брашку.
Шчо вы елі? – ко-ко-ко.
Шчо вы пілі? – молоко.
Мы і заўтра пойдзем да бабулькі нашай,
Абяцала бабка бярозавай кашы

(в. Чыжаха Бярэзінскага р-на).

* * *

Ладачкі, ладачкі,
Дзе жылі? – У бабачкі.
Што елі? – Аладачкі.
Аладачкі с алеем,
А мы есці ня ўмеем

(в. Касцяшы Уздзенскага р-на).

У вялікае захапленне прыводзіла дзіця гульня з яго пальчыкамі, якая таксама суправаджалася рытмічнымі прыгаворамі-песенькамі:

Сарока-варона,
Дзеткам кашу варыла,
На прыпечкі дзяліла,
Гэтаму – дала, гэтаму – не дала.

Гэты воды не насіў,
Гэты цеста не мясіў,
Гэты кашкі не прасіў.
Кыш-кыш-кыш

(в. Галаўныя Ляды Бярэзінскага р-на).

* * *

Сорока-варона.
По прыпечку скакала,
Дзеткам кашку давала,
Етаму дала, етаму дала.
А етаму не дала,
Ён вады не носіў,
Кашы не варыў

(в. Рог Салігорскага р-на).

* * *

Чэ-чэ, сарока,
А дзе была? – далёка.
А ў пана на таку,
Намалола на муку,
Дзецям кашку варыла,
На прыпечку студзіла,
Качаргою мяшала,
Усім дзеткам давала.
Я й гэтаму дала[1],
А гэтаму не дала,
І дубчыкам пацяла,
А ты дроўцаў не насіў,
І ты кашкі не варыў

(в. Крычкі Мінскага р-на).

* * *

Варона, сарока,
Па прыпечку скакала,
Дзеткам кашку мяшала:
Гэтаму дала, гэтаму дала,
А гэтаму не дала,
Бо ён дроў не насіў,
Вады не прыносіў,
Кашы не мясіў.

*«Усё гэта ўжо прыгаворвалі на кажны пальчык, маленькаму пальчыку нічога не давалі, бо ён нічога не рабіў»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на).

[1] Паўтараецца тры разы.

* * *

*«З рукамі гулялі, я й сама прыказвала:*

Сарока-варона,
На прыпечку сядзела,
Дзеткам кашу варыла,
Етаму дала, етаму дала,
А етаму не дала,
Бо ён пальчык-гультайчык,
Дроў не насіў, вады не насіў.

*Цяпер унуку 5 гадоў, расказвала, да ён: "Баба, а чаму не дала? Нада ж было хоць нямножачка даць. Ён другі раз будзе насіць»* (в. Церабаў Петрыкаўскага р-на).

Праяўляючы клопат аб умацаванні мышц спіны, аб развіцці смеласці ў малога, яго падкідвалі ўверх на адной руцэ, прытрымліваючы другой, што суправаджалася рытмічна пабудаванымі вершамі:

*Чук-чук-чук,*
*Налавіў дзед шчук,*
*А баба – плотак,*
*Ды пазвала цётак*

(в. Крычкі Мінскага р-на).

Адпаведнымі забаўлянкамі суправаджалася і казытанне ножак дзіцяці:

*Кую-кую ножку,*
*Паедзеш у дарожку,*
*Дорожка крывая,*
*Кабылка ліхая*

(в. Будагова Смалявіцкага р-на).

* * *

*Кую-кую ножку,*
*Поеду ў дарожку,*
*Дарожка крывенька,*
*Кобылка сляпенька*

(в. Рог Салігорскага р-на).

* * *

*Кую-кую ножку,*
*Паеду ў дарожку,*
*Дарожка крывая,*
*Кабылка храмая*

(в. Крычкі Мінскага р-на).

* * *

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая

(в. Касцяшы Уздзенскага р-на).

* * *

Кую-кую, ножку,
Паеду ў дарожку,
Заўтра рана
Зарэжу барана,
Не барана, а казла,
Каб ножачка падрасла

(в. Мётча Барысаўскага р-на).

* * *

Кую-кую ножку,
Поеду ў дорожку,
Дорожка крывэнька,
Кобылка сляпэнька,
Зашчопілаcа за пэнь,
Ды стояла цэлы дэнь.
І дзяўбэ ножку»

(в. Хатынічы Ганцавіцкага р-на).

А якая асалода і для дарослых, і для дзіцяці яго казытанне, якое заўсёды суправаджалася залівістым дзіцячым смехам:

* * *

Ідзе каза рагатая,
Нясе дзіця пузатая,
Як ідзе – упадзе
І на рожкі паднясе

(в. Крычкі Мінскага р-на).

Калі быў час, бацька ці дзед гушкалі немаўля на назе, таксама прыгаворваючы ў такт гушканню:

На коніку едзе Янка,
За тры рублі санкі,
Паўтара рубля дуга,
Іга-га, іга-га

(в. Клінок Чэрвеньскага р-на).

Па-markdownрознаму забаўлялі немаўля:

Гусі-гусі – га-га-га,
Есць хаціця? – да-да-да
(в. Церабаў Петрыкаўскага р-на).

Ва ўсіх гэтых творах замацаваны выпрацаваныя шматгадовай практыкай народа веды па фізічным выхаванні дзяцей гэтага ўзросту. Акрамя таго, у іх даваўся пазнавальны матэрыял, закладваліся асновы маральнасці і норм паводзін у будучым жыцці, адбывалася знаёмства з багаццем роднай мовы, што сведчыць пра глыбіню народных ведаў па псіхалогіі дзіцячага ўзросту.

Адметнасцю педагогікі пеставання было тое, што жаданні дзіцяці імкнуліся выканаць (у гэтым узросце яны яшчэ дастаткова простыя), а пры немагчымасці – пераключыць увагу на іншае. А зрабіць гэта працей за ўсё было з дапамогай цацак, у якасці якіх для немаўляткі былі кавалак морквы, рэпы, бручкі або сухарык, пернік, абаранак ці маленькая цурачка, гладкая костачка. Праўду ж кажуць: «Чым бы дзіця не бавілася, абы не плакала». Над калыскай падвешвалі мячыкі з каляровых нітак, драўляныя лыжкі, якія немаўля лавіла ручкамі. Былі ў маленькіх дзяцей і бразготкі, зробленыя з пузыра цялят або свіней, які папярэдне адціралі залою, пасыпалі соллю і высушвалі. А пазней у сярэдзіну кідалі сухія гарошыны, гузікі, костачкі, маленькія каменьчыкі, надувалі яго, фарбавалі – вось вам і бразготка. Дарослыя стараліся даваць дзіцяці тыя прадметы, якія не пашкодзяць яму, бо, вядома ж, немаўля ўсё, што трапіцца ў рукі, цягнула ў раток. Да маленькіх практычна ніколі не прымяняліся сродкі пакарання; спакой, пяшчота, спагадлівасць вызначалі адносіны да дзяцей гэтага ўзросту ў сям'і. Разам з пазнаннем навакольнага свету развівалася мова дзіцяці.

Сфарміраваная ў раннім дзяцінстве, у першую чаргу маці, эмацыянальная сфера «адказвала» за душэўнае і псіхічнае здароўе чалавека, гарманічнасць і глыбіню светаўспрымання, за правільнае і арганічнае развіццё маральных якасцей асобы, за своеасаблівы «гармон шчасця», пры дапамозе якога чалавек быў здольны пераадолець любыя жыццёвыя цяжкасці.

Асноўныя функцыі маці ў сям'і – догляд, кармленне, клопат пра дзяцей: «*Маці сама не з'есць, а дзіця накорміць*». Маці і на адлегласці адчувае небяспеку, якая пагражае дзіцяці, і ягоны боль і здольная «забіраць боль на сябе». Быць маці азначала не проста нарадзіць дзіця, але і вырасціць, выхаваць яго. Лічылася, што бацькі павінны «давесці да розуму» дзяцей, гэта значыць абавязкі бацькоў у адносінах да дзяцей



*Маці і дзеці. Палескія тыпы. Пінск. Паштоўка. Фотаздымак з Інтэрнэту*



*Шчаслівае мацярынства. Фотаздымак Я. Пясецкага*

заканчваліся толькі ў момант іх уступлення ў шлюб. Да гэтага часу бацькі павінны былі «карміць» (гэта значыць клапаціцца пра іх харчаванне, адзенне, побытавыя патрэбы) і «вучыць». Паняцце «вучыць» – адзіны тэрмін для абазначэння ўсіх аспектаў сацыялізацыі, што сустракаецца ў беларускім фальклоры: *«Умеў дзіця радзіць, умей і вывучыць»; «Хто дзіця мае, няхай навучае»; «Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць»; «Не крычы, а лепш навучы»; «Не біце вяроўкамі – навучайце гаворкамі»; «Не біце дубцамі, навучайце слаўцамі»* і інш. Верагодна, у народнай свядомасці ён меў нейкі ўніверсальны сэнс «вучыць жыццю», што прадугледжвала перадачу дзі-



*Сям'я. Фотаздымак з Інтэрнэту*

цяці ўсёй сукупнасці жыццёвага вопыту, ведаў, уменняў і навыкаў, якімі валодалі маці і бацька. Для дзяцей сям'я з'яўлялася асяродкам жыхарства і выхавання, якое ажыццяўлялі бацькі, родныя. Дапамагалі глядзець немаўлят і старэйшыя дзеці ў сям'і.

Маці, у якой было немаўлятка, у тагачасных бытавых умовах даводзілася вельмі шмат працаваць, не дасыпаць, не даядаць, каб выгада-



*Дзеці ў вёсцы. Палессе. Фотаздымак З. Хамэнтоўскай. 1935–1936 гг.*



*Бацькі з дзецьмі ў в. Бераснёўка. Докшыцкі р-н. Фотаздымак І. Н. Кудзеркі 1972 г.*

ваць дзіця. Асабліва цяжкім часам для іх было жніво: *«Даўней жа ідзе жаць і дзіцятка нясе. Былі такія тры палкі, на іх калыскі падвешалі»* (в. Сосенкі Вілейскага р-на); *«Народзіцца дзіцятка, такія палкі, цыганы называліся, і люльку на плечы, калыску і з маленькім на поле. Эта нашы маткі так жылі»* (в. Свірыдавічы Рэчыцкага р-на); *«Жалі з ранку і да вечара, этыя паласы канчалі. Паласа – восім сажон у шырыну і семдзісят сажаней дліны, а сажань – два метры. Штоб усё выжала, а то ня пусьцяць дадому. А малых дзяцей бралі с сабой, то дзелалі ад сонца такі цянёк, буданок. Вырывалі з падсолнуха сьцеблі, абтрушвалі каранішчы і дзелалі такі буданок, закрывалі радном, полаг дзелалі. Бралі радно*



*Парахоньская вёска. Палессе. Фотаздымак З. Хамэнтоўскай. 1930 г.*

*с сабой: радно – ета даматканая посьцілка. Дзелалі такі буданок і туда дзяцей хавалі ад сонца, а маці жалі. Мухі, камары, канешне, заляталі, но трэба ж было працаваць. Дзіця само па сабе, а жнейкі працавалі»* (в. Глыбоцкае, Гомельскага р-на); *«Дзяцей насілі, пялі паставя, дзіцёнка етага сюды, а сама жне. А, як большанькія дзеткі, дак вучыліся жаць. А меньшанькая калыша ўжо таго дзіцёнка. З дзеткамі, з малымі я па семсот трудадней выганяла. Вот выгань 700 трудадней, выгань! Дзень – жну, а ноч – вею»* (в. Кучын Кармянскага р-на); *«Жалі і детей бралі на поле, колыску бралі. На кіе повэсыть гэту колысэчку, дай пошла жаті. А заплаколо дітя, разослала пелёночку, пэропов'е, пэропеленае, дась цыцкі і іпять пошла жаті»*



*Калыска. Палессе. Фотаздымак З. Хамэнтоўскай. 1939 г.*



*На жніве. Канец XIX ст. Фота з Інтэрнэту*



*Сялянка каля дзіцяці падчас жніва. Заходняе Палессе. Фота Ю. Шыманьчыка. Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў. 1935 г.*

(в. Амельная Івацэвіцкага р-на); *«Мая дочка была малюсенька. Вот іду жыта жаць з ею. Гаспадар дзяравяныя начовачкі зрабіў, я яе палажыла ў гэтыя начовачкі, пад мышку, а ў другой руццэ серп нясеш і збанок есьці нясеш. Пару снапочкаў нажнем, паставім іх і дзіця туды паложым, каб сонца ні пякло. А яно там плача, а маці яго і ні возме – паплача ды сціхне. Дам грудзей, пасасе – да й пашла жаць. Я ж ні магу адстаць, каб сказалі, што я плахая жняя»* (в. Хрольчыцы Дзятлаўскага р-на); *«Наша поле далеко было, восем кілометраў <ад дома>. Ідзём з дзяцямі, босыя і ногі пазбіваем. Цяжко было. Прыдзем на поле, зробім такі цянёк, каб сонца ні паліло на дзіця, дай жаць хутчэй. А ці яно там плача – ні глядзелі асоба. Паплача дай сціхне. Пакорміш яго толькі і пашла»* (в. Паўлава Слонімскага р-на); *«Былі такія калыбелькі зробленыя з абручыкаў і палатна. На плечы калыбельку тую, дзіця на рукі – і ідземо. Пяшком хадзілі з дзецьмі жаць. Калыбельку паставіш на ражны: трыножык такі, радзюжкаю абгорнеш, каб дзіцяці ні горачо было, а сам жнеш»* (в. Стукалы Мастоўскага р-на).

Замужніх жанчын ніхто падчас жніва не вызваляў ад іх штодзённых абавязкаў: *«Хватала этым жнеям: і вячэру наварыць, і дзяцей накарміць, і мужа не ўгнявіць»* (в. Смалегаў Нараўлянскага р-на).

Бяздзетнасць – гора, няшчасце, але і шматдзетнасць таксама выклікала супярэчлівыя пачуцці ў навакольных. З аднаго боку, ідэал традыцыйнай сям'і дапускаў шматдзетнасць, таму маці вялікага сямейства карысталіся павагай, ім вясковая супольнасць давярала выкананне важных для ўсяго соцыума функцый: пачаць уборку новага ўраджая, абысці статак пры першым выгане на пашу і г. д. З другога – з-за рэальных цяжкасцей, з якімі сутыкалася вялікая сям'я, бытавала мерка-



*Капанне бульбы. Палессе. 1935 г. Фотаздымак З. Хамэнтоўскай*



ванне, што шматдзетнасць пасылаецца Богам за грахі, ці што яна – вынік чараўніцтва: такая маці раджае за сябе і за другіх.

Адносіны да маці залежалі таксама ад таго, ці былі жывыя ўсе яе дзеці. Трэба адзначыць, што пры высокай дзіцячай смяротнасці ў мінулым практычна ў кожнай сям'і былі дзеці, што памерлі ў першыя месяцы пасля нараджэння: *«Няма той мамкі, каб не было ямкі»* і інш. Асабліва вялікай была адказнасць маці, калі дзеці паміралі нехрышчонымі. Паўсюль у беларусаў (і не толькі) смерць дзіцяці, згодна з нормамі звычаёвага права, накладвала на маці абавязкі: яна не мела права есці садавіну, пакуль тая не будзе асвечана ў храме на Яблычны Спас (6/19 жніўня), бо ў такім разе яе дзіця на «тым свеце» не атрымае гэту садавіну: *«У каго памерлі дзеці, яблыкаў ня елі да Іспаса. Прысказка такая была, што маці з'ела яблычка, дак усім дзецям на том свеце давалі па яблычку, а яму ўжо ня далі, таму дзіцяці. Кажуць, твая ж маці – свіння: непасвяцоная яблыка з'ела. Дак ён ужо абіжаўся на том свеце, мальчык той. Мая мама ніколі ня ела яблыкаў да Іспаса, бо хлопчык у нас памёр маленькі, да года»* (в. Клінок Чэрвеньскага р-на); *«Да Іспаса яблыка ўжо ня есць – ці дзеці памёрлі, у каго сястра, ці брат, мужык, ніхто ня еў яблыкаў. Асабліва ўжо маці, у каго дзеці памёрлі, эта, кажуць, ім на том свеце яблычка не дадуць»* (в. Касцяшы Уздзенскі р-на); *«У каго дзеці памерлі, ня должан да Спаса есьці яблыкаў, бо малому на тым сьвеце не дадуць яблыка. Я да Спаса яблыкаў ня ем, у мяне маленькі памёр. Тады ўжо гэты яблычак* <асвечаны> *зьем нашча, на Спаса»* (в. Акцяброва Кармянскага р-на); *«Да Спаса ня елі яблыкі, у каго дзеці маленькія ўміраюць. Нельзя есьці яблыкаў, таму*

*што тыя дзеткі будуць хацець яблычка, а ім не дадуць на тым сьвеце. Мама мая нікада ня ела, патаму што ў вайну двое маленькіх дзяцей у яе ўмерла»* (в. Буркі Брагінскага р-на); *«У кого деті умерлі, не елі. А то прыде до Бога: "Де мое яблоко? – А Бог скажэ: "Твое яблоко сьвіня зьела". Значыть, не выдержала* <маці> *– і яму яблоко не попаде»* (в. Грабяні Лельчыцкага р-на); *«У каго памёр дзіцёнак малы, значыцца, такая мудрасьць дзеравенская: хто будзя есьці яблыка да Спаса, бацька ці маці – дак тому дзіцяці на том сьвеце яблычка не дадуць. Будуць дзяліць на том сьвеце яблычкі на Спаса: усім дадуць, а тваё яблычка сьвіньня зьела. Дак у нас такія людзі, што дзеці памёрлі, ня ядзяць. А ўжо на Спаса тады пасьвецяць, а тады ўжо ядзяць»* (в. Сцяпы Жлобінскага р-на); *«У каго дзіцё ўмерла – маме няльзя яблычка да Спаса есьці. Я помню, наша Анюта, у яе дзевачка памёрла, да Спаса зьела яблыка. І сасніўся ёй сон, што, дзевачка яе гавора: "Усім прынясьлі па цэламу яблычку, далі, а мне дык кусочак толькі". Дак вот ета мне запала ў душу, за тое не далі* <дзіцяці>, *што мама зьела яблыка»* (в. Стоўпня Рагачоўскага р-на); *«Тая жанчына, шчо дзеці вміралі, не ела яблыка, покі не посвяцяць. Казалі, то тогды дзеці ўмэршыя казалі на тым свіці: "У нас няма яблычка, наша яблычка свіння з'ела". А праўда ці няпраўда, хто яго знае»* (в. Вулька-1 Лунінецкага р-на); *«Старыя людзі да Спаса ні елі яблыкаў, грушаў, пака не пасвенцяць. Гаварылі, што ў каго памёрлі дзеці, бацькам няможна есці да Спаса яблыкі, бо на том свеце іх дзецям не дадуць яблыка»* (в. Курылавічы Мастоўскага р-на); *«Калі памёрлі дзеці, то яблык нільзя есьці да Спаса, бо на тым свеці, як будуць дзяліць дзецям яблычкі, то ўсім дадуць, а твайму не дадуць. Скажуць, што тваё яблычка свіння з'ела»* (в. Лозкі Дзятлаўскага р-на).



*На Яблычны Спас у в. Рычоў. Жыткавіцкі р-н. Фота В. Лабачэўскай. 2007 г.*

У многіх раёнах з асвечанымі яблыкамі наведвалі могілкі, *«каб дзецям на том свеці далі яблычка».*

## Узаемаадносіны паміж роднымі і хроснымі бацькамі, хроснай бабкай

Да спаўнення дзіцяці аднаго года ў беларускай вёсцы выконваліся звычаі і абрады, закліканыя наладжваць адносіны, якія ўзніклі паміж сям'ёй дзіцяці, з аднаго боку, і кумамі і хроснай бабкай – з другога. На ўсходзе Беларусі сустракаўся звычай пад назвай «несці кумам пірагі» пакуль дзіцяці не споўніўся год: парадзіха пякла жытні ці пшанічны хлеб і несла яго (абавязкова няцотную колькасць булак) і падарункі кумам і хроснай бабцы, яны ж давалі ёй грошы, а пазней павінны былі аднесці («аддзячыць») ёй свае пірагі. У некаторых вёсках згаданы звычай захаваўся да нашых дзён: *«Пірагі ж насілі ў Каляды, пакудава годзіка нету дзіцёнку. Нада ж было, штоб было пяць, трі, нячетная чісло. Парадзіха насіла куму, куме і бабі. Первы дзень носяць бабе, на Новы год ілі Кряшченье, ілі любы другі дзень, у цяченіі Каляд нада было пірагі разнясці»* (в. Гарадзецкая Краснапольскага р-на)*; «Калі я нарадзіла дзіця, то я на Пасху адзін раз нясу сваім кумам падарак, валачобнае, і бабе таксама булку, яйкі – і яны назад даюць булку, яйкі і падарак. Толькі адзін раз»* (в. Пратасы Акцябрскага р-на).

І ў далейшым кумы і бабка з унукамі дапамагалі адзін аднаму выконваць разнастайныя сельскагаспадарчыя работы, падтрымлівалі сяброўскія адносіны, наведвалі адзін аднаго на значныя каляндарныя святы, абменьваліся падарункамі: *«Хрышчоныя бацькі звалі, вот я, напрымер, перахрысьціла дзіця ў каго, дак тая маці прыносіць пірог, яец скольві возьме, і ўжо кажа: "Бабцы ці куме атнясу пірог". Адзін дзень бабцы носяць, другі дзень – куму, а трэці дзень – куме»* (в. Касцяшы Уздзенскага р-на); *«У нас на Пасху носяць валачэньніцы ў каго радзілася дзіця на гэтым годзе. Дак ужэ нясе к бабе, к куме, к куму – п'юць, гуляюць усю Пасху»* (в. Ленькі Слуцкага р-на); *«Вот у мяне кума, вот сабіраюцца ў панядзелак і нясуць валачобнае. Прынесьлі яечкі, падаркі, булкі. Я ўжо іх частую, бо гэта ж кумы мае. А тады ж я іду, нясу, кладу яечкі, колькі ў іх дзяцей: адно – дак адно, пяць – дак пяць. У белай хустачке, у вузялок звяжам і нясем. Пачастуюцца. А, як невялікія дзеці, гадоў па 5–6, то старыя не ідуць, а дзяцей атпраўляюць і к бабцы, і к хросным»* (в. Пратасы Акцябрскага р-на).

Паўсюдна на Беларусі бабка і хросныя бацькі на Вялікдзень наведвалі сваіх малых хросных унукаў / дзяцей, насілі ім фарбаваныя чырвоныя яйкі і іншыя падарункі: *«А бабкі-павітухі, што дзяцей прымалі пры родах, давалі сваім унукам па пяць яек»* (в. Шутавічы Смаргонскага р-на); *«На Вялікдзень булку прынясуць, яічка красненькае. Бабка пры-*



*Абмен яйкамі ў в. Гайна. Лагойскі р-н. Фотаздымак Л. Загорскага*

*носіць, маці хрышчоная прыносіць дзецям, і бацько хрышчоны гэтак дае. Звалі "мой хрышчэнік", а дзеці "мама кросна", "тата кросны"»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на). У некаторых раёнах, наадварот, дзеці, абавязкова прыгожа апранутыя ў новае адзенне, на другі, радзей, першы дзень Вялікадня, наведвалі сваіх хросных бацькоў, хросную бабку: *«Хадзілі ў валачобнае на другі дзень. Устаем рана, ужэ ўсе начаку. Каб хутчэй па валачобнае. Ужэ мама дасць хустку з галавэ чысьценьку, увяжа там булкі ў тую хустачку, і бяжыш ужэ па валачобнае. Бяжыш перша да хрышчонай, да хрышчонаго, аддаеш ім гэту булку, а яны сваю булку ложаць, і шчэ яіц дзесятак давалі. Такая мода была. А там ішчэ, хто і канфет дась, а як ішчэ дзед і баба есь, то ляцімо шчэ і да дзеда, і да бабы»* (в. Вішнёўка Бераставіцкага р-на).

У паўднёвых раёнах Беларусі ў велікодны святочны дзень дарослыя мужчыны і жанчыны хадзілі ў госці да бабкі, што «бабіла» іхніх дзяцей, насілі ёй так званае *валачобнае*: пірагі, асвячоныя ў царкве стравы, палатно, намітку, гарэлку і інш. (А. Сержпутоўскі). Пра гэты звычай добра памятаюць сучасныя носьбіты традыцый: *«У нас валачонае яшчэ насілі бабе, каторая бабіла: есьлі рабёнку споўніўса год, бабе насілі пірагі і валачонае. Парадзіха на Вялікдзень нясе бабе валачонае, а баба саатветственна дае сваёй унуке – эта ўнукі называюцца – свой падарак, абменьваюцца падаркамі»* (в. Рог Салігорскага р-на). Наогул, у цёплы святочны дзень на вуліцы можна было пабачыць дзяцей усіх узростаў.

У Магілёўскай губерні, напрыклад, на другі дзень Каляд ладзілі *«бабіны»*. У гэты дзень бабка наведвала сваіх прыёмных унукаў і прыносіла ім пірагі і гарэлку. На другі вечар гаспадар кожнай хаты, дзе пабывала з візітам бабка, прыносіў ёй у адказ свой падарунак. На наступны дзень унукі збіраліся ўсе разам, ішлі да сваёй бабкі, урачыста выводзілі



*Дзеці на вуліцы. Фота з Інтэрнэту*

яе на двор, усаджвалі на санкі і вазілі па вёсцы, завозячы па чарзе ў госці да кожнага з іх (А. Дэмбавецкі).

У тых раёнах Беларусі, дзе святкавалі Масленіцу, у адзін з дзён масленічнага тыдня жанчыны наведвалі бабку-павітуху. Яны з усёй урачыстасцю выводзілі яе з хаты, саджалі на сані і вазілі па вёсцы з шумам, смехам, крыкамі і песнямі, акампанементам для іх служыла стуканне качалкі па пустых вёдрах. Сама павітуха і ўсе навакольныя лічылі гэта вялікім гонарам для яе, праяўленнем павагі. Павазіўшы так «гераіню дня» па ўсёй вёсцы, уволю накрычаўшыся, жанчыны цягнулі сані да карчмы ці да хаты і частавалі бабку, выказваючы ёй падзяку за своечасовую дапамогу і падтрымку падчас родаў кожнай з іх, жадаючы здароўя і найчасцейшага выкарыстання яе акушэрскага ўмення.

У аповедах носьбітаў традыцый, запісаных у апошнія гады, гэтыя звычаі і паводзінныя стэрэатыпы ўсебакова асвятляюцца: *«У нас на Масленіцу ў чацвер бабуля сабірала ўнукаў у госці, павітуха сваіх унучак сабірала ў госці. А кажная <жанчына> нясе там гасцінцы, падаркі. Бабка стол накрывая і гуляюць»* (в. Чорны Бор Быхаўскага р-на); *«На Масленіцу бабуля ўнучак сабірала, гэта ў чацьвер на Уласся, унучак сваіх і сваіх роцьсцьвеннікаў. Звала як у госці, ставіла стол. Падарак няслі бабулі, каждая ўнучка нясла»* (в. Заходы Шклоўскага р-на);

*«Запрагаюць каня ў сані, на сані ставяць скрыню, пакрываюць хусткай тарноўкай, рабілі такі шацёр на 4 палках і каталіся па вёсцы. Унукі ідуць на Масьленку ў госьці да бабкі-павівалкі. Каждая ўнучка нясе падарак. Бабка робіць застольле. Тады запрагаюць каня, скрыню ставяць на сані, за сані прывяжуць санкі, за санкі – начоўкі. Бабку пасадзяць ў начоўкі, катаюць. Пелі бабы, прытанцоўвалі:*

Бабка мая, любка мая,
Хто б цябе ўзяў, каб не я»

(в. Вуглы Капыльскага р-на)

*«На Аўласа, тыя разы казалі, баба ідзе, а ўнука яе частуя. У кожнай свая баба была, песню пелі:*

*Я на Уласа была*
*У сваёй унучкі.*
*Курачка знесла*
*Чатыры яечкі.*

*Баба занясе падарак, а ўнука бабе дасьць падарак»* (в. Семежава Капыльскага р-на); *«На Аўласа несьлі бабі-павітусе, якая бабіла дзіця, падарак: пірагі, каўбасу»* (в. Падлессе Слуцкага р-на).

У Кобрынскім павеце жанчыны ў дадзеным выпадку варылі спецыяльную абрадавую страву (*«селянку»*). У гаршчок налівалі смятану, клалі масла і грэлі на агні, пакуль маса не станавілася аднароднай, потым дадавалі сыр (П. Шэйн).

Вельмі цікавы звычай, звязаны з павітухамі, бытаваў на Мядзельшчыне, дзе ў час «бабінага лета» (7–14 кастрычніка па н. ст.) варажылі на шчаслівую бабулю. Усе дні загадзя раздавалі бабкам-павітухам, якія прымалі роды ў наваколлі: панядзелак – Тэклі, аўторак – Юстыне, сераду – Марцэлі і г. д. Калі дзень выдаваўся сонечны, ціхі, вясёлы, азначала, што рука ў бабулі лёгкая і роды пройдуць лёгка, дзіця будзе шчаслівае. На Беларусі ў гэтыя дні ўсталёўваецца, як правіла, цёплае яснае надвор'е, што нібыта сімвалізавала шчасце бабуль. Варажба надавала парадзіхам упэўненасці ў тым, што цяжарнасць і роды пройдуць лёгка і паспяхова (У. Васілевіч).

І ў паўсядзённым жыцці аднавяскоўцы не забывалі сваю павітуху, дапамагалі ўзараць і засеяць агарод, адведаць, калі яна захварэла, прыгатаваць ежу, памыць падлогу, запрасіць на вяселле, улазіны ці на вечар провадаў хлопца ў войска. Таксама ж паважліва адносіліся і да хросных бацькоў: *«Кросныя на вяселлі глаўныя, як жывыя, а як не жывыя, то ўжо бярэш каго другога, мо, сын яго, ці ў каго есць. А так, ну, кросныя былі. І каравай дзеляць, і ўсё. А як жа, і бабку звалі, абязацельна!»* (в. Паварчыцы Салігорскага р-на).

# ЛІТАРАТУРА


1. *Арлова, Г. П.* Этнапедагогіка : тэорыя маральнага выхавання / Г. П. Арлова. – Віцебск : 2001. – 107 с.

2. Беларускі дзіцячы фальклор : традыцыйныя запісы, апрацоўкі і аўтарскія творы [Метад. дапаможнік для муз. кіраўнікоў і выхавацеляў дзіцячых дашк. установ]: [Для спеваў у суправадж. фартэп. (баяна) і без суправадж.] // склад. А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, А. С. Фядосік, У. Д. Каструлёў. – Мінск : Беларусь, 1994. – 271 с.

3. Беларусы. Т. 5 : Сям'я. / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак і інш. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 375 с.

4. *Булгак, Я.* Край дзіцячых гадоў / Ян Булгак; [уклад., пер. з пол. і аўт. уступ. арт. Т. Г. Вяршыцкая; пер. вершаў з пол. С. І. Законнікава; аўт. камент., подпісаў да фотаздымкаў, бібліягр. і арт. І. Б. Кухарская]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 412, [3] с.

5. *Валодзіна, Т. В.* Цела чалавека : слова, міф, рытуал / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 431 с.

6. Дзіцячы фальклор / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [склад. Г. Барташэвіч; складальнік музычнай часткі В. І. Ялатаў; рэдактар тома К. П. Кабашнікаў; рэдкалегія: В. К. Бандарчык і інш.; уступны артыкул, с. 5–33, Г. Барташэвіч]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 733, [1] с. – (Беларуская народная творчасць : БНТ).

7. Жыцця адвечны лад : Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 607 с.

8. *Кабакова, Г. И.* Антропология женского тела в славянской традиции / Г. И. Кабакова. – М. : Ладомир, 2001. – 335 с.

9. *Киркор, А.* Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этнографический сборник. – Вып. 3. – СПб. : ИРГО, 1858. – С. 115 – 276.

10. *Кухаронак, Т. І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў : канец XIX – XX ст. / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

11. Міфалогія беларусаў : энцыклапедычны слоўнік / [склад. : І. Клімковіч, В. Аўтушка; навуковыя рэдактары: Т. Валодзіна, С. Санько]. – Мінск : Беларусь, 2011. – 605, [2] с.

12. *Навагродскі, Т. А.* Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стст. / Т. А. Навагродскі. – Мінск : БДУ, 2015. – 243 с.

13. Народная медыцына : рытуальна-магічная практыка / [уклад., прадм., с. 5–77, і паказ. Т. В. Валодзінай; навук. рэд. А. С. Ліс]. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 774, [2] с. – (Беларуская народная творчасць : БНТ).

14. *Никифировский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губернская типо-литография, 1897. – [2], X, 307, 30 с.

15. Радзінная паэзія / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [уклад. уступ. арт. і камент. М. Я. Грынблата; рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш.; падбор нот, характарыстыка напеваў і муз. камент. В. І. Ялатава; рэд. тома Г. І. Цітовіч]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 781, [1] с. – (Беларуская народная творчасць : БНТ).

16. Радзіны : Абрад. Песні / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы; [Уклад., сістэматызацыя тэкстаў Г. А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т. І. Кухаронак; Уступ. арт., камент. Г. А. Пятроўскай і інш.; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 635, [2] с. – (Беларуская народная творчасць : БНТ).

17. *Ракава, Л. В.* Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава. – Мінск : Ураджай, 2000. – 111 с.

18. Рождение ребенка в обычаях и обрядах. Страны зарубежной Европы / Н. Н. Грацианская, А. Н. Кожановский, О. А. Ганцкая [и др.].; Рос. акад. наук, Ин-т этнологии и антропологии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. – М. : Наука, 1997. – 516, [2] с.

19. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник [в 9 вып.] / Е. Р. Романов. – 1885–1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – 600 с.

20. *Самцэвіч, П. А.* Хрэсьбіны ў в. Унтальянка Барысаўскага раёну Менскай акругі / П. А. Самцэвіч // Наш край. – 1928. – № 11. – С. 34–42.

21. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі; Беларус. акад. навук. – Менск [Мінск : б. в.], 1930. – VII, [2], 276 с.

22. *Сицинский, А. А.* Акушерская помощь в Минской губернии (1880–1889 гг.) / А. А. Сицинский. – СПб. : Тип. П. П. Сойкина, 1893. – 212 с.

23. Сям'я і сямейны быт беларусаў / [В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Л. В. Ракава і інш.] – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 253 с.

24. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / [ідэя і агульн. рэд. : Т. Б. Варфаламеева]. – Мінск : Выш. шк., 2001 – Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе – Мінск. : Беларуская навука, 2001. – 797 с.

25. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / [ідэя і агульнае рэдагаванне : Т. Б. Варфаламеева]. – Мінск : Выш. шк., 2001 – Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; склад. : Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 910 с.

26. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2006. – Т. 3. Гродзенскае Панямонне: у 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – 608 с.

27. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / П. В. Шейн. – СПб. : Тип. Имп. Акад. Наук, 1887–1902. – Т. 1. Ч. 1 : Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – 1887. – 808 с.

28. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / П. В. Шейн. – СПб. : Тип. Имп. Акад. Наук, 1887–1902. – Т. 3 : Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, зна-

харство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, суеверья, приметы и т. д. – 1902. – 596 с.

29. Этнические стереотипы мужского и женского поведения. – СПб. : Наука, 1991. – 320 с.

30. *Jeleńska, E.* Wieś Komarowicze w powiecie mozyrskim / przez Emmę Jeleńskę. – Warszawa : Józef Jeżyński, 1892. – 83, [1] s.

31. *Federowski, M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej : materyały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877 – 1905 [у 3 т.] / przez Michała Federowskiego. – Kraków : Akademia Umiejętności, 1897 – 1981. – T. 1 : Wiara, wierzenia i przesądy z okolic Wołkowyska, Słonima, Lidy i Sokółki. – 509 s.

32. *Moszyński, K.* Polesie wschodnie : Materjały etnograficzne z wschodniej części b. powiatu Mozyrskiego oraz z powiatu Rzeczyckiego / K. Moszyński. – Warszawa : Wyd-wo Kasy im. Mianowskiego, 1928. – 304 s.

33. *Wereńko, F.* Przyczynek do lecznictwa ludowego / F. Wereńko // Materiały antropołogiczne i etnograficzne. – Kraków: Akademia Umiejętności, 1896. – T. 1. – S. 99–229.

# ЗМЕСТ


Уводзіны ........ 5

**Цяжарнасць** ........ 9

Каб вяліся дзеткі ........ 9

Зачатак жыцця ........ 13

Правілы для цяжарнай жанчыны і тых, хто побач ........ 17

**Радзіны** ........ 31

Роды ........ 31

Дапамога бабы-павітухі ........ 35

Абрадава-магічныя дзеянні з пупавінай і пасседам ........ 41

Варажба пра долю ........ 45

Першыя для немаўляці купанне, кармленне, укладванне ў калыску, адыманне ад грудзей ........ 47

Парадзіха і немаўля ў першыя дні пасля родаў ........ 62

**Першы год жыцця немаўляці і сям'і** ........ 66

Адведкі ........ 66

Наданне імя дзіцяці ........ 69

Выбар хросных бацькоў (кумоў) ........ 72

Хрэсьбіны ........ 74

Дзіця падрастае: першы зуб, першы крок, першае пастрыжэнне ........ 100

Маці і дзіця ў маленстве ........ 112

Узаемаадносіны паміж роднымі і хроснымі бацькамі, хроснай бабкай ... 132

Літаратура ........ 137

Навукова-папулярнае выданне

*Традыцыйны лад жыцця*

**Кухаронак** Таццяна Іванаўна

**РАДЗІНЫ І МАЛЕНСТВА**
**Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ**

Рэдактар *Т. В. Лапцёнак*
Мастацкі рэдактар *І. Т. Махнач*
*Тэхнічны рэдактар В. А. Тоўстая*
Камп'ютарная вёрстка *Л. І. Кудзерка*

12+

Падпісана да друку 04.09.2017. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера мелаваная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 8,37.
Ул.-выд. арк. 7,2. Тыраж 1000 экз. Заказ 2260.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск.

Выдавецкая серыя навукова-папулярных кніг "Традыцыйны лад жыцця" заснавана ў 2014 г. намаганнямі вучоных-этнографаў і фалькларыстаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з выдавецкім домам "Беларуская навука".

ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ

## Папярэднія выданні серыі




**Народнае мастацтва** / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 180 с. : іл.

Выданне ў даступнай, папулярнай форме асвятляе адзін з важнейшых відаў традыцыйнай культуры Беларусі – народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, мастацкія рамёствы і промыслы. Разглядаюцца набыткі і традыцыі мастацкай апрацоўкі дрэва, ганчарства, тэкстылю, пляцення з прыродных матэрыялаў і іншых відаў народных мастацкіх рамёстваў, вызначаецца іх нацыянальная адметнасць, характарызуецца сучасны стан, выяўляюцца бліжэйшыя перспектывы бытавання і развіцця.

Прызначаецца ўсім, хто цікавіцца набыткамі традыцыйнай мастацкай культуры Беларусі.

## Папярэднія выданні серыі




**«Ядранае жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях** / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 356 с.: іл.

У кнізе папулярна распавядаецца пра ўсе традыцыйныя каляндарныя святы, звычаі і абрады Беларусі з іх рэгіянальнымі асаблівасцямі. На багатым фактычным матэрыяле, сабраным аўтарамі падчас фальклорна-этнаграфічных экспедыцый, дадзена комплекснае ўяўленне пра каляндарную абраднасць беларусаў як найважнейшую сферу і падсістэму жыццядзейнасці нашага народа.

Адрасуецца этнографам, фалькларыстам, гісторыкам, усім, хто цікавіцца народным побытам і творчасцю беларусаў.

## Папярэднія выданні серыі

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ




**Святыя крыніцы Беларусі** / Уладзімір Лобач, Таццяна Валодзіна. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 188 с. : іл.

Кніга прысвечана дзівоснаму феномену беларускай зямлі – культавым крыніцам, якія ў народзе здаўна і дагэтуль лічацца святымі. Легенды, паданні, цуды ацалення, абрады і каляндарныя святы, звязаныя з ушанаваннем крыніц беларусамі, – пра ўсё гэта даведаецца чытач у выданні. У кнізе змешчана вялікая колькасць экспедыцыйных фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, а таксама фotaздымкаў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.



**Кухаронак Таццяна Іванаўна –** этнолаг, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Праблематыка яе фундаментальных даследаванняў – гістарычная эвалюцыя каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў, выяўленне яе тэрытарыяльна агульных і рэгіянальна-лакальных рысаў, характарыстыка тэндэнцый развіцця на сучасным этапе.

Мае некалькі манаграфій, аўтар больш *за 300 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў па гэтых тэмах.*

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі «За духоўнае адраджэнне» 2008 года ў складзе аўтарскага калектыву *за шматтомнае выданне «Беларусы».*



ISBN 978-985-08-2185-0

Т. Кухаронак

Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў